# ПАЎДНЁВЫ КІРУНАК ІНВЕСТЫЦЫЙ

**На X Гомельскім эканамічным форуме падпісана ўжо 11 інвестыцыйных дагавораў і працаколаў аб намерах на суму $130 млн. У складзе замежных дэлегацый — каля 500 прадстаўнікоў дзелавых і фінансавых кругоў, гандлёвых арганізацый, органаў улады, пасольстваў з 25 краін свету. Такім чынам, у хуткім часе ў паўднёвым рэгіёне плануецца рэалізаваць буйныя праекты з удзелам замежнага і айчыннага капіталу.**

У прыватнасці, амаль у $6 млн ацэньваецца аб'ём інвестыцый расійскай кампаніі ў будаўніцтва шчэбеневага завода (магутнасцю 800 тыс. т за год) у Лельчыцкім раёне, а ізраільскае прадпрыемства мае намер укласці $26 млн у будаўніцтва свінакомплексу ў Веткаўскім раёне. Інвеставаць сродкі ў эканоміку вобласці плануюць таксама бізнесмены Украіны і Сірыі. Таксама падпісаны чатырохбаковы дагавор аб супрацоўніцтве па развіцці Гомельскага прамысловага парка «Палессе — Лельчыцы» з мэтай асваення карысных выкапняў і будаўніцтва Палескай чыгункі. Старшыня камітэта эканомікі аблвыканкама Эльвіра Карніцкая расказала, што гэта самы маштабны праект, які прапаноўваўся інвестарам за ўсю дзесяцігадовую гісторыю правядзення інвестыцыйных форумаў на Гомельскай зямлі. Лельчыцкі прамысловы парк уключае Ельскі, Лельчыцкі і Мазырскі раёны вобласці. Для прыцягнення інвестыцый у распрацоўку радовішчаў карысных выкапняў тут плануецца пабудаваць чыгунку «Глушкавічы — Лельчыцы — Міхалкі». У сувязі з гэтым старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік адзначыў, што развіццё самага поўдня Гомельшчыны і засваенне яго прыродных рэсурсаў мае вялізнае значэнне для ўсёй Беларусі:

Паводле яго слоў, вялікая частка радовішчаў карысных выкапняў Гомельскай вобласці засяроджана менавіта на гэтай тэрыторыі. Кіраўніком дзяржавы прынята прынцыповае рашэнне пра будаўніцтва чыгункі, якая звяжа ключавыя радовішчы прыродных рэсурсаў з асноўнымі транспартнымі магістралямі і прамысловымі зонамі вобласці. Прамысловы патэнцыял Лельчыцкага і Петрыкаўскага рэгіёна відавочны. Ужо створана кампанія, якая будзе ажыццяўляць тут развіццё.

Фармат правядзення форуму прадугледжвае прэзентацыю інвестыцыйных прапаноў і выставу інвестыцыйных праектаў, правядзенне кантактна-кааперацыйнай біржы. Акрамя таго, у абласным цэнтры праходзіць міжнародная выстава-кірмаш «Вясна ў Гомелі — 2013», дзе 150 прадпрыемстваў прадстаўляюць шырокі асартымент прамысловай прадукцыі і спажывецкіх тавараў не толькі з Гомельскай, але і Бранскай, Курскай і Маскоўскай абласцей Расіі, а таксама Малдовы, Чарнігаўскай і Жытомірскай абласцей Украіны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# БАЛОНСКІ ПРАЦЭС: НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ — НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ

**Напярэдадні ў Мінску прайшоў міжнародны інфармацыйна-адукацыйны семінар, дзе абмяркоўвалася гатоўнасць далучэння да адзінай еўрапейскай адукацыйнай прасторы беларускай вышэйшай школы. Удзел у ім узялі прадстаўнікі Еўракамісіі, Дэпартамента па адукацыі Савета Еўропы, Асацыяцыі еўрапейскіх універсітэтаў, Саюза еўрапейскіх студэнтаў, рэктары беларускіх ВНУ і прадстаўнікі студэнцкага самакіравання.**

Трэба нагадаць, што Беларусь падавала заяўку на далучэнне да Балонскага працэсу, але летась наша заяўка не была задаволена. Наступная ж магчымасць з'явіцца толькі ў 2015 годзе.

— Савет Еўропы мае доступ да досведу вялікай колькасці краін, якія далучыліся да Балонскага працэсу раней, і хачу запэўніць, што не існуе нейкага агульнага для ўсіх рэцэпта ўваходжання ў Балонскі працэс, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі дырэктар Дэпартамента па адукацыі Савета Еўропы Жур Берган. — Безумоўна, убачыць, што добра спрацавала ў іншых, вельмі важна, але яшчэ больш важна ўбачыць тое, што ў іх не атрымалася, каб не паўтараць чужых памылак. Беларусі, у першую чаргу, трэба звяртаць увагу на досвед суседніх краін — краін з падобнымі традыцыямі ў адукацыі, падобнымі менталітэтам і культурай.

— Балонскі працэс сёння адкрыты для ўсіх краін, якія жадаюць у ім удзельнічаць, таму імкненне Беларусі, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, стаць часткай Балонскага працэсу цалкам лагічнае і натуральнае. Прызнаемся, мы засталіся вельмі задаволеныя нашай сустрэчай з прадстаўнікамі студэнцкага актыву, якая доўжылася недзе 1,5 гадзіны. Студэнты задавалі нам вельмі шмат сур'ёзных пытанняў, якія сведчаць пра іх сур'ёзную дасведчанасць ва ўсіх нюансах функцыянавання Балонскай сістэмы, — адзначыў прадстаўнік Еўракамісіі Франк Петрыкоўскі.

Як вядома, адной з умоў далучэння да Балонскага працэсу з'яўляецца стварэнне шматступенчатай сістэмы вышэйшай адукацыі. Падрыхтоўка па многіх спецыяльнасцях у беларускіх ВНУ сёлета пераходзіць на формулу 4+2: чатыры гады на першай ступені і два гады навучання ў магістратуры. У сувязі з гэтым ёсць сур'ёзная асцярога, а ці магчыма ўвогуле падрыхтаваць спецыяліста з інжынернай адукацыяй за чатыры гады?

— Я сам родам з Германіі і прызнаюся, што такія ж асцярогі былі калісьці і ў нас. Але час паказаў, што падрыхтаваць спецыяліста з інжынернай адукацыяй без страты якасці яго падрыхтоўкі за меншы тэрмін усё ж такі можна, — дадаў Франк Петрыкоўскі. — Увогуле, пачынаючы з 1999 года, усе краіны — удзельніцы Балонскага працэсу — прайшлі вельмі вялікі шлях. І сёння многія рэгіёны, у тым ліку і ЗША, з цікавасцю назіраюць за тым, што адбываецца ў Еўропе ў рамках агульнай адукацыйнай прасторы.

— Усім вядома, што ў Балонскага працэсу ёсць як свае плюсы, так і свае мінусы,. Галоўная пагроза — гэта праблема ўцечкі высокакваліфікаваных кадраў у іншыя краіны. Таму мы бачым сваю задачу ў тым, каб знайсці разумны баланс паміж новымі магчымасцямі і нацыянальнымі прыярытэтамі. Балонскі працэс для нас — не самамэта. Ва ўмовах глабалізацыі эканомікі ёсць неабходнасць састыкоўкі сістэмы адукацыі Беларусі з сістэмамі іншых краін. Але ўсе рэформы карысныя, толькі калі яны вядуць да павышэння якасці адукацыі», — падсумаваў міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПРАЦОЎНЫ КОДЭКС ДЛЯ ПАКАЛЕННЯ «АЙ—ЦІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Дыскусійнай сёння з'яўляецца норма аб заключэнні тэрміновых працоўных дагавораў мікраарганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, — сказала Ларыса Баргановіч. — Норма існуе, але ёю карыстаюцца мала. Аднак яна з'яўляецца гарантыяй для работніка, бо часта, калі работнік уладкоўваецца, яму абяцаюць пэўны заробак. Ён, напрыклад, адпраўляецца ў доўгі рэйс, а калі вяртаецца, абяцаны заробак не выплачваецца. Працоўныя адносіны яго не афармлены, а значыць, ён нічога не можа і патрабаваць.

## СПРАВА — ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Наступныя змены ў большай ступені адпавядаюць інтарэсам наймальніка. Гэта і пераход на пагадзінную аплату звышурочнай работы на прадпрыемствах рознай формы ўласнасці (пакуль што такая кампенсацыя прадугледжана за цэлы дзень, нават калі работнік працаваў у выхадны толькі 4 гадзіны), і спрашчэнне працэдуры ўзгаднення графіка працоўных адпачынкаў (прыярытэтнымі названы інтарэсы прадпрыемства)...

Прагрэсіўным крокам заканадаўцы назвалі норму, якая робіць неабавязковымі камандзіровачныя пасведчанні. Для бухгалтарскай справаздачы дастаткова будзе загада наймальніка і дакументаў аб праездзе і пражыванні, для кіраўніцтва прадпрыемства — дасягненне мэты камандзіроўкі. Пры гэтым рашэнне аб захаванні камандзіровачных пасведчанняў або адмове ад іх кожнае прадпрыемства будзе прымаць самастойна.

Вельмі запатрабаванай з'яўляецца норма, якая пашырае магчымасці атрымання дадатковай адукацыі супрацоўнікамі. З улікам патрэб і фінансавых магчымасцяў прадпрыемства, згодна з абноўленым кодэксам, кіраўнік самастойна зможа прымаць рашэнне аб накіраванні на навучанне сваіх спецыялістаў.

## СПОРТ ЯК РАБОТА

Адной з самых важных навацый праекта закона міністр працы і сацыяльнай абароны назвала дапаўненне Працоўнага кодэкса асобным раздзелам, які рэгулюе працоўныя адносіны ў прафесійным спорце.

— Гэты раздзел рэгулюе пытанні заключэння, скасавання і тэрміны дзеяння працоўных дагавораў паміж спартсменамі і трэнерамі, падставы для часовага пераводу спартсменаў ад аднаго наймальніка да іншага, — патлумачыла міністр. — Напрыклад, наймальніку дадзена права ў выпадку, калі ён не мае магчымасці забяспечыць удзел спартсменаў у спартыўных мерапрыемствах, пераводзіць спартсменаў і трэнераў, з іх пісьмовай згоды, да іншага наймальніка.

Праект закона вызначае асаблівасці працы жанчын-спартсменаў і спартсменаў ва ўзросце да 18 гадоў, працы трэнераў па сумяшчальніцтве, асаблівасці скасавання працоўнага дагавора са спартсменам і трэнерам.

## АЛЬБО ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ, АЛЬБО АРЭНДА

Другім пытаннем у парадку дня пасяджэння сесіі быў законапраект аб унясенні змен і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты па пытаннях жыллёвай палітыкі. Аднак не столькі гэты законапраект, колькі сам Жыллёвы кодэкс, які больш за два месяцы таму ўступіў у сілу, выклікаў пытанні дэпутатаў да **міністра ЖКГ Андрэя ШОРЦА**.

Адказваючы на пытанні дэпутатаў, міністр пацвердзіў, што цяпер практычна распрацаваны, узгоднены і рыхтуецца да накіравання Прэзідэнту праект указа аб пераводзе жылых памяшканняў, прадастаўленых грамадзянам па дагаворы найму, у разрад камерцыйнага жылля. Акрамя таго, прадугледжваецца і перавод службовых жылых памяшканняў у разрад жылля камерцыйнага выкарыстання.

У Жыллёвым кодэксе Беларусі, які пачаў дзейнічаць з сакавіка гэтага года, ёсць палажэнні, нагадаў Андрэй Шорац, якія прадугледжваюць увядзенне платы за карыстанне памяшканнямі дзяржаўнага жыллёвага фонду, прадастаўленыя па дагаворы найму. І сёння ў Беларусі такога жылля налічваецца 392 тыс. кватэр, або 14 працэнтаў ад агульнай колькасці жылля. Гэтае жыллё грамадзяне маюць права прыватызаваць. Міністр адзначыў, што 182 тыс. грамадзян маюць на руках чэкі «Жыллё», якія яны могуць накіраваць на яго прыватызацыю.

— Праектам указа прадугледжана, што на працягу года з моманту прыняцця гэтага дакумента грамадзянін мае права на прыватызацыю такога віду жылля, — сказаў міністр. — Калі грамадзяне адмаўляюцца або па нейкіх прычынах не могуць яго прыватызаваць, то гэтае жыллё пераводзіцца ў ранг арэнднага, гэта значыць жылля камерцыйнага карыстання. Калі людзі не гатовы ні прыватызаваць, ні плаціць за карыстанне такімі кватэрамі, то гэтае жыллё па заяве грамадзяніна прадугледжваецца перавесці ў жыллё сацыяльнага карыстання, без яго магчымай прыватызацыі.

Учора ў Палаце прадстаўнікоў таксама ў першым чытанні былі прыняты законапраекты «Аб мытным рэгуляванні ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб унясенні змен і дапаўненняў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях удасканалення гаспадарчай судаводства» і «Аб патэнтах на сарты новых раслін». Дэпутаты адразу ў двух чытаннях прынялі законапраект аб прызнанні страціўшай сілу Пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб межах Дзяржаўнага біялагічнага заказніка «Тырвовічы», а праект закона «Аб дзяржаўным рэгуляванні вытворчасці і абарачэння алкагольнай, нехарчовай прадукцыі, якая змяшчае спірт, і нехарчовага этылавага спірту» — у другім чытанні.

Акрамя таго, заканадаўцы ратыфікавалі шэраг міжнародных дагавораў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## «КІТАЙСКІЯ ЛІХТАРЫКІ» ПАДЧАС ВЫПУСКНЫХ — ПАД ЗАБАРОНАЙ

**На рабочай нарадзе ў старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта было прынята рашэнне аб забароне выкарыстання піратэхнічных вырабаў і адкрытага агню ў перыяд святкаванняў выпускных вечароў і апошніх званкоў.**

— У апошні час вялікай папулярнасцю карыстаецца запуск «кітайскіх ліхтарыкаў», які адбываецца пры дапамозе адкрытага агню. Але прадказаць траекторыю іх палёту немагчыма — пад уздзеяннем ветру ліхтарыкі могуць заляцець куды заўгодна: на дах дома, балкон, уляцець у адчыненае акно. Такі некантраляваны палёт можа стаць прычынай пажару, — патлумачылі прычыну забароны ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Для аздаблення залаў выкарыстоўваюцца таксама паветраныя шарыкі і надзіманыя дэкарацыі. Ні ў якім разе не дапускаецца напаўненне іх гаручымі газамі. Напрыклад, у маі мінулага года падчас мітынгу на плошчы ў цэнтры Ерэвана выбухнулі напоўненыя газам шары. Па звестках МНС Арменіі, у выніку надзвычайнай сітуацыі пацярпелі 144 чалавекі. Па асноўнай версіі, здарэнне адбылося з-за таго, што шары былі напоўненыя вадародам ці метанам.

## ДАЗВОЛЕНА ПАЛЯВАННЕ НА КАЗУЛЮ

**З 15 мая па 30 верасня ў краіне будзе доўжыцца сезон палявання на еўрапейскую казулю.**

— Згодна з «Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання», у гэты час дазваляецца здабываць дарослых самцоў, селекцыйных жывёл любога полу. Паляваць можна збройным спосабам з засады, з падыходу, з падманваннем з 18 да 9 гадзін, — паведаміў «Звяздзе» старшы дзяржаўны інспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Вадзім Варабей. — Дазваляецца выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 1 500 джоўляў і гладкаствольную паляўнічую зброю з кулявымі патронамі і патронамі з карцеччу дыяметрам 6,5 міліметра і больш.

Парушэнне «Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання» цягне адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры ад 10 да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй стрэльбаў, іншых прылад палявання і іншых прадметаў, якія з'явіліся прыладай ці сродкам здзяйснення парушэння, або без канфіскацыі і з пазбаўленнем спецыяльнага права.

## ВЫРАТАВАЛЬНІКІ «РАЗБЛЫТАЛІ» ПТУШКУ

**Незвычайную выратавальную аперацыю правялі работнікі Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС: яны вызвалілі птушку, якая заблыталася ў галінах дрэва.**

Удзень ад жыхароў дамоў па вуліцы Кульман пачалі паступаць званкі пра тое, што ў двары дома №30 высока на дрэве ў галінах заблыталася птушка, якая доўгі час не можа самастойна вызваліцца. Падобныя выпадкі не ўваходзяць у кампетэнцыю МНС, таму дыспетчар паабяцала перадаць інфармацыю пра здарэнне ў іншыя арганізацыі. Аднак гараджане запэўнілі, што ўжо звярталіся і ў ЖЭС, і ў «Фаўну горада», аднак званкі туды плёну не далі. Дыспетчар звязалася з мясцовым ЖЭСам, работнік якога пасля агляду месца здарэння паведаміў, што ў іх няма магчымасці самім вырашыць праблему, а «Зелянбуд» з такой нагоды прыцягваць не будуць. У «Фаўне горада» сказалі, што птушкамі не займаюцца. Да аб'яднання «Ахова птушак» дазваніцца не атрымалася. У выніку выйшла так, што дапамагчы птушцы не было каму. Таму, хаця МНС і не абавязана рэагаваць на такія сітуацыі, калі няма пагрозы людзям, з гуманных меркаванняў было прынята рашэнне накіраваць на месца аддзяленне, якое вярталася з заняткаў непадалёку. Работнікі МНС і вызвалілі птушу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## МІНСКАМУ ЗААПАРКУ ПАДАРЫЛІ ДВУХ ІЛЬВОЎ

**Два маладыя львы папоўнілі калекцыю фаўны мінскага заапарка. Як расказала малодшы навуковы супрацоўнік заапарка Алена Бадрова, навасёлаў завуць Жорык і Леа. Ім крыху больш за год. Па львіных мерках — падлеткі.**

Жывёлы жывуць у экспазіцыйным вальеры, паглядзець на іх могуць усе ахвотныя. Ільвяняты цікаўныя, актыўныя і дружалюбныя. Адчуваюць сябе добра, гуляюць на вуліцы і паддобрываюцца да наведвальнікаў.

Драпежнікаў падарыў вядомы дрэсіроўшчык Уладзіслаў Ганчароў у час знаходжання ў сталіцы з сваім шоу «Адзін сярод ільвоў». Жорык і Леа дрэнна паддаваліся дрэсіроўцы, таму было вырашана падарыць іх Мінску.

Сёння ў сталічным заапарку жывуць ільвіцы Кіса і Злата, а таксама цар звяроў Алекс. Прайд жыве дружна. Малых перасяляць да дарослых суродзічаў супрацоўнікі заапарка не збіраюцца: самцы не цярпяць сапернікаў у сваім прайдзе і імкнуцца ад іх пазбавіцца.

*«Мінск-Навіны».*

## АФЕРЫСТ «АБУВАЎ» ДАВЕРЛІВЫХ

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Першамайскага РУУС сталіцы за здзяйсненне серыі махлярстваў затрымалі 19-гадовага жыхара Мінска.**

— Схема злачынстваў непрацуючага маладога чалавека была простай, але эфектыўнай. На адным з папулярных інтэрнэт-сайтаў ён стварыў групу па продажы красовак шэрагу сусветных брэндаў. Спартыўны абутак ад гэтых вытворцаў прапаноўваўся па даволі прымальных цэнах — ад 400 да 600 тысяч рублёў. Пры гэтым патэнцыяльных пакупнікоў папярэджвалі: тавар дастаўляецца на заказ. Пры сустрэчы хлопец абяцаў прывезці патрэбнае цягам 15 дзён пры ўмове, што заказ будзе аплачаны адразу і цалкам, — паведаміла «Звяздзе» прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Вольга Куцько. — Як пазней высветлілі супрацоўнікі крымінальнага вышуку, выконваць свае абавязкі хлопец і не збіраўся. Атрыманыя грошы ён тут жа спускаў у казіно. А калі паступалі званкі ад кліентаў, зламыснік прыдумваў розныя адгаворкі і падаўжаў тэрміны пастаўкі. Пакуль падманутыя ім грамадзяне не пачалі звяртацца ў міліцыю. Праваахоўнікі ўстанавілі асобу афераста і затрымалі яго па месцы жыхарства. Зараз устаноўлена дачыненне мінчаніна да васьмі выпадкаў махлярства, аднак сышчыкі ўпэўнены, што колькасць пацярпелых можа быць большай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## РАСПІЛАВАНЫЯ... АЎТАМАБІЛІ

**У пункце мытнага афармлення «Прывалка» на літоўска-беларускай мяжы не ўдалася спроба незаконнага ўвозу на тэрыторыю Мытнага саюза легкавых аўтамабіляў, якія былі распілаваны на часткі.**

Праводзячы спецыяльныя мерапрыемствы, супрацоўнікі аддзела па барацьбе з кантрабандай Гродзенскай рэгіянальнай мытні прыпынілі рух грузавіка з аўтазапчасткамі, што ўжо былі ва ўжытку. Паводле прадстаўленых дакументаў, тавар накіроўваўся з Германіі ў Казахстан. Аднак падчас дагляду грузавога памяшкання транспартнага сродку было ўстаноўлена, што ў таварасуправаджальнай дакументацыі пазначылі не ўсё: акрамя запчастак, таксама перавозіліся пярэднія часткі легкавых машын, шыны, аўтамабільныя ліхтары і люстэркі. Кошт незаконнага грузу папярэдне ацэньваецца больш чым у 420 мільёнаў рублёў, паведамляе прэс-служба Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ВЫПАЛЬВАЎ ТРАВУ — ЗАСТАЎСЯ БЕЗ ДОМА

**Паведамленне пра загаранне дома ў вёсцы Старлыгі паступіла ў цэнтр аператыўнага ўпраўлення Мядзельскага раённага падраздзялення МНС удзень. Тэлефанавала суседка, аднак просьба аб дапамозе спазнілася...**

— 80-гадовы мужчына вырашыў выпаліць сухую траву на тэрыторыі домаўладання. Не паспеў ён азірнуцца, як вецер падхапіў агонь. Самастойна затушыць яго ў мужчыны не атрымалася, — распавялі падрабязнасці здарэння ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Выратавальнікі, што прыбылі на месца, убачылі жылы дом, які ўжо гарэў адкрытым полымем. У выніку пажару ён выгараў знутры, знішчаны дах. Дарэчы, з-за выпальвання сухой расліннасці мінулай вясной у сталічнай вобласці загінулі тры чалавекі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Каб памяталі

# ПАДПОЛЬНУЮ «ЗВЯЗДУ» СТВАРАЛІ ПАТРЫЁТЫ

**Напэўна, ёсць нешта сімвалічнае ў тым, што я, карэспандэнт газеты «Звязда», святкую свой дзень нараджэння 18 мая — у той дзень, калі 71 год таму, у 1942 годзе, найстарэйшае беларускае выданне аднавіла свой выхад у акупаваным Мінску. Гэта была знамянальная падзея ў жыцці мінскага падполля: «Звязда», выпушчаная ў найцяжэйшых умовах, сваім з'яўленнем сведчыла аб неўміручасці і непераможнасці журналісцкага слова, якое бязлітасна граміла ворага, заклікала на подзвігі беларускі народ...**




На гэтым месцы, на вуліцы Выдавецкай (зараз Кульман), у доме Таццяны Якавенкі, наборшчыкам Хасанам Александровічам былі набраныя 2-гі і 3-ці нумары падпольнай «Звязды».

Барыс Александровіч не па чутках і не па кнігах ведае, як рыхтаваліся тыя славутыя падпольныя нумары. Рукой яго бацькі — Хасана Александровіча — былі набраны 2-гі, 3-ці, 4-ты і 5-ты нумары «Звёздачкі» (так падпольшчыкі ласкава называлі любімую газету). Праўда, апошні з іх у свет так і не выйшаў: у верасні 1942 года гітлераўцы арыштавалі 21 падпольшчыка, сярод якіх быў і галоўны рэдактар газеты Вячаслаў Нікіфараў.

— Калі пачалася вайна, бацька быў у санаторыі, — успамінае Барыс Хасанавіч. — Паколькі мы з'яўляліся сям'ёй партыйнага работніка, нашай маці з дзецьмі прапанавалі эвакуявацца. Аднак яна адмовілася: вырашыла чакаць бацьку.

Пасля вяртання ў Мінск Хасан Александровіч уладкаваўся на працу чарнарабочым на электрастанцыю. Працаваў за паёк: трэба было карміць жонку і чацвярых малых.

Вясной 1942 года на кватэру да Хасана Мустафавіча прыйшоў член Мінскага падпольнага гаркама Уладзімір Казачонак, якога ён добра ведаў па даваеннай сумеснай рабоце ў Дзяржаўным выдавецтве БССР. Таму адразу пагадзіўся на прапанову — стаць наборшчыкам падпольнай «Звязды». Тым больш што ў кваліфікаванага спецыяліста быў вопыт працы ў гэтым выданні: ён набіраў «Звязду» яшчэ ў 1918 годзе. Праверкай на прафпрыдатнасць стаў набор лістоўкі, якая была адрасавана беларускім сялянам. «Сяляне! — заклікала яна. — Пачалася ўборка ўраджаю. Вы павінны паклапаціцца пра тое, каб гэты ўраджай дастаўся вам, вашым дзецям, вашаму народу, вашай Радзіме...»

У мэтах канспірацыі Хасан Александровіч працягваў працаваць на электрастанцыі. Праўда, толькі фармальна: яму зрабілі бальнічныя лісты. Сапраўдная праца пачалася на Выдавецкай вуліцы, у кватэры Таццяны Якавенкі, якая знаходзілася праз дарогу ад хаты наборшчыка. Немалая роля Хасана Мустафавіча ў тым, што падпольную «Звязду» вырашылі друкаваць тут: ён дакладна ведаў, што гаспадыня, жонка салдата Чырвонай Арміі, — сумленны і адданы Радзіме чалавек.

У доме Таццяны Якавенкі здымаў памяшканне кіроўца Арсеній Грышын. У кватэры ён бываў рэдка: раз'язджаў, выконваючы заданні падполля, таму адразу пагадзіўся аддаць сваю жылплошчу пад падпольную тыпаграфію. Тут Хасанам Александровічам і былі набраны 2-гі і 3-ці нумары нелегальнай «Звязды». Разам з ім над выданнем працаваў невялікі рэдакцыйны калектыў. Рэдактар Вячаслаў Нікіфараў і Уладзімір Казачонак вялі ўсю рэдакцыйную работу, Сяргей Благаразумаў і Клаўдзія Фалдзіна друкавалі газету, Ядзвіга Савіцкая і Анастасія Карпусенка з'яўляліся літаратурнымі супрацоўнікамі.




Вось тое, што ў Барыса Хасанавіча засталося ад бацькі: помнік на вуліцы Ігнаценкі, дзе ён пахаваны, фотаздымак і 2-гі нумар падпольнай «Звязды»...

Ва ўмовах акупаванага Мінска выпускаць газету было вельмі небяспечна. З нямецкай друкарні трэба было непрыкметна вынесці амаль усё, што патрэбна было для выпуску газеты. Рызыкаваць не сталі, знайшлі іншае выйсце. І праз два дні ў падпольнай друкарні з'явіліся папера, фарбы, дзве вярстаткі, дзве гранкі... Не хапала толькі наборнай касы — скрыні, разбітай на клеткі, у якой у пэўнай паслядоўнасці размяшчаліся шрыфты і прабельныя матэрыялы.

— І тут дапамог бацька, — расказвае Барыс Александровіч. — Ён намаляваў на паперы схему касы, па якой наша маці, Галіна Адамаўна, пашыла каля двухсот мяшэчкаў з марлі. У кожным такім мяшэчку захоўвалася літара. Пасля таго, як нумар быў адціснуты, літары зноў складваліся ў свае «рэзервуары».

Толькі мяшэчкі — не наборная каса. Таму справа рухалася вельмі марудна. Падчас набору часта не хапала той ці іншай літары. У такіх выпадках літары, якія адсутнічалі, даводзілася «браць» з іншага шрыфту ці пераварочваць іншым бокам тыя, што былі. Пасля гэтага Хасан Александровіч падлічваў, колькі і якіх літар не хапае, і гэтая нястача папаўнялася шляхам вынасу падпольшчыкамі шрыфту з друкарні. Такім чынам у падпольнай рэдакцыі з'явілася неабходная колькасць шрыфтоў, якіх ужо хапала на набор дзвюх палос.

Часам складваліся такія сітуацыі, што трэба было хутка зварочваць працу, хаваць шрыфт, вярстатку, набор... Пра адзін з такіх выпадкаў Хасан Мустафавіч расказваў сваім дзецям:

— Раніцай я прыйшоў заканчваць набор 3-га нумара газеты, а праз гадзіну-дзве гаспадыня дома паведаміла мне, што ідуць таварышы Казачонак і Вацік (так у падпольнай тыпаграфіі называлі Вячаслава Нікіфарава). Разам мы пачалі складаць макет нумара. Не паспелі скончыць працу, як Таццяна Якавенка паведаміла, што сюды ідзе паліцай. Казачонак і Вацік выйшлі ў іншае памяшканне, а мяне зачынілі на замок. Перад гэтым мы вырашылі: калі паліцай захоча зайсці ў памяшканне, дзе друкавалася газета, неабходна забіць яго халоднай зброяй.

Часта па Выдавецкай праходзілі паліцаі і гітлераўцы: праз дарогу знаходзілася гестапа. Але ж яны нават і не здагадваліся, што ў іх пад носам — у суседнім доме — набіралася і друкавалася газета, друкарню якой яны так старанна шукалі!

Хасану Александровічу вельмі часта даводзілася працаваць і ноччу. Тады ў мэтах канспірацыі зачынялі аканіцы і завешвалі вокны коўдрамі. Друкаваць уручную — нялёгкая праца. Стомленага Хасана ля друкарскага станка калі-нікалі змяняў Уладзімір Казачонак. Падпольшчыкі працавалі да сёмага поту...

Усё часцей каля хаты Таццяны Якавенкі з'яўляліся падазроныя асобы. Што яны там вынюхвалі, можна толькі здагадвацца. Аднак працаваць на гэтай кватэры больш не рызыкавалі. Таму 4-ты нумар падпольнай «Звязды» быў надрукаваны на кватэры ў Пятра Хадасевіча, што на вуліцы Трэцяй лініі. Гэты высакародны ўчынак каштаваў Пятру Канстанцінавічу вельмі дорага: восенню 1942 года яго з жонкай і двума сынамі арыштавалі. Усе яны загінулі ў фашысцкіх засценках...

— У пачатку верасня 1942 года Уладзімір Казачонак прынёс у друкарню матэрыял для 5-га нумара падпольнай «Звязды», — узгадвае аповеды бацькі Барыс Александровіч. — Бацька ўвесь гэты матэрыял набраў, выправіў карэктуру і завярстаў, за выключэннем толькі зводкі Савінфармбюро, якую павінен быў прынесці рэдактар. Аднак у вызначаны тэрмін Вячаслаў Нікіфараў не прыйшоў. Праз некалькі дзён стала вядома, што яго арыштавалі.

Лёс 5-га нумара падпольнай «Звязды» быў вырашаны. Больш нічога не заставалася, як прыбіраць сляды. Частку матэрыялу і шрыфту Уладзімір Казачонак перанёс спачатку ў двор хаты, дзе жыла Ядзвіга Савіцкая, а затым — у склеп 3-га дома Саветаў, што на вуліцы Горкага. Другую частку шрыфту жонка Хасана Мустафавіча закапала ў бульбе, пасаджанай у гародзе.

Гэты шрыфт Хасану Александровічу хутка спатрэбіўся. Праз некаторы час ён набіраў, друкаваў і распаўсюджваў лістоўкі сярод супрацоўнікаў электрастанцыі, дзе працаваў.

У сярэдзіне вайны наборшчык падпольнай «Звязды» пазнаёміўся з сувязным Толікам Ляўковым, які і адвёў яго ў партызанскі атрад імя Суворава. З ворагам прыйшлося змагацца ўжо не словам, а зброяй. А тым часам сям'я Хасана Александровіча працягвала заставацца ў акупаваным Мінску. У гэтым жа доме, на Выдавецкай, Александровічы сустрэлі Перамогу.

— Цяжка было без бацькі, — успамінае сын наборшчыка «Звязды», які тады быў яшчэ зусім малым хлопчыкам. — Калі бамбілі горад, мы з маці, брацікам і сястрычкамі хаваліся ў зямлянцы. А самым страшным было пачуццё голаду. Аднойчы не вытрымаў! Падышоў да немцаў, якія елі і пілі (нешта святкавалі), і кажу: «Хачу хлеба!» Перакладчык агучыў адказ немцаў на дзіцячую просьбу: «Вып'еш шклянку гарэлкі — тады атрымаеш цэлы бохан». У мяне не было іншага выйсця: вельмі есці хацелася... Заплюшчыў вочы — і выпіў. Свае слова гітлераўцы стрымалі: дахаты я вяртаўся ўжо з хлебам. Толькі не дайшоў: страціў прытомнасць...»

З вайны Хасан Александровіч вярнуўся. Праўда, здароўе было ўжо не тое. З сям'ёй ён жыў у тым жа доме, што і да вайны. У 1959 годзе будынак знеслі. Хутка пайшоў з жыцця і гаспадар, легендарны наборшчык падпольнай «Звязды».

Пасля заканчэння школы Барыс Александровіч выбраў прафесію бацькі. Працаваў наборшчыкам у Акадэміі навук, пасля амаль 40 гадоў — у выдавецкім аддзеле БНТУ. Паралельна — мастацкім афарміцелем кніг у многіх выдавецтвах краіны. Ажаніўся, мае двух сыноў — Сяргея і Канстанціна, дачакаўся траіх унукаў.

Сёння дзеці і ўнукі жывуць у Канадзе. Старэйшы сын працуе трэнерам па хакеі, малодшы — сам хакеіст. Гэтым відам спорту займаецца і малодшы ўнук Барыса Хасанавіча — Аляксей. Нягледзячы на свой 15-гадовы ўзрост, хлопчык ужо сам зарабляе грошы: ён — трэнер па хакеі сярод юніёраў. Са сваім дзядулем яны размаўляюць па скайпе, а родную для іх сям'і «Звязду» чытаюць у інтэрнэце раней, чым яна даходзіць да дзеда.

Нядаўна Барысу Александровічу з нагоды 75-гадовага юбілею было ўручана пасведчанне ганаровага карэспандэнта «Звязды». Гэта было сапраўдным падарункам для сына чалавека, які дзеля выхаду газеты рызыкаваў сваім жыццём.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА**

■

■ Мінулае і будучыня

# СКАРБЫ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

**У прасторнай сонечнай зале — стылізаваная беларуская вясковая хата: у калысцы ляжыць немаўля, ложак у вышываных падушках, на покуці — абраз з набожнікамі, стол з беларускімі прысмакамі, старыя бытавыя рэчы, на лавах — саматканыя тканіны, на сценах — ручнікі з прыгожымі ўзорамі. У кожным фрагменце арнаменту ёсць свой сэнс.**

Майстрыхі Клічаўскага і Кіраўскага раёнаў прадстаўляюць свае лепшыя творы ўдзельнікам міжнароднага форуму **«Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства».**

«Матчын ручнік — крыніца лёсу» — так называецца тэматычная кампазіцыя. За кроснамі сядзіць Марыя Іванаўна Салановіч — 74-гадовая жыхарка аграгарадка Любонічы Кіраўскага раёна. Марыя Іванаўна працавала паштальёнам, а ткаць і вышываць навучылася ад сваёй маці. Цяпер яна вядомая майстрыха, і госці форуму бесперапынна здымаюць жанчыну і яе вырабы на ўсе віды камер. «Залатыя рукі!» — захапляецца публіка.

— Гэта вышываны каляровымі кветкамі ручнік, з якім я выходзіла замуж, — расказвае Марыя Іванаўна. — А вось гэты фартух і андарак належалі яшчэ маёй прабабулі, ім дакладна болей за сотню гадоў. Цяпер маладыя людзі цікавяцца маім майстэрствам, і я перадаю ім свае веды.

## ГАЛАНДЦЫ СПЯВАЮЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

Менавіта захаванне культурнай спадчыны — тэма міжнароднага форуму. Яго другі раз арганізуе Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветніцкай працы пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі. Мерапрыемства набірае папулярнасць: сёлета ў Магілёў прыехалі ўдзельнікі з 13 краін — летась — з 5-ці.

Таму нездарма на адкрыцці форуму вядучыя гаварылі па-беларуску, па-руску і рабілі пераклад на англійскую мову. На сцэне стаялі разам беларусы, эстонцы, азербайджанцы, галандцы, туркі, славакі і іншыя. «Не трэба вывучаць генетыку, а проста прыглядзецца, каб зразумець: у нас ёсць культурная роднасць», — сказаў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.**

Усіх, безумоўна, парадавала выступленне аматарскага творчага калектыву «Заранка» з Галандыі. Мужчыны выйшлі ў шырокіх чорных штанах са шлейкамі і шыракаполых капелюшах, жанчыны — у старадаўніх сукенках і белых каптурах. Галандцы спявалі на роднай мове, а таксама праспявалі беларускую песню «Ой, ляцелі гусі». Удзельнікі «Заранкі» запланавалі выступіць таксама і ў сельскіх клубах Магілёўшчыны.



Галандскі калектыў «Заранка» — фота на памяць.

## НАВУКА ПРА МІКОЛЬСКУЮ СВЯЧУ

Форум — гэта не толькі яркія акцыі і маляўнічыя шоу. Яго цэнтрам з'яўляецца **навукова-практычная канферэнцыя,** дзе абмяркоўваецца спалучэнне каштоўнасцяў традыцыйнай культуры з міжнароднымі іміджавымі стратэгіямі. Тут з дакладамі і нефармальнымі расповедамі выступаюць сур'ёзныя навукоўцы.






— Можа, гэта прагучыць банальна, але сапраўды без мінулага няма будучыні, — сказаў **дырэктар Магілёўскага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай працы Алег ХМЯЛЬКОЎ.** — У іншых краінах ганарацца сваёй спадчынай, і нам трэба. Нашы дзеці і ўнукі павінны ведаць традыцыі беларускага народа. Гэта таксама і частка іміджу краіны: без культуры, звычаяў, народных рамёстваў і промыслаў яго проста не будзе.

У межах форуму таксама адбылася важная падзея: прэзентацыя кнігі «Мікольская свяча», аўтары якой — вядомыя **этнографы і фальклярысты Янка КРУК і Аксана КАТОВІЧ,** знаёмыя чытачам «Звязды» па цікавых публікацыях. Гэтае навуковае даследаванне, прысвечанае абраду свячы ў вёсцы Наркі Шклоўскага раёна.

— Кніга выйшла ў свет літаральна днямі, і наш цэнтр пры падтрымцы абласнога ўпраўлення культуры бярэцца зрабіць наклад для рэгіёна, — пракаментаваў Алег Хмялькоў. — Кнігу ўбачаць чытачы нашых бібліятэк.

## АЖЫЯТАЖНЫ ПОПЫТ НА ВАЛЁНКІ І ЛАПЦІ

**Кіраўнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоль СІНКАВЕЦ** ганарыцца, што культурныя традыцыі вобласці — адны з самых багатых, і да таго ж яны перадаюцца маладому пакаленню. Напрыклад, фальклорны калектыў з вёскі Галавенчыцы Чавускага раёна «Незабудкі» прызнаны нематэрыяльнай спадчынай Беларусі: жанчыны сталага ўзросту цяпер вучаць спяваць дзяцей.

— Калі мы будзем перадаваць нашы традыцыі, то наша культура будзе здабыткам не толькі нашай нацыі, але і стане вядомай ва ўсім свеце, — перакананы Анатоль Сінкавец. — Гэта вялікая навука — захоўваць і перадаваць традыцыі. Гэтаму і прысвечаны форум.

У Шклове гасцям форуму прапануюць пацікавіцца тэатралізаванай дзеяй «Свята шклоўскага агурка» і народным гуляннем «Зялёныя святкі». У Дрыбіне прадстаўляюць фрагмент фестывалю-кірмашу «Дрыбінскія таржкі».

У Дрыбінскім раёне гасцей чакае таксама знаёмства з мясцовымі майстрамі. Тутэйшыя шапавалы даўно пераканалі, што іх тавар для цяперашніх зім — гэта тое, што трэба. Але, аказалася, што і спецыялісты па пляценні лапцяў не маюць праблем са збытам: лапці партыямі набываюць немцы і галандцы.

Завершыцца вандроўка па сельскіх раёнах Магілёўшчыны для ўдзельнікаў міжнароднага форуму вогнішчам мары і яднання «Жывіца».

**Ілона ІВАНОВА**



«Матчын ручнік — крыніца лёсу». Расказвае майстрыха Марыя Іванаўна САЛАНОВІЧ.

■ «Еўрабачанне-2013»




# ГАЛОЎНАЕ ПЕСЕННАЕ ШОУ ЕЎРОПЫ ФІНІШУЕ

**Ужо сёння ўначы пытанне, хто стане новым трыумфатарам «Еўрабачання», страціць сваю актуальнасць. Магчыма, спраўдзяцца прагнозы букмекераў, якія прымаюць стаўкі на юную спявачку з Даніі Эмілі дэ Форэст з каэфіцыентам 4 к 6. Але таксама цалкам магчыма, што сімпаты гледачоў перакінуцца на кагосьці з аўтсайдараў, аўтарытэт прафесійнага журы, у сваю чаргу, супрацьпаставіць гэтаму выбару яшчэ некалькі варыянтаў... На тое «Еўрабачанне» і шоу, каб не пераставаць здзіўляць.**

## ДВА ТУЗІНЫ І ЯШЧЭ ДВОЕ



16 мая шчаслівыя білеты ў фінал здолелі атрымаць канкурсанты з Азербайджана, Арменіі, Венгрыі, Грузіі, Грэцыі, Ісландыі, Мальты, Нарвегіі, Румыніі і Фінляндыі. Кампанію ім складуць прадстаўнікі 5 краін-заснавальнікаў «Еўрабачання» (Вялікабрытаніі, Германіі, Іспаніі, Італіі і Францыі), а таксама і леташняй краіны-пераможцы Швецыі. Прычым, калі Швецыя зрабіла стаўку на харастео маладосці, абраўшы сваім прадстаўніком 22-гадовага ўдзельніка бойз-бэнда Робіна Шэрнберга, то Вялікабрытанія аддала перавагу вопыту сталасці, які акумулюе знакамітая 61-гадовая рок-спявачка Боні Тайлер (на яе рахунку ўжо больш за 20 сольных альбомаў). Германія спыніла выбар на трыа «Cascada», які выступае ў стылі еўрадэнс, Іспанію прадстаўляе гурт з этнічным ухілам «El Sueno de Morfeo», а гонар Італіі будзе абараняць пераможца славутага фестывалю Сан-Рэма 2013 Марка Менгоні.

Усяго ж у фінале «Еўрабачання-2013» выступяць прадстаўнікі 26 краін.

## ГЕАГРАФІЯ З МАТЭМАТЫКАЙ

Такім чынам, у фінале «Еўрабачання» аказаліся 7 краін СНД, уключаючы былога члена садружнасці Грузію, і 17 краін Еўрасаюза. Інтрыга «Усходняя Еўропа супраць Скандынавіі» таксама захоўваецца. Праўда, на жаль, прадстаўнікоў ніводнай балканскай краіны ў фінальным шоу мы не ўбачым.

Паводле выбару арганізатараў конкурсу, Літва, Беларусь і Расія выступяць у першай палове фіналу. Нашай прадстаўніцы Алене Ланской з песняй «Solayoh» дастаўся нумар 8, канкурсанту з Літвы — нешчаслівая, па назіраннях экспертаў, 2 пазіцыя, спявачцы з Расіі Дзіне Гарыпавай — нумар 10. Прадстаўніца Украіны Злата Агневіч выступіць у другой палове шоу пад нумарам 22. Адкрые сённяшні канцэрт спявачка з Францыі Амандзін Буржуа, а закрые — прадстаўнік Ірландыі Раян Долан.

## ПРОСТАЯ МОВА

«Уся наша каманда вельмі ўдзячная за падтрымку сябрам і прыхільнікам, — падзялілася напярэдадні фінальнага канцэрта прадзюсар Дзмітрый Баранаў. — Нават тут, далёка ад радзімы, мы яе добра адчуваем. І сёння ваша падтрымка Алене яшчэ вельмі спатрэбіцца. А мы, у сваю чаргу, зробім усё ад нас залежнае і нават крыху больш, каб не расчараваць гледачоў».

## БЕЗ КАЛЬКУЛЯТАРА НЕ РАЗБЯРЭШСЯ

Нагадаем, паводле новых правілаў конкурсу, сёлета і публіка, і суддзі ацэньваюць не 10 найбольш удалых канкурсных кампазіцый, а выступленне кожнай краіны, за выключэннем свайго ўдзельніка. Такім чынам, як мяркуюць арганізатары, у іх, па-першае, атрымаецца перамагчы галасаванне суседзяў і дыяспар, а па-другое, «на выхадзе» атрымаецца максімальна аб'ектыўны рэйтынг усіх кампазіцый. У фінале ж галасаванне гледачоў і прафесіяналаў будзе аб'яднана ў звыклую схему: 12 балаў песні-лідару рэйтынгу, 10 — ўладальніку 2 месца ў галасаванні і г.д. да 1 бала. Акрамя таго, назіральнікі Еўрапейскага вяшчальнага саюза будуць пільна адсочваць за спробамі фальсіфікацыі і накруткі галасоў, пры неабходнасці ануляючы іх.

Разабрацца адразу, якая краіна колькі балаў атрымае па новай сістэме, даволі складана. Але зразумела, што больш ці менш «сярэднія» кампазіцыі, якія не выклікаюць непрыняцця, могуць апынуцца ў рэйтынгу значна вышэй за песні, што выклікаюць палярныя эмоцыі, ад любові да нянавісці.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

Анатоль КАРАЛЁЎ:

# «У ДЗЯЦЕЙ ПАВІННА БЫЦЬ ПРАВА ЗАДАВАЦЬ ПЫТАННІ Ў ШКОЛЕ...»

**Нядаўна Мінск наведаў сучасны рускі пісьменнік Анатоль Каралёў. Асноўнай мэтай візіту літаратара-постмадэрніста стала сустрэча са студэнтамі Інстытута журналістыкі БДУ, для якіх ён правёў майстар-клас аб памылках пісьменнікаў-пачаткоўцаў. Пасля майстар-класа карэспандэнту «Звязды» ўдалося пагутарыць з пісьменнікам асабіста, аднак не столькі пра літаратуру, колькі пра жыццё.**

Анатоль Каралёў — празаік, драматург, сцэнарыст, публіцыст, эсэіст, філолаг-даследчык, а таксама мастак-рысавальшчык, майстар калажа; выкладчык Літаратурнага інстытута імя А. М. Горкага ў Маскве. Ён вельмі тытулаваны пісьменнік. Толькі за адзін раман «Быць Босхам» атрымаў тры прэміі. Хоць пры гэтым літаратар не лічыцца папулярным, масавым. І сам сябе такім не лічыць. Але ад гэтага не пакутуе, а наадварот, радуецца. Ён лічыць, што добрая літаратура не можа быць масавай, забаўляльнай, папулярнай. Хутчэй яна будзе, на яго думку, сумнай, цяжкай.

У вельмі кароткай гутарцы з пісьменнікам я паспеў задаць толькі частку пытанняў, адказы на якія было б цікава пачуць ад аўтара «Галавы Гогаля», «Быць Босхам», «Эрона», «Stop, Каса!» і іншых твораў. Пра што можна было спытаць пісьменніка, кнігі якога захапляюць, прымушаюць думаць і нават змяняць сваё жыццё? Так уздзейнічаюць на чалавека, на яго падсвядомасць, што адна дзяўчына пасля прачытання «Быць Босхам» не магла два дні есці і піць. Варыянтаў было запланавана шмат, але я спытаў пра бяссмерце і праблемы адукацыі.

## ПРА БЯССМЕРЦЕ

***— У вас быў твор, прысвечаны тэме бяссмерця, біялагічнай несмяротнасці да якой так імкнецца чалавек. Наколькі вы самі лічыце яго патрэбным?***

— Безумоўна, ідэя смерці, яе механізм убудаваны ў наша жыццё. І адмаўляць яе вельмі складана, бо яна, умоўна кажучы, існуе як дадзенасць, да якой мы павінны неяк прымярыць свой лёс. Калі мы ўявім на адну секунду, напрыклад, што мухі не паміраюць, то зразумеем, што мільярды мух ператвораць наша жыццё ў кашмар. Уявім, што не паміраюць людзі і ўсе застаюцца жывымі, — жыццё, вядома, адразу спыняецца, бо не будзе змены часоў: дзікуны будуць жыць, татара-мангольскае іга будзе працягвацца і гэтак далей. А значыць, механізм смерці ўбудаваны ў наша жыццё як пэўны рэгулятар існавання. Але чалавек не хоча змірыцца. Мае стасункі з трансгуманістамі паказваюць, што яны настроены павялічыць у бліжэйшы час жыццё хаця б да 500-700 гадоў, а пасля і да тысячы. Калі гэта адбудзецца, то эвалюцыя будзе спынена. Чалавек перастане эвалюцыянаваць. Трансгуманісты ж кажуць, што эвалюцыя проста прыме новыя формы. У любым выпадку, ідэя спынення смерці выклікае ў мяне такі ж самы страх, як і прысутнасць смерці.

***— Ці можна лічыць, што людзі хочуць, жадаюць, мараць падоўжыць хоць нейкім чынам сваё жыццё, тым, што яны проста не вераць у нешта больш высокае, у тое, што могуць жыць і пасля смерці?***

— Калі давесці сітуацыю абсурду да канца і выказаць здагадку, што трансгуманісты з дапамогай нанатэхналогій змаглі хаця б да тысячы гадоў павялічыць працягласць жыцця (па іх мерках гэта зусім мала), то я думаю, што для верніка-хрысціяніна ці для будыста, ці для верніка-іўдзея прапанова зрабіць сваё цела бессмяротным не будзе мець вялікай прыцягальнасці. Яны выберуць смерць. Смерць будзе выбрана праваслаўным манахам, тыбетцам, іўдзеем, бо для іх смерць не ўяўляе фінал жыцця.

А калі мы зазірнем у такую шчаслівую будучыню, дзе чалавек жыве тысячы гадоў, то ў вельмі многіх людзей няма падстаў так доўга жыць. Ну што ты будзеш рабіць тысячу гадоў, калі не ведаеш часам, чым запоўніць нават адзін свой дзень? Сама думка пра тысячагадовае існаванне навядзе на такога чалавека паніку. І гэтыя людзі адмовяцца нават ад самой такой перспектывы.



Анатоль Каралёў падчас майстар-класа.

## ПРА АДУКАЦЫЮ

***— Вы часта выказвалі свае думкі наконт адукацыі; наконт пакут дзяцей у школе, калі іх прымушаюць вучыць тое, што яны не хочуць; наконт таго, што школа створана не для разумных, а для тых, хто нічога не разумее. Вы сцвярджаеце, што ўсе дзеці таленавітыя, толькі ім не даюць гэта рэалізаваць. У выніку жаданне ведаў знікае. Як вы лічыце, якім чынам трэба змяніць сістэму адукацыі, як нам выхоўваць дзяцей, каб дазволіць ім усім выявіць сябе?***

— Трэба сур'ёзным чынам падняць правы дзіцяці ў школе. Я ішоў у школу наіўным маленькім хлопчыкам, у якога было два вялікія пытанні: якім чынам у тэлефоннай трубцы чуты голас чалавека, які знаходзіцца далёка; і хто мацнейшы — леў ці тыгр? Калі я апынуўся ў школе, я зразумеў, што ў мяне няма права на пытанні. Пытанні задаюць мне. Я замаўчаў, здзіўлены гэтай сістэмай, і падпарадкаваўся ёй. Прайшло пяць гадоў, пакуль я вывучыў фізіку і змог сам адказаць на пытанне, якім чынам мембрана пераносіць праз электрычныя ваганні гук голасу чалавека ў тэлефоне. Па другім пытанні я зразумеў, што ў джунглях мацнейшы тыгр, а ў саване — леў. Гэтыя дзіцячыя пытанні засталіся без адказу. Калі б мне далі права на пытанні, якія б я адрасаваў настаўніку, то адразу «схапіў» бы ўсе фізічныя законы. Калі б гэта ўсё мне растлумачылі тады, калі я гэтага горача жадаў, я б усё зразумеў. Вось таму трэба аднавіць правы дзіцяці ў школе. У пачатковых класах гэта асабліва важна, каб дзеці мелі права на пытанні. Іх вучаць навукова, як маленькіх дарослых, але гэта памылка. У мяне няма нейкіх канкрэтных прапаноў па змене сістэмы выкладання ў школе, але я дакладна ведаю, што ў школе я быў адлучаны ад асабістых жаданняў. Я баяўся сказаць, што мяне цікавіць. Я не мог падняць рукі. Я ператварыўся ў робата, механізм. Але як адстаяць правы дзіцяці, калі ён сам не ведае, чаго хоча? Ён не можа іх выказаць. Вось у гэтым вялікая праблема. Не ведаю, як, але гэтыя правы павінны ўлічвацца.

Я ўвогуле думаю, што веды — гэта падарунак. Егіпецкія жрацы даведваліся, што Зямля круглая, у выніку ініцыяцыі, як фінал глыбокага таямнічага пранікнення ў веды. Цяпер, калі мы кажам, што Зямля круглая, то мы прапаноўваем гэта прафанічнай свядомасці. Прафаны гэтага не разумеюць. Ім няма розніцы, круглая яна ці плоская. Калі б мы даказвалі прафанам, што Зямля плоская, то яны б усе былі ўпэўнены, што так і ёсць. Калі перамяніць нашу адукацыю з плюса на мінус і даказваць, што Зямля плоская, — усе будуць так думаць. Тады нам будзе патрэбны новы Капернік, каб гэта абвергнуць. Таму мы знаходзімся яшчэ і ў сістэме прафанічнага разумення ведаў.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ,**
**фота аўтара.**

■ Асаблівыя прыкметы

# УНІКАЛЬНЫЯ ЛЮДЗІ — ГЭТЫЯ... «РЫЖЫКІ»




**Рыжавалосых людзей можна смела назваць унікальнымі, бо іх на планеце Зямля вельмі мала. Па некаторых звестках, максімум 6%, а ў іншых інфармацыйных крыніцах гаворыцца, што рыжавалосых удвая менш.**

Пагадзіцеся, на вуліцы, у кавярні і гэтак далей вашы вочы чамусьці імкнуцца лепш разглядзець сустрэчнага рыжавалосага незнаёмца. А калі ў калектыве з'яўляецца руды супрацоўнік, апошняе міжволі згадваецца падчас абмеркавання персоны навапечанага калегі.

Ёсць даследаванні пра тое, што больш за 1/3 зямлян маюць «рыжы ген» (па некаторых звестках — нават 40%). Значыць, калі бацькі не рыжыя, як і іх бацькі, дзяды, прадзеды і гэтак далей, у іх усё роўна можа нарадзіцца «дзіця сонца», бо ген, як кажуць, пальцам не выцісненш.

## «РЫЖЫ ФЕСТЫВАЛЬ»?

Было б цікава даведацца, ці ёсць у нас у Беларусі вёска або гарадок, дзе колькасць рыжых параўнальна высокая? Без жартаў! Можна было б, улічваючы гэты факт, прыдумаць і арганізаваць там нешта крэатыўнае.

Вось у брацкай Расіі сёлета запланавалі правесці аж 10 «Рыжых фестываляў»!

Аказваецца, Іжэўск — расійская сталіца рыжых. Гэты горад невыпадкова быў выбраны для правядзення аднаго з самых незвычайных фестываляў у свеце, бо менавіта ўдмурты — самы рыжавалосы народ Расіі. А ва ўсім свеце лідар па колькасці рудых — Ірландыя, дзе, па некаторых падліках, кожны дзясяты жыхар — рыжы. Але пры гэтым іжэўскія энтузіясты ўпэўнены, што менавіта іх зямля — прарадзіма плямёнаў рыжых. Маўляў, быў такі народ — будзіны, пра які пісаў Герадот: «качавое племя людзей з блакітнымі вачыма і рыжымі валасамі». І племя ўпачатку жыло паміж вялікімі рэкамі Волга і Кама.

Падчас «рыжага» фестывалю ў Іжэўску на цэнтральнай плошчы праводзяць «Рыжы кірмаш», дзе ў ліку іншага можна купіць рыжыя парыкі, сродкі для фарбавання валасоў, працуе «Рыжы фотасалон» , арганізуецца музычны конкурс «Рыжая мелодыя» і «Рыжы турзлёт» з удзелам выключна рыжавалосых сем'яў... А завяршаецца свята «спецыялізаваным» салютам пад назвай «Салют, рыжы!». Па традыцыі фэст праводзіцца ў пачатку восені. І зноў невыпадкова: шмат рыжага колеру, рыжае лісце і на кронах дрэў, і пад нагамі...

Цікава, што ўваход на фестываль бясплатны не толькі для рыжых.



Дарэчы, на Віцебшчыне сёлета задумалі правесці першы «Вішнёвы фестываль» па аналогіі з ужо існуючымі за мяжой. Ідэю «рыжага» фестывалю — дару. Рэалізуйце і запрашайце на свята! Упэўнены, што навіна аб планах правядзення ў Беларусі першага фестывалю рыжых стане добрай інфармацыйнай нагодай для СМІ. А пры добрай фантазіі, упэўнены, шмат фірмаў і прадпрыемстваў ахвотна дапамогуць правесці «сонечную акцыю».

## РЫЖЫЯ ЛЕАНАРДА І ВІВАЛЬДЗІ...

Вядомых рыжых таксама нямала. У Расіі да з'яўлення на палітычнай арэне Чубайса, прозвішча якога даўно ўжо стала «сінонімам» слова «руды», самай вядомай рыжай была Ала Барысаўна Пугачова. Дарэчы, Чубайс — родам з Беларусі.

У спісе вядомых рыжых — імператар Нерон, Іван Грозны, Джордж Вашынгтан, Галілей, Вівальдзі, Леанарда да Вінчы, Вінцэнт ван Гог, Фрыдрых Шылер, Марына Цвятаева, Сара Бернар і нават Хрыстафор Калумб...

У пачатку 1980-х амерыканец Стывен Дуглас стаў заснавальнікам Міжнароднага саюза рыжых. А спецыялізаваны часопіс The Redhaired займаецца прапагандай значнага ўкладу ў развіццё цывілізацыі рыжавалосых людзей, піша на ўсе тэмы пра рыжых.

Між іншым, Пётр І сваім указам забараніў даваць дзяржаўныя пасады «Рыжым і касавокім, таму што Бог шэльму меціць!» А яшчэ на Русі гаварылі: «Рыжы ды чырвоны — чалавек небяспечны».

Рыжыя галоўныя героі кінафільмаў гарантуюць непазбежны поспех, калі, вядома, сцэнарый больш-менш цікавы. Рыжавалосая Ніколь Кідман, фільмы з удзелам якой вельмі касавыя, у дзяцінстве часта была аб'ектам для кпінаў. Зараз гэтая вельмі сексапільная «зорка», як вядома, стала бландзінкай. А памятаеце савецкі мультфільм з галоўным рыжым персанажам? І ў наш час глядзець гэты мульцік — задавальненне.

## ПАКУТЫ І РАДАСЦІ РЫЖЫХ

Да рыжых, быў час, ставіліся, мякка кажучы, не па-людску.

Напрыклад, у старажытныя часы ў Егіпце менавіта рыжых прыносілі ў ахвяру богу сонца. У часы сярэднявечча нялёгка жылося жанчыне з рыжым колерам валасоў: калі нешта не тое адбывалася ў мясцінах, дзе яна жыве, адразу крычалі, што рыжая ведзьма ва ўсім вінаватая.

А ў Персіі і рыжавалосым мужчынам даставалася, бо лічылі, што руды колер валасоў з'яўляецца пацверджаннем таго, што іх уладальнік «сябруе» з цёмнымі сіламі.

А потым «рыжыкам» стала жыць значна прасцей. Рыжавалосыя жанчыны, можна сказаць, «увайшлі ў моду». Прыгажуні спецыяльна фарбавалі валасы менавіта ў рыжы колер, каб заўсёды быць у цэнтры мужчынскай увагі.

Дарэчы, рудыя жанчыны павінны быць шчыра ўдзячнымі жывапісцу Рубенсу, які маляваў натуршчыц з рыжымі валасамі і яшчэ больш зрабіў папулярнымі «жанчын сонца» сярод мужчын. А ван Гог быў рыжым, што можна ўбачыць на славутым яго аўтапартрэце.

Ёсць даследаванні пра тое, што, аказваецца, сярод рыжых больш ляўшэй або людзей, якія аднолькава добра валодаюць і правай, і левай рукой.

Колер валасоў, вядома, не можа не ўплываць на характар і жыццё чалавека. Але рыжыя, як адзначалася вышэй, заўсёды ў цэнтры ўвагі. І гэта загартоўвае характар ды ўвогуле фарміруе моцную асобу, якая можа пастаяць за сябе.

Людзі з рыжымі валасамі параўнальна больш тэмпераментныя, часта наравістыя і непакорлівыя. І таму нярэдка самаўпэўненым, тэмпераментным і актыўным рыжавалосым людзям прыпісваюць негатыўныя якасці. Напрыклад, лічаць іх непастаяннымі ў стасунках з супрацьлеглым полам. Асабліва гэта тычыцца жанчын. Але такія меркаванні далёкія ад ісціны, бо нельга ж усіх рыжых адной меркай мераць...

Рыжы або не — якая розніца? Быў бы чалавекам добрым. А рыжы колер валасоў — гэта, пагадзіцеся, прыгожа, эксклюзіўна, натхняльна...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

# Усё пра Еву

# ДЗЯЦЕЙ І ЖЫВЁЛ — ПАПАЛАМ?

## Шлюбны дагавор як сродак цывілізавана разысціся



**Менавіта ў мяне шлюбны дагавор асацыіруецца со знакамітым серыялам «Секс у вялікім горадзе». Дарэчы, многія жыхары нашай краіны, ва ўсялякім выпадку жанчыны, даведаліся пра існаванне шлюбнага дагавора менавіта з гэтай кінастужкі. Памятаю, з якой цікаўнасцю я сачыла за тым, як адстойвала свае правы пры заключэнні шлюбу і адначасова шлюбнага дагавора гераіня серыяла Шарлота Ерк: размова ішла пра суму, якую муж павінен быў выплаціць Шарлоце за нараджэнне дачкі ці сына і на ўтрыманне самой былой жонкі ў выніку скасавання шлюбу. Шарлота лічыла, што яе ацэньваюць... занадта танна.**

У нас уявіць, што ў шлюбны дагавор будзе ўключана «ўзнагарода» за нараджэнне першага дзіцяці ў залежнасці ад таго, хто з'явіцца на свет, складана. Ва ўсялякім разе, спецыялісты, якія рэгіструюць шлюбы і разводзяць пары ў судах, пра гэта ніколі не чулі.

Жыхары нашай краіны наогул рэдка заключаюць шлюбны дагавор, калі вырашаюць ажаніцца. Гэта тлумачыцца не толькі тым, што ў беларусаў на першым месцы каханне, а на другім ужо фінансавыя пытанні, але і тым, што ў большасці выпадкаў у нашых сем'ях муж і жонка не нажываюць такіх багаццяў, якія трэба было б доўга і нервова дзяліць падчас скасавання шлюбу.

Ёсць, вядома, і ў Беларусі вельмі забяспечаныя людзі, прычым як жанчыны, так і мужчыны, але большасць з іх, як сведчыць статыстыка, усе ж не верыць у эфектыўнасць шлюбнага дагавора. Напрыклад, адзін з айчынных бізнесменаў у прыватнай гутарцы прызнаўся, што лепшы сродак захаваць сваю маёмасць і грошы — наогул... не рэгістраваць шлюб. Да такога меркавання ён прыйшоў пасля скасавання першага шлюбу, аназіраючы за негатыўным вопытам падзелу маёмасці сваіх прыяцеляў, толькі ўпэўніўся ў гэтым. Дарэчы, сам ён пасля разводу з першай жонкай быў вымушаны развітацца з часткай грошай і маёмасці: падзяліў рахункі, аддаў дом пад Мінскам і кватэру ў Чэхіі. Як тлумачыць Андрэй, развітацца з грашыма і маёмасцю было не столькі горка (бо ад першага шлюбу ў яго двое дзяцей), колькі нервова. Пасля таго, як яны з жонкай разышліся канчаткова, ён амаль год наогул не мог з ёю размаўляць, але зараз яны памірыліся дзеля дзяцей. Што датычыцца яго цяперашняга асабістага жыцця, то грамадзянскім шлюбам ён жыве ўжо з чацвёртай жанчынай, але адносіны не рэгіструе прынцыпова. Таму што шлюбны дагавор дапамагае разысціся цывілізавана толькі тады, калі ў былых мужа і жонкі няма спрэчак наконт падзелу рахункаў ці маёмасці. Калі ж ёсць — вырашыць канфліктную сітуацыю усё роўна можна толькі праз суд.

Такой думкі, дарэчы, прытрымліваюцца і многія іншыя жыхары рэспублікі, таму шлюбны дагавор у нас часцей рэгіструецца... непасрэдна перад тым, як людзі разыходзяцца, пры адсутнасці паміж імі спрэчак. Інакш кажучы, былы муж і жонка яшчэ да таго, як накіравацца ў суд, дамаўляюцца, каму з іх дастанецца кватэра з мэбляй, а каму — машына і хата ў вёсцы. Такі папярэдні дагавор, замацаваны натарыяльна, дазваляе зрабіць скасаванне шлюбу не такім складаным і хваравітым.

«Лепш пасварыцца да суда, — расказвае Іван, дарэчы, юрыст па адукацыі, — чым высвятляць адносіны менавіта там». У мужчыны таксама ёсць негатыўны вопыт скасавання шлюбу. Разам з былой жонкай Кацярынай яны пражылі параўнальна нядоўга — 7 гадоў, але за гэты час пара паспела пабудаваць кватэру, нарадзіць дачку і набыць аўтамабіль. Кватэру Іван пакінуў былой жонцы і дачцэ, сабе ўзяў толькі машыну. Каб не спрачацца ў судзе і «не выглядаць дурнямі», былыя муж і жонка папярэдне заключылі шлюбны дагавор, таму само скасаванне прайшло адносна спакойна. У ім жа яны запісалі, колькі разоў на тыдзень Іван будзе бачыцца з дачкой, а таксама абавязкі таты па аплаце навучання дачкі, калі тая падрасце і вырашыць паступаць у ВНУ.

Часцей за ўсё заключаюць шлюбны дагавор мужчыны і жанчыны, якія ўжо раней былі ў шлюбе. «У мяне і маёй жонкі Ірыны гэта другі шлюб, — расказвае Аляксандр. — У кожнага з нас за плячыма вельмі цяжкае і напружанае скасаванне, таму мы і вырашылі заключыць дагавор. Калі сумеснае жыццё не складзецца, ён дазволіць сэканоміць не толькі нервы, але і грошы. На той час, калі я разыходзіўся з першай жонкай, дзяржпошліна складала ўсяго тры базавыя велічыні, а вырашэнне ж пытанняў падзелу маёмасці ў судовым парадку прыйшлося выкласці 5 працэнтаў ад сумы іску — а гэта былі значныя грошы».

Такім чынам, у шлюбным дагаворы, як растлумачыла юрыст Таццяна Куцко, у адпаведнасці з артыкулам 13 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, можна ўрэгуляваць: правы і абавязкі мужа і жонкі па ўзаемным утрыманні, у тым ліку пасля скасавання шлюбу; парадак падзелу маёмасці, якая з'яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю мужа і жонкі; умовы немагчымасці прызнання маёмасці мужа і жонкі іх агульнай сумеснай уласнасцю і іншыя пытанні ўзаемаадносін паміж мужам і жонкай (парадак нясення кожным з іх сямейных выдаткаў і да т.п.), бацькамі і дзецьмі, калі гэта не парушае правы і законныя інтарэсы іншых асоб і не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

— А вось абмяжоўваць праваздольнасць і дзеяздольнасць мужа і жонкі шлюбны дагавор не можа, — гаворыць Таццяна Куцко. — Напрыклад, прадметам дагавора не могуць з'яўляцца ўмовы, якія ставяць мужа ці жонку ў няроўнае становішча (нельга запісаць, што ўся маёмасць, якую сужэнцы набылі ў шлюбе, адыдзе ў выніку скасавання толькі аднаму з бакоў). Умовы шлюбнага дагавора таксама не павінны парушаць правы непаўналетніх дзяцей.

Інакш кажучы, шлюбны дагавор накіраваны на ўпарадкаванне, змяненне ці спыненне маёмасных правоў і абавязкаў мужа ці жонкі, асоб, якія бяруцца шлюбам — як непасрэдна ў самім шлюбе, так і пры яго скасаванні, а таксама іншых пытанняў, якія датычацца ўзаемаадносін паміж мужам і жонкай. А вось заключаць шлюбны дагавор ці не, і калі гэта лепш рабіць — перад уступленнем у шлюб, у час яго існавання ці падчас яго скасавання — вырашаць непасрэдна мужчыну і жанчыне, якія кахаюць адно аднаго ці хаця б кахалі калісьці...

**Алена КАВАЛЁВА.**

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»:

# «Таму што Ён так любіць»



Прынесла дадому стос «Маладосці» 1950-х гадоў, першага, так бы мовіць, іміджу. Увогуле, мурашы бягуць па скуры ад гэтых месцамі пацёртых, часам з адарванымі вокладкамі, трошкі жоўтых і ў большасці вельмі сімпатычнага дызайну экзэмпляраў. А яны ж яшчэ і бяруць удзел у юбілейнай акцыі! Ну, і з тае нагоды розныя вядомыя пісьменнікі ставілі сёння на іх свае пажаданні і аўтографы. Закінуць рарытэты ў рэдакцыю пад канец працоўнага дня не ўдалося — і я паехала дадому разам з імі. Не прамінула, вядома ж (як такое праміне ш?), паказаць гістарычныя каштоўнасці мужу.

— Рэдактар Кулакоўскі. Гэта першы? А ты якая па ліку?

— Дзясятая.

— Дык ты хоць разумееш, што і сама ўжо ўвайшла ў гісторыю, як гэтыя твае часопісы?

Пытанне было зададзена, як кажуць, у лоб, знянацку і, што абавязкова трэба дадаць, даволі дзіўным чынам. Адпіваючы глыток кавы з зялёнага гранёнага кубка (з якога, па асабіста маім меркаванні, лепш было б піць не каву, а гарбату, з мелісай ці хаця б мацярдушкай), Ён неяк раўнадушна-велічна (як толькі Ён умее) дадаў:

— Ты разумееш, што застанешся ў спісе рэдактараў гэтай сваёй «Маладосці» назаўсёды, і адбудзецца гэта дзякуючы мне?

Прызнаюся, на гэтым месцы мне вельмі закарцела працытаваць Купалу, радок з «Паўлінкі» — рэпліку ці то Агаты, ці то Альжбэты пра... Думаю, зразумела, пра што. Але ж утрымалася. Бо амаль дарэчы ўспомніла, што ледзь не галоўнай прыкметай жаноцкасці (у маім разуменні) з'яўляецца залежнасць ад мужчыны. Таму я, натуральна, паспяшалася запэўніць Яго, што цалкам прызнаю і ўсім сваім сэрцам прымаю Яго рацыю. У тым сэнсе, што за ўсё, што датычыцца сёння маёй, так бы мовіць, працы («Праца-хобі, з глузду з'ехаць!»), я ўдзячна Яму, свайму мужу, які аніякага дачынення не меў, не мае і (дзякуй Богу!) не будзе мець ні да журналістыкі, ні да літаратуры (хаця б таму, што забяспечваць бесперапынна-бездакорную працу банкаўскіх капіраў, прынтараў і лічыльных апаратаў — справа куды больш надзённая і па-мужчынску канкрэтная), але вось жа аднойчы параіў — змяніць месца працы, пагадзіцца на прапанову заняць пасаду кіраўніка (кіраўніцы!), падтрымліваў (колькі ўжо разоў!) і яшчэ не раз падтрымае — выціраючы з-пад вачэй фірменную туш, распушчаную ў салёнай вадзе.

Хто з жанчын не ведае, што лепшым лекавым сродкам ад чаго заўгодна з'яўляецца салёная вада? Гэта ўжо не я сказала, а Карэн Бліксэн. Маючы на ўвазе ў першую чаргу ваду марскую, з бронзавым загарам у якасці пабочнага эфекту ад такога лекавання. Калі няма мора, дык няхай будзе праца да сёмага поту — бо ён таксама вада, таксама салёная, і таму ад яго гэтаксама выпетрываецца з галавы якая заўгодна бязглуздзіца. Што яшчэ большая праўда, за сёмым потам можа надысці чарга салёнай вады трошкі іншага кшталту.

Вось пра што я тут хацела сёння напісаць? Ага, пра здольнасць або няздольнасць жанчыны спраўляцца з кіруючай пасадай.

Памятаю, як некалі атрымала прапанову аднаго важнага часопіса адказаць на адно сур'ёзнае пытанне: чым жанчына-кіраўнік адрозніваецца ад кіраўніка-мужчыны? Адказ свой я тут, вядома, прывяду і абгрунтую, і з вялікім задавальненнем, але, відаць, ужо ў наступнай сваёй нататцы.

Бо спяшаюся смажыць фарэль. Папярэдне папырскаю яе воцатам з вінаграднага віна і прыцерушу чорным перцам, а потым, ужо падсмажаную, аздоблю чырвоным соусам.

Таму што Ён так любіць.

# АДНА ДОМА...

**Неаднойчы даводзілася чуць, што прадстаўніцы прыгожай паловы маюць усяго тры варыянты развіцця жыццёвых падзей: хадзіць ад званка да званка на працу за невялікі, але стабільны заробак; рабіць кар'еру бізнес-лэдзі альбо стаць хатняй гаспадыняй і цалкам прысвяціць сябе дому, сям'і, дзецям, мужу. Мы вырашылі даведацца, чаму шэраг жанчын аддае перавагу апошняму з варыянтаў і якое яно, жыццё ў хатніх гаспадынь?**



## ГІСТОРЫ ПЕРШАЯ.

### Ілюзія незалежнасці

Вера Сяргееўна — хатняя гаспадыня са стажам. Калісьці, яшчэ дзяўчынай, яна ўзялася шлюбам з Віталем — тады перспектыўным выпускніком маскоўскага ўніверсітэта, якога актыўна «прасоўвалі» па партыйнай лініі. За час трыццацігадовага шлюбу жанчына аб'ездзіла з мужам паўсвету. Здымныя кватэры змяняліся адна за адной, муж пераходзіў з адной пасады на другую, з кожным разам больш высокую. Вера, па адукацыі эканаміст, нават калі б і хацела працаваць, не змагла б, бо сям'і даводзілася жыць у такіх краінах, дзе беласкурай жанчыне было за лепшае не выходзіць нікуды без аховы.

Нікому яна са сваім дыпломам асабліва не была патрэбна і ў высокаразвітых краінах. А каб жонка працавала пры пасольстве, муж не хацеў: прынцыпова лічыў, што сужэнцы не павінны працаваць у адной арганізацыі: маўляў, гэта шкодзіць і дзелавым, і сямейным адносінам. І, наогул, месца жанчыны — сям'я і дом, а асноўны абавязак — выхаванне дзяцей. Таму Вера Сяргееўна цалкам прысвяціла сябе ім.

Спачатку змагалася з дзіцячымі хваробамі, потым — за добрыя адзнакі ў школе, затым — з першымі юнацкімі закаханасцямі, каб хлопцы выпадкова не прывялі дадому жонак «не з іх асародку». Сыны пасталелі, узяліся шлюбам «з кім трэба», у іх нарадзіліся свае дзеці, і муж стаў для Веры Сяргееўны адзіным святлом у акне. Бытавыя праблемы ёй вырашаць не даводзілася ніколі: у сям'і заўсёды была хатняя работніца, а муж спраўна выдаваў грошы на ўсе патрэбы — ад харчавання да адзення. Толькі аднойчы ёй давялося прайсці праз сапраўднае выпрабаванне: калі муж закахаўся ў іншую.

— Але я сама была ў гэтым вінаватая. Муж у мяне — мужчына прыкметны, заўсёды карыстаўся поспехам у жанчын, а ў мяне быў перыяд, калі я стала звяртаць на сябе менш увагі, як кажуць, «распусцілася»: набрала ў вазе, махнула рукой на знешнасць, — расказвае Вера Сяргееўна. — Але калі пачула пра палюбоўніцу — спужалася, што ён мяне кіне, а я ж на той час ужо даўно забыла, як гэта — хадзіць кожны дзень на працу, самой гатаваць, прыбіраць у кватэры, купляць прадукты. Ды і не хацелася ўжо ўсё гэта «ўспамінаць», прызнаюся шчыра.

Таму Вера ўзялася аднчасова і за сябе, і за маладую сяброўку мужа: вынік не прымусіў чакаць. Неўзабаве муж, якому таксама надакучыла яго «забава», вярнуўся ва ўлонне сям'і. З таго часу яны і жывуць ціха-мірна. А каб у жонкі стварылася ілюзія незалежнасці, Віталь Мікалаевіч падарыў ёй акцыі аднаго з прадпрыемстваў, па якіх Вера Сяргееўна штомесяц атрымлівае працэнты.

## ГІСТОРЫЯ ДРУГАЯ.

### Звычайная

Алена Леанідаўна — звычайная хатняя гаспадыня, якіх шмат. І гісторыя ў яе самая звычайная: адзін за адным нарадзіліся дзеці, якія часта хварэлі, вось жанчына і вымушана была кінуць працу, якую, дарэчы, любіла (па спецыяльнасці яна — прадавец) і прысвяціць сябе хлопчыкам. Тым больш што муж зарабляў нядрэнна. Потым яна проста ўцягнулася ў такое жыццё, калі сама сабе начальнік. Галоўнае, каб дзеці былі дагледжаны, у кватэры — прыбрана, ежа — прыгатавана, каб сарочкі мужа — заўсёды зіхацелі. На сябе грошай яна ніколі не прасіла, хадзіла ў старых рэчах, бо лічыла, што збегаць у магазін ці пайсці пагуляць з дзецьмі добра і ў тым, што ёсць.

— З цягам часу муж проста адвык ад таго, што мне неабходны грошы на жаночыя патрэбы і перастаў іх увогуле даваць. Прыйшоў дзень, калі я проста была вымушана выйсці на працу хоць кім. Адзенне ўсё было зношана, абутак дабіты, а прасіць грошы надакучыла.

Сёння ў Алены Леанідаўны сваё жыццё, а ў яе былога мужа новая жонка, дарэчы, вельмі патрабавальная ў матэрыяльным плане. У Алены Леанідаўны — сыны, свабода ад шлюбных абавязкаў і насычаная паходамі ў тэатры, кіно і на канцэрты жыццё. Усё, у чым яна сабе так доўга адмаўляла.

## ГІСТОРЫЯ ТРЭЦЯЯ.

### Дзявочая мара

Настассі нядаўна споўнілася 20 гадоў, а ў яе ўжо ёсць многае, пра што іншыя дзяўчаты толькі мараць. А самае галоўнае — муж, дзякуючы якому яна ўсё гэта мае. Яўгену 35 гадоў, ён вельмі паспяховы менеджар, працуе ў банку.

Настассі ж працаваць не хацелася ніколі. Да таго ж, у яе свой «цяжкі» распарадак дня: масаж, цырульня, трэнажорная зала і гэтак далей. Яна спрабавала ўладкавацца на працу, але вельмі хутка зразумела, што «не створана» для гэтага.

— Мая работа — гэта добра выглядаць, каб, калі мы з мужам кудысьці ідзём, на мяне глядзелі іншыя людзі, — расказвае Настасся. Муж, дарэчы, ганарыцца тым, што ў яго такая прыгожая жонка.

У будучыні пара плануе мець дзяцей, але гэта ўжо бліжэй да таго часу, калі Настассі споўніцца 30 гадоў. А пакуль, лічыць дзяўчына, трэба жыць для сябе. Перыядычна яна радуе мужа ежай «асабістага прыгатавання», і толькі блізкія сяброўкі ведаюць, што яна заказвае ўсе стравы ў адным з мінскіх рэстаранаў.

— Няўжо муж не здагадваецца, што не сама гатуеш? — неяк спытала ў яе. Настасся толькі ўсміхнулася: маўляў, можа і здагадваецца, але выгляду не падае. Бо галоўнае ў шчаслівым шлюбе — не лезці ў тое, што не прыносіць бяды. Піша там жонка нешта ў сацыяльных сетках — няхай піша. Робіць выгляд, што сама гатуе ці вышывае крыжыкам — таксама яе справа.

Галоўнае, каб мужу хацелася кожны дзень вяртацца дадому, а дома — не прыходзілася засяроджваць увагу на тым, што б такога з'есці ці выпіць.

...Такія вось у нашых «гаспадынь» гісторыі. Шчаслівыя ці не — рабіце вывады самі.

**Настасся КАЗІМІРАВА.**

# Прыгажосць у... сціпласці

**Рэдакцыя віцебскай газеты «Каталіцкі веснік», бадай, упершыню ў краіне праводзіць незвычайны конкурс, мэта якога — паказаць прыгажосць у сціпласці беларускіх дзяўчат.**

Каб прыняць удзел у конкурсе «Прыгажуня весніка», дзяўчатам неабходна даслаць па электроннай пошце свае фотаздымкі. Пераможцаў вызначыць рэдакцыя, прымаючы да ўвагі вынікі анлайн-галасавання. Узрост удзельніц — ад 15 гадоў. На конкурс не прымаюцца фатаграфіі з выявамі мужчын, а таксама здымкі дзяўчат у купальніках і ў сонечных акулярах.

— Здымкі павінны быць зробленымі не раней красавіка 2013 года. Фатаграфіі прымаюцца да 7 чэрвеня. У конкурсе пераможаць 3 удзельніцы, якія набяруць найбольшую колькасць галасоў, — удакладнілі ў рэдакцыі «Каталіцкага весніка». Калажы да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца. Каб прагаласаваць, калі ласка, зарэгіструйцеся на сайце catholicnews.by.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Будзьце пільныя!

## Ахвяр падбіраў праз сацыяльныя сеткі

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Фрунзенскага РУУС сталіцы затрымалі падазронага ў крадзяжах 30-гадовага, раней тройчы судзімага мінчаніна, які знаёміўся ў сацыяльных сетках з патэнцыяльнай ахвярай, улюбляў яе ў сябе, а затым... абкрадаў.**

У міліцыю паступіла заява аб крадзяжы ювелірных вырабаў ад 24-гадовай мінчанкі. Сума ўкрадзенага 70 мільёнаў рублёў. А перадгісторыя была такая. У дзяўчыны ў інтэрнэце з'явіўся паклоннік. Хутка віртуальныя сустрэчы перараслі ў рэальныя, прычым праходзілі яны дома ў пацярпелай. Пасля чарговай з іх дзяўчына выявіла знікненне залатых упрыгажэнняў. Натуральна, у праваахоўнікаў пад падазрэнне трапіў новы знаёмы пацярпелай, і яны пачалі ўстанаўліваць яго асобу. А мужчына... сам выйшаў на сувязь з дзяўчынай і здолеў пераканаць яе, што не мае ніякага дачынення да знікнення ўпрыгажэнняў. А раніцай гаспадыня недалічылася ў сваім кашальку 1,5 мільёна рублёў... Міліцыянеры маюць падставы меркаваць, што гэты эпізод у біяграфіі затрыманага — далёка не адзіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

# Я ІДУ ТАКАЯ ЎСЯ... У МАКАХ І РУЖАХ

**Сапраўдная прыгажосць не ў тым, каб кідацца ў вочы, а ў тым, каб мужчына не змог забыць. Нават калі ён да гэтага імкнецца... Жанчынам, каб уразіць навакольных сваёй прыгажосцю, акрамя сонечных прамянёў, неабходна шмат рэчаў. Сукенкі, спадніцы, туфлі на «шпільках»... І эта зусім не поўны спіс таго, што дапамагае прадстаўніцам прыгожай паловы квітнець і адчуваць сябе шчаслівымі і жаданымі.**

Дарэчы, пра кветкі: іх разнастайнасць і мноства — ад дробных незабудак да буйных макаў, ружаў і сланечнікаў — асноўны трэнд моднага сезона вясна-лета 2013 года. Яны прымальныя нават на купальніках! Калі вы, нашы шаноўныя прыгажуні, збіраецеся ў бліжэйшы час наведацца ў гандлёвы цэнтр па новую сукенку ці спадніцу, абавязкова звярніце ўвагу на тыя, што «ў кветачкі».

Тканіны таксама даюць прастору для фантазіі (вядома ж, мужчынскай!): ад пяшчотнага шоўку до тоненькага гіпюру і карунак. У каляровай гаме лідзіруюць чорны і адценні чырвонага, якія падкрэсліваюць сексуальнасць. А вось пяшчотна-ружовы, дымчата-бірузовы, крэмава-белы нададуць вобразу рамантычнасць і вытанчанасць.





Радуйцеся, аматаркі джынсавай тканіны: вядучыя модныя часопісы свету ў гэтым сезоне дазваляюць апрануцца ў «джынсу» ў прамым сэнсе з ног да галавы, а дакладней — ад туфель да сумачкі. Прычым асабліва вітаецца спалучэнне адразу некалькіх тонаў: напрыклад, светла-блакітнага і цёмна-сіняга. А вось што да самой тканіны, лепш выбіраць больш тонкую і мяккую.

Мабыць, з-за працяглай зімы мы ўсе так засумавалі па моры, што ў гэтым сезоне вырашылі не абмяжоўвацца цяльняшкай. У модзе палоска рознай шырыні і колеру — і не толькі на адзенні, але і на аксесуарах.

Лепш набываць сумкі і абутак з перфарацыяй: гэта выглядае лёгка і вытанчана. І не забудзьце пра біжутэрыю: пластмасавую, буйную і абавязкова — яркіх колераў!

А вось у макіяжы лепш быць стрыманай: пакідаем чорныя бровы (прычым нават для бландзінак), чорныя вейкі (іх можна зрабіць даўжэйшымі за кошт накладных) і ніякіх ценяў! Выключэнне — памада і лак для пазногцяў: трэнд сезона — яркія адценні чырвонага. Зрэшты, замест іх можна выкарыстоўваць на вуснах і пазногцях празрыста-ружовыя ці матавыя адценні.



А цяпер пацікавімся, на чым спынілі свой выбар айчынныя модніцы.

— Неяк у канцы красавіка сустрэліся з сяброўкай і вырашылі прайсціся па гандлёвым цэнтры, — расказвае **блогер і прыхільніца драйву ва ўсіх яго праявах Наталля ШЧАСНАЯ**. — Ніякіх пакупак у планах не было. Але дымчата-ружовая сукенка з пяшчотнага гіпюру прымусіла надоўга затрымацца ў адным з магазінаў і накіравацца ў прымерачную. Адтуль я ўжо выходзіла з цвёрдым намерам: набыць. Дарэчы, дымчата-ружовы — адзін з маіх любімых колераў.

Але Наталля, зразумела, на адной сукенцы не спынілася: у дадатак да яе адразу ж спатрэбіліся новыя «шпількі», жакет і сумачка... Таму вельмі хутка яе гардэроб папоўніўся і гэтымі рэчамі.

— Цяжэй за ўсе было знайсці балеро, — узгадвае пра модны «праменад» Наталля. — І гэта нягледзячы на вялікую колькасць самых разнастайных крам у Мінску. Але, нарэшце, пашанцавала, і я набыла вельмі прыгожае балеро колеру слановай косці з цісненнем пад змяіную скуру. З сукенкай яно глядзіцца проста ідэальна! Дарэчы, балеро, як высветлілася, — ад айчыннага дызайнера і вытворцы: яго зрабілі на адным з прыватных прадпрыемстваў. А яшчэ я набыла сумачку — таксама светлую з «вужачым» малюнкам. Як-ніяк год змяі!

Мая другая суразмоўца — **філолаг па прафесіі і рамантык у душы Вікторыя ГАПЕЕНКА** — вырашыла парадаваць сябе абноўкай у краме «Колінз»: набыла кофтачку і доўгую спадніцу — усё ў «марской» тэматыцы.



— Яшчэ зімой ездзіла на мора і дасюль па ім сумую, — гаворыць Вікторыя, — а цяпер пра радасныя сонечна-салёныя дні мне нагадвае мой летні «паласаты» гарнітур.



А вось **жонка ўкраінскага бізнесмена, беларуска па паходжанні і па духу Святлана БАГДАНАВА** нават не здолела пералічыць усе свае абноўкі.

— Вельмі шмат абутку, амаль 20 сумак, сукенкі, кашулі, плашчы, — расказвае Святлана. — Я купляю усяго шмат і адразу, бо ў нас з дачкой адзін памер. Хто раней прачнуся, той і апрануўся. Імкнуся кожны год абнаўляць гардэроб. Старыя рэчы аддаю знаёмым. А наогул, у нашай сям'і ўсе любяць новыя рэчы. У мужа адзенне нават больш, чым у мяне. Як куды паедзем, дык заўсёды вымушаны купляць дадатковы чамадан, каб усё, што набылі, прывезці дадому.

❑❑❑

З абноўкамі вас, дзяўчаты! Няхай усе сукенкі, спадніцы і іншыя рэчы, якія вы ўпадабалі з першага погляду, дораць вам адчуванне непаўторнага свята кожны дзень на працягу ўсяго вясенне-летняга сезона!

**Гелена АВЕЛА.**



■ Святло ў акне

# ЖЫЦЦЁ НЕ СПЫНЯЕЦЦА

**Дом для састарэлых — апошні прытулак для пэўнай катэгорыі людзей. Але і тут можна, і нават трэба, менавіта жыць, а не дажываць. Так лічаць у Расцянскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў, што ў Чавускім раёне.**



## АСОБНАЯ ДЗЯРЖАВА

Расцянскі дом-інтэрнат нібыта схаваўся ад аўтатрасы за лесам. Ён знаходзіцца ў маляўнічым месцы, каля вадасховішча Рудзея. У невялікім пасёлку Прыазёрны жывуць супрацоўнікі дома-інтэрната. Хаця цяпер многія прыязджаюць з Магілёва, да якога адсюль менш за два дзясяткі кіламетраў.

Звонку інтэрнат — будынак у пяць паверхаў, з вялікай навакольнай тэрыторыяй. Сацыяльная ўстанова не ўяўляе сабой (насуперак сумным прадчуванням) нічога шэрага, гатычнага, жахлівага. Яна, хутчэй, больш падобная на сучасны санаторый.

А па сутнасці, гэта асобная маленькая дзяржава. Тут усё сваё: ад падсобнай гаспадаркі, крамы і цырульні да, прабачце, рытуальнага пакоя і могілак. Цяпер у Расцянскім доме-інтэрнаце жыве больш за 250 чалавек. Для іх жыццезабеспячэння працуюць 120 чалавек, у тым ліку і медыцынскі персанал.

— Увесь калектыў працуе на тое, каб стварыць тут умовы жыцця, набліжаныя да хатніх, — такім чынам вызначае агульную мэту дырэктар Сяргей Ярошчанка.

У інтэрнаце прасторныя калідоры з дывановымі дарожкамі і кветкамі, утульныя месцы для адпачынку, тэлевізары ў холах. Будынак узводзіўся па блочнай сістэме, з усімі выгодамі.

Кантынгент — старыя людзі і маладзейшыя з абмежаванымі магчымасцямі. Іх адразу шкадуеш: яны, можа, і жывуць дастаткова камфортна, але ўсё ж не дома, сярод родных. Між тым, ім самім вельмі хочацца кантактаваць з людзьмі. Яны ахвотна раскрываюць свае сэрцы і распавядаюць гасцям гісторыі жыцця, хвароб і... захапленняў.

— Я да жыхароў інтэрната стаўлюся як да родных бабуль і дзядуляў, і прашу таго ж ад усіх супрацоўнікаў, — кажа Сяргей Дзмітрыевіч. — Гэта не спагада, гэта наша праца.

## ЕЖА І ДУХОЎНАСЦЬ

Энергічны дырэктар Сяргей Дзмітрыевіч Ярошчанка мае дзве адукацыі і вопыт працы ў сацыяльнай сферы. Ён — чалавек, які павінен разбірацца ва ўсім і рабіць усё.

— Вось там, дзе вы бачыце банеры з каровамі і свіннямі — нашы хлявы, — праводзіць ён невялікую экскурсію. — Навокал — нашы палі: больш за сто гектараў, дзе пасеем збожжавыя, бульбу, гародніну. Вось камбайн «Дон» падарылі: на ім працуе наш механізатар. Падсобная гаспадарка дае нам прадукты і магчымасць зарабіць грошы.

Дырэктар таксама паказвае малады сад пладовых дрэў, ягаднік і вінаграднік, якія з'явіліся ў інтэрнаце дзякуючы дапамозе спонсараў.

— Мы шукаем, звяртаемся, пішам лісты, — расказвае Сяргей Дзмітрыевіч. — Просім калі не грошы, то матэрыялы. У мяне ёсць вялізны спіс арганізацый, якія нам дапамагаюць. Насамрэч, на свеце значна больш добрых спагадлівых людзей, чым нам здаецца.

Кіраўніцтва інтэрната мае ідэю, як самім зарабіць грошы: напрыклад, узяць у арэнду частку берага вадасховішча. Сюды прыязджаюць на адпачынак і рыбалку шмат людзей, у асноўным з Магілёва, таму пірс, альтанкі і мангалы будуць дарэчы для турыстаў. Аднак грошы — гэта яшчэ не ўсё.

— Матэрыяльны камфорт — якаснае харчаванне і чысты ложак — гэта важна для чалавека, тым больш хворага і старога, — лічыць Ярошчанка. — Але ўсё ж душэўны аптымізм падаецца мне галоўным. Каб людзі кантактавалі і мелі інтарэсы. Каб тут было жыццё — не «раслiннае», а нармальнае. Можна легчы і паміраць, а можна радавацца і жыць.

## ПЕСНІ АД СТАРАСЦІ

Ядзвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч — ганаровыя героі Расцянскага дома-інтэрната. Сёлета беларускія «зоркі» прыехалі да яго жыхароў з дабрачынным канцэртам, ды яшчэ і пакінулі ахвяраванне. Цяпер выявы любімых артыстаў упрыгожваюць бібліятэку і многія пакоі. Фота з памятным надпісам стаіць на ганаровым месцы ў Аксаны Астапавай. Гэтай жанчыне 34 гады, пасля хваробы ў дзяцінстве яна засталася без ног і перасоўваецца на калясцы.



«Хатняя» царква зроблена для душэўнага супакаення, што асабліва важна для старых і хворых людзей.

— Я, лічы, усё жыццё ў інтэрнатах, — проста гаворыць яна. — Тут жыву амаль 15 гадоў, і нічога, усё нармальна. Няма на што скардзіцца.

Пакой Аксаны запоўнены мяккімі цацкамі. Сваякі прыязджаюць і тэлефануюць. Нядаўна яна страціла сябра, з якім разам прайшла праз юнацкае інтэрнацкае жыццё. Ёй было вельмі цяжка пасля яго смерці, але падтрымка людзей пераканала: трэба жыць далей.

— Хацелася б, каб усё было інакш, але нічога не зробіш, — разважае яна спакойна. — Я навучылася сябе абслугоўваць сама, сваімі рукамі. Я не скарджуся — трэба жыць.

Новае захапленне Аксаны — фота. Пакуль яна фатаграфавала толькі «тэлефонам», але з дапамогай добрага апарата яна мяркуе адлюстроўваць мясцовыя цудоўныя пейзажы пад чулым кіраўніцтвам культарганізатара інтэрната Галіны Панкінай.

— Першы год працуючы тут, я часта плакала — так шкада мне было гэтых людзей, — узгадвае Галіна. — Прыходзіш раніцай на працу, а чалавека, з якім учора размаўляў, сёння ўжо няма. Я шмат думала і зразумела: трэба зрабіць так, каб яны траплялі сюды не дажываць, а жыць.

Мерапрыемствы ствараюць асаблівы настрой, жаданне жыць актыўна. Кожны месяц праводзіцца шашачны турнір. Выступае свой харавы калектыў. Наладжаны конкурсы рукадзелля і творчых работ. На вясну запланавана першая экскурсія да святых крыніц. Але самае галоўнае, лічыць Галіна, каб самі людзі хацелі нешта рабіць і жыць цікава.

## ПРЫГАЖОСЦЬ ВАКОЛ НАС

Аляксандра Аляксандраўна Краўцова, якой 70 гадоў, адначасова глядзіць тэлевізійныя навіны і вяжа панчохі.

— Аддам гатовыя таму, хто папросіць, — усміхаецца бабуля. — Мне няма чаго рабіць, але не люблю сядзець проста так.

Аляксандра Аляксандраўна расказала, што пасля перанесенага поліяміэліту рухаецца ў інвалідной калясцы. Але працавала швачкай ў атэлье: «Ногі не слухаліся, а вось рукі добра шылі». Яна дапамагала гадаваць пляменнікаў, а цяпер ужо не можа ўпраўляцца з гаспадаркай і абслугоўваць сябе, таму я перасялілася ў інтэрнат. Цяпер уся сценка яе пакоя запоўнена дыпломамі мясцовых конкурсаў «Умелыя рукі».

Расказваюць, што пакоі ў інтэрнаце, як і людзі, — вельмі розныя. За аднымі трэба прыбіраць ложкі, а іншыя самі робяць са свайго сціплага месца жыхарства ўтульны куток — было б толькі жаданне. Ад шыкоўнага віду лесу і возера за акном у пакоі Раісы Якаўлеўны Касцянковай адцягваюць увагу хатнія кветкі і прыгожыя вышыванкі. Больш за тое — яна сама прыбірае пакой, нягледзячы на інвалідную каляску. На каленках!

— Рухацца трэба, таму займаюся ўсім, чым толькі можна, — гаворыць жанчына. — Я жыву ў доме-інтэрнаце з яго адкрыцця, а грошы свае выдаткоўваю на ніткі і крэмы для рук. А парасткі розных хатніх кветак мне дораць усе супрацоўнікі.

У пакоі Анастасіі Парфенаўны Коршун шмат яркіх штучных кветак. Жанчына, якой ужо 80 гадоў, знайшла сабе карыснае хобі: яна робіць букеты з цэлафану, з непатрэбных пластыкавых пакетаў.

— Гэта проста, бо патрабуе цярплівасці і часу — але ж гэтага ў нас дастаткова, — гаворыць яна.



Жыццё ўпрыгожваюць кветкі, вышыванкі і кніжкі.

## У АДНО ІМГНЕННЕ...

Сталовую ў доме-інтэрнаце паказваюць як перамогу над непрывабным мінулым. Быў стары савецкі стыль — стаў сучасны пакой у пастэльных фарбах, клятчатыя абрусы і плеценыя плафоны свяцільняў. Выдаткаваныя дзяржавай грошы на рамонт дапоўнілі ўласнай ініцыятывай: каб зрабіць са старога новае, сталы пакрылі лакам, а для крэслаў пашылі чахлы.

Шэф-повар Ларыса Пухоўская паказвае, як гатуюць боршч і малочны суп на абед. На другое — макарона (усяго патрабуецца 13 кілаграмаў) з каўбасой, а на падвячорак будуць свежыя булачкі з апельсінавым сокам.

— У нас ёсць сутачныя нормы: па мясе, крупах, гародніне і гэтак далей, — расказвае шэф-повар. — Але мы ўлічваем і жаданні: нашы жыхары любяць дранікі, калдуны, бабку, беляшы і піражкі.

Ларыса Пухоўская не лічыць дом-інтэрнат канечным прыпынкам жыцця: многія жывуць тут (па розных прычынах) дзесяцігоддзі, знаходзяць сяброў, якія становяцца бліжэй за сваякоў, і нават жэняцца.

— Старасць — не лепшы перыяд, і спачуваю тым, хто не можа правесці яе ў родных сценах. Але і тут дзякуючы дзяржаве можна пражыць дастойна, — гаворыць жанчына. — Калі чалавек ставіцца з павагай да людзей, якія побач, і да нас, персаналу. Тут усе людзі добрыя. Проста пашанцавала ім менш.

— Прадугледзець, як скончыцца жыццё, немагчыма, — падхапіў Сяргей Ярошчанка. — Мяне ўразіла гісторыя адной жанчыны, якая трапіла да нас. Некалі была шчаслівая сям'я, пакуль бацькі, дзеці і ўнук не паехалі адпачываць, — усе загінулі ў аўтааварыі. А яна засталася адна. Вось так, у адно імгненне...

## ЗАЎСЁДЫ ВЯСЁЛЫЯ

На другім паверсе чуецца песня. Не падобна на тэлевізар ці радыё. Аказалася, «жывы гук». Людзі сабраліся ў пакоі для адпачынку: мужчыны гуляюць у шашкі пад акампанемент жаночых спеваў. Рэпертуар вясковы: хіт «Гуляю я!» — пра маладую і прыгожую, якой на працу ісці «ляніва».

— Ой, мы заўсёды вясёлыя! — смяюцца бабулі. — Паміраць, дык з музыкай.

У фотаздымках на сценках адлюстравана інтэрнацкая дзейнасць: на восеньскае прыбіранне навакольнага лесу выехалі нават калясачнікі. У пакоі стаіць скрыня для мясцовых «СМС»: сюды можна апускаць віншаванні і прывітанні сябрам.

Але самая вялікая славутасць — гэта нядаўна адкрытая «хатняя» праваслаўная царква, асвечаная ў гонар Сергія Раданежскага. Кіраўніцтва гаворыць, што яе зрабілі дзеля душэўнага спакою людзей. Святары прыязджаюць, каб весці службы і гутаркі. Вернікі маюць магчымасць паставіць свечкі і памаліцца.

— Просім здароўя, — шчыра сказала Святлана Гаўрылаўна Тарасава. — Мы тут усе адзінокія і бяссільныя, і нас даглядаюць.

— Ніякія мы не бяссільныя, — тут жа аспрэчвае Вера Ціханаўна Буйноўская. — Дзякуй Богу, тут жыць можна. Столькі на свеце людзей абяздоленых, а ў нас усё нармальна.

Жыццёваму аптымізму Веры Ціханаўны можа пазайздросціць любы чалавек. Яна не бачыць, перасоўваецца з дапамогай сяброўак альбо трымаючыся рукамі за сценку, але ўсюды — першая, актыўная ўдзельніца. Яна расказвае, як пасля вайны засталася без маці і яе з Нальчыка прывёз на сваю радзіму ў Беларусь муж.

## КНІЖНЫ ЗБОР

Гэта ўсё зусім не азначае, што ў доме-інтэрнаце цалкам пануе ідылія. Як і ў любым месцы, дзе разам жыве шмат людзей, тут узнікае шмат праблем. Напрыклад, з аматарамі выпіць, якія актывізуюцца ў дні атрымання грошай. Паводле правілаў, большую частку сваіх пенсій жыхары аддаюць за ўтрыманне, ім застаецца толькі 10% ад выплаты. Кожны выкарыстоўвае іх па-свойму: на папаўненне рахункаў мабільных тэлефонаў, на лекі і цукеркі, а таксама на часопісы і кнігі.

Дарэчы, Расцянскі дом-інтэрнат аб'явіў акцыю. У каго ёсць што лішняе з хатніх альбо ведамасных бібліятэк — тут з удзячнасцю прымуць у падарунак кнігі. Таму што бібліятэка карыстаецца вялікай папулярнасцю. Ужо цяпер кніжны збор папоўніўся больш чым на дзве сотні асобнікаў, але акцыя не заканчваецца.

— Я сёння выбрала гістарычны дэтэктыў, — каля кніжных шаф ходзіць Алена Андрэеўна Дзямянкова, заўзятая аматарка чытання. — Я люблю чытаць пра цароў, імператараў. Мы тут усе любім кнігі пра вайну, крымінальныя гісторыі і раманы пра каханне.

— Мне падаецца, што трэба даўно памяняць сваё стаўленне да дома для састарэлых і інвалідаў, — лічыць дырэктар Расцянскага дома-інтэрната. — Тут жывуць людзі, і большасць з іх неабыякава ставіцца да таго, што навокал. Можна жыць нармальна на схіле гадоў. Дзяржава надае такім людзям увагу. Яны жывуць, сябруюць, кахаюць нягледзячы на ўзрост. Нядаўна па дазвол уступіць у шлюб звярнулася пара пенсіянераў.

Што гэта, калі не сапраўднае жыццё?

**Ілона ІВАНОВА.**

*Чавускі раён.*

**Фота аўтара**

■

# ПРАГРАМА «ГАЗПРАМ — ДЗЕЦЯМ» У БЕЛАРУСІ

**Аляксей Мілер, старшыня праўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Газпрам»,** падчас знаходжання ў Віцебску, дзе ў гэтыя дні ўпершыню праходзіць «газпрамаўскі» карпаратыўны фестываль «Факел», на сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ падзяліўся планамі аб рэалізацыі ў Беларусі праграмы «Газпрам — дзецям», а таксама праекта «Ямал—Еўропа-2». Яшчэ ён заявіў, што горад можа стаць месцам пастаяннага правядзення «Факела».

Віцебск яшчэ не прымае чарговы «базар», але ў гэтыя дні такое адчуванне, што вышэйназваны фестываль ужо праводзіцца. Працуюць «Гарады майстроў», гандлёвыя падворкі. У Летнім амфітэатры і канцэртнай зале «Віцебск» з раніцы да ночы праходзяць рэпетыцыі і канцэрты, а ў атэлях няма свабодных месцаў. А ўсё таму, што 14 мая ў Віцебску стартаваў заключны тур V карпаратыўнага фестывалю «Факел» таварыства «Газпрам». Беларусь упершыню прымае ўдзельнікаў і гасцей фестывалю. І тое, што ў ім бяруць удзел прадстаўнікі Кітая, Аўстрыі, Францыі, Славеніі — пацвярджэнне таго, што гэты фэст — міжнароднага ўзроўню.

На мерапрыемства з'ехаліся больш за 1300 удзельнікаў з 36 даччыных таварыстваў «Газпрама» з усіх куткоў Расіі і Беларусі. Яны змагаюцца за права быць лепшымі ў трох узроставых групах (ад 5 да 10 гадоў, ад 11 да 16 гадоў, ад 17 гадоў і старэй) у шэрагу конкурсных намінацый: «Фальклор», «Вакал» (народны, эстрадны, класічны, джазавы)», «Харэаграфія» (народная, эстрадная, бальная, класічная), «Вакальна-інструментальныя і інструментальныя ансамблі», «Эстрадна-цыркавы і арыгінальны жанр». Беларусь на фестывалі прадстаўляе дэлегацыя даччынай кампаніі таварыства — ААТ «Газпрам трансгаз Беларусь». У склад журы заключнага тура V карпаратыўнага фестывалю ўваходзяць вядомыя дзеячы мастацтва і культуры Расіі і Беларусі. Старшыня журы — народны артыст Расіі, акадэмік Акадэміі Расійскага тэлебачання Святаслаў Бэлза.

У прэс-канферэнцыі разам з іншымі афіцыйнымі асобамі таксама браў удзел **Уладзімір Сямашка, першы намеснік кіраўніка беларускага ўрада.** Паводле яго слоў, Віцебск — культурная сталіца фестываляў, дзе штогод праводзіцца «Славянскі базар», — з'яўляецца ідэальным месцам для правядзення мерапрыемстваў такога ўзроўню.

— І трэба выкарыстоўваць інфраструктуру, якая створана ў горадзе, — адзначыў першы намеснік прэм'ер-міністра. — Каля 15 мільёнаў долараў было ўкладзена ў падрыхтоўку да фэсту.

Як удакладніў **Уладзімір Цярэнцьеў, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама,** дзякуючы «Газпраму» літаральна за некалькі тыдняў правялі капітальную мадэрнізацыю атэля «Дзвіна». Адметна тое, што «Факел» праводзіцца ў асаблівы год для Віцебска: 25 гадоў таму расчыніў свае дзверы знакаміты Летні амфітэатр, гісторыя якога пачынаецца з фестывалю савецка-польскай песні. Віцебск у гады СССР быў пабрацімам Зялёнай Гуры, дзе праходзіў вышэйназваны фэст. А летась споўнілася 25 гадоў фестывалю сучаснай харэаграфіі — аднаму з буйнейшых у Еўропе. Праводзіцца і фестываль камернай музыкі імя І.І. Салярцінскага...

Падчас падрыхтоўкі да правядзенню фэсту «Факел» прадстаўнікамі «Газпрама» былі прад'яўлены вельмі высокія патрабаванні. Гэта датычылася і аб'ектаў пражывання, харчавання, правядзення рэпетыцый і канцэртаў.

Акрамя таго, у Віцебску зараз праходзяць канцэрты з удзелам «зорак», лазерныя шоу, пленэр з удзелам мастакоў. І што цікава, уваход на гэтыя мерапрыемствы бясплатны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Урок для дарослых

# БЕЗ ДОБРАГА БАЦЬКІ НЯМА ВЫХАВАННЯ

**У Маладзечне прайшоў абласны бацькоўскі сход «Без добрых бацькоў няма сапраўднага выхавання». Традыцыя праводзіць такія мерапрыемствы з'явілася шэсць гадоў таму. І кожны раз іх тэматыка розная. Павестка сёлетняга форуму выбрана невыпадкова. «Прааналізаваўшы вынікі папярэдняга сходу, мы прыйшлі да высновы, што ў нас не цалкам задзейнічаны патэнцыял бацькі, — адзначыла начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіна Казак. — Таму і вырашылі прыцягнуць увагу грамадскасці да ролі мужчыны ў выхаванні маладога пакалення. Гэта жыццёва неабходна».**

## БЫЦЬ ЯК ТАТА

Сапраўды, кожнае пятае дзіця на Міншчыне жыве ў няпоўнай сям'і, як правіла, з маці. 653 таты з 33 тысяч няпоўных сем'яў узялі на сябе адказнасць за выхаванне дзяцей, а 728 біялагічных бацькоў пражываюць з маці сваіх дзяцей і пры гэтым не рэгіструюць свае адносіны. У сучаснай школе таксама не хапае мужчынскага ўплыву. У сістэме адукацыі вобласці, як у цэлым па краіне, невысокая колькасць мужчын-педагогаў — усяго 18 працэнтаў.

Вядомы расійскі гісторык і пісьменнік Мікалай Карамзін калісьці сказаў: «Без добрых бацькоў няма добрага выхавання, нягледзячы на ўсе школы». Роля бацькі ў сучаснай сям'і сапраўды незаменная, а выхаваўчы ўплыў на дзяцей замяніць чымсьці іншым практычна немагчыма. Менавіта бацька вучыць сына быць сапраўдным мужчынам, а для дачкі сам служыць прыкладам мужчыны. Нашы дзеці падобныя на нас не толькі знешне. Яны капіруюць нашы звычкі, паводзіны, маральныя якасці, якія паўплываюць у будучым і на іх сямейны ўклад.

Бацька сям'і Корсік — Васіль Пятровіч — выдатнік прафтэхадукацыі, узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені, удастоены ганаровага звання «Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь». Яго сын Юрый узначальвае ліцэй і таксама выхоўвае сыноў па прынцыпе: «Бацька — гэта прыклад, з яго дзеці «малююць» сябе». Юрый Сёмкін з Чэрвеньскага раёна адзін выхоўвае пяцярых дзяцей. А яны кажуць, што хочуць быць падобнымі да свайго бацькі. І такіх прыкладаў шмат. Усяго ж у сёлетнім сходзе — непасрэдна ў Доме культуры Маладзечна — прынялі ўдзел 800 татаў, яшчэ тысяча прыйшлі ў відэастудыі, якія працавалі ў іншых райцэнтрах вобласці.

## РЭЦЭПТ АД СПАКУС

Удзельнікі сходу канстатавалі: клопат сучасных бацькоў часта зводзіцца да матэрыяльнага забеспячэння сям'і, а дзеці, між тым, прадастаўлены самі сабе.

Застаючыся без увагі і нагляду дарослых, яны самі рана становяцца «дарослымі». У Мінскай вобласці толькі ў першым квартале на рахунку падлеткаў 89 злачынстваў, больш паловы з іх — крадзяжы.

— Неабходна пастаянна шукаць спосабы, як адцягнуць увагу дзяцей ад дурных спакус. Адзін з найбольш эфектыўных — арганізацыя для падлеткаў спецыяльных лагераў — ваенна-патрыятычных, а таксама працы і адпачынку, дзе, акрамя ўсяго іншага, дзеці змогуць зарабіць добрыя грошы», — нагадаў губернатар Барыс Батура.

Сёлета на Міншчыне такіх лагераў будзе 134 для больш чым 2 тысяч падлеткаў 14-18 гадоў. Школьнікі не толькі папрацуюць на ўборцы ўраджаю, але і зоймуцца азеляненнем населеных пунктаў, дапамогуць лясгасам. Цікавую работу прапанавалі дзецям у Капыльскім раёне: вязаць венікі і пры гэтым атрымліваць нядрэнны заробак. Падлеткі, занятыя працай, не пойдуць красці, бадзяцца невядома дзе. На гэта ім проста не хопіць часу.

— Галоўнае, каб у арганізацыі такога кшталту лагераў улада, педагогі і бацькі выступілі разам, выпрацавалі сумесныя падыходы, вызначылі, як зацікавіць дзяцей. На жаль, у гэтым бацькам і настаўнікам не хапае ўзгодненасці», — лічыць кіраўнік цэнтральнага рэгіёна.

## ГРАМАДСТВУ — СЯМЕЙНЫ ЎКЛАД

У вобласці рэалізуюцца праекты, каб накіраваць ініцыятыву і актыўнасць падрастаючага пакалення ў патрэбнае рэчышча. Напрыклад, у школах актыўна ствараюцца бізнес-кампаніі. Год таму іх было толькі 4, а сёння налічваецца ўжо 60. Паўтысячы дзяцей вучацца асновам прадпрымальніцтва, апрабоўваюць свае ідэі на практыцы. І ў многіх гэта нядрэнна атрымліваецца. З пачатку года дзеці зарабілі звыш 17 млн рублёў. Сярод падлеткаў пастаянна арганізоўваюцца конкурсы інавацыйных праектаў. З кожным годам іх становіцца ўсё больш, а многія з ідэй знаходзяць практычнае прымяненне. Напрыклад, школьнік з Дзяржынска Дзмітрый Карніцкі распрацаваў інтэрактыўны анімацыйны дапаможнік для навучання малых паводзінам на дарогах, і яго праца зацікавіла ДАІ. Дзесяцікласнік Цімафей Малахоўскі з Салігорска прыдумаў псеўдасплаў з алюмінію і шкла. У выніку эксперыменту атрымаўся нержавеючы матэрыял, які можна выкарыстоўваць у розных сферах народнай гаспадаркі, у тым ліку ў самалётабудаванні і электроніцы. На нядаўнім рэспубліканскім конкурсе ён змог абараніць сваю работу на рускай і англійскай мовах, і будзе прадстаўляць яе на міжнародным конкурсе ў ЗША.

Шмат дзіцячых распрацовак звязана з камп'ютарнымі праграмамі, інфармацыйнымі сістэмамі, што таксама не можа не радаваць. Арганізацыя бізнес-класаў, гурткоў юных інжынераў, канструктараў, майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, конкурсы інавацыйных праектаў — надзвычай важныя рэчы. Але ніякая адукацыйная сістэма не здольная стварыць гарманічную асобу без падтрымкі сям'і. Менавіта там закладваецца паняцце аб сумленні, міласэрнасці, узаемадапамозе, павазе да старэйшых, любові да Радзімы. Вось чаму нельга пераацаніць ролю паўнацэннай прыстойнай сям'і, а ў самой сям'і — ролю бацькі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ЭСТОНСКАЯ ВІЗА — У КОНСУЛЬСТВЕ ЛАТВІІ

**У консульстве Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску пачалі прыём дакументаў грамадзян Беларусі для атрымання шэнгенскай візы Эстонскай Рэспублікі.**

— Пачынаючы з 15 мая, консульства Латвіі ў Віцебску прадстаўляе Эстонскую Рэспубліку ў справе выдачы кароткатэрміновых шэнгенскіх віз, калі Эстонія з'яўляецца асноўнай мэтай візіту. Консульства Латвіі прымае дакументы для візы ў Эстонію ў такім жа парадку, як і для візы ў Латвію. Прыём дакументаў ажыццяўляецца штодня з панядзелка па чацвер з 9.00 да 12.00 гадзін. Ахвотным падаць дакументы на эстонскую візу няма неабходнасці загадзя рэгістравацца, дакументы прымаюцца ў парадку чаргі. Дакументы апрацоўваюцца на працягу аднаго тыдня (5 рабочых дзён). Падаюцца яны на рускай і англійскай мовах. Пры падачы дакументаў неабходна заплаціць дзяржаўную пошліну ў памеры 60 еўра.

Шэнгенская візавая анкета Латвійскай Рэспублікі размешчана на сайце консульства: http://www.mfa.gov.lv/by/belarus/konsulate/.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ШЛЯХ ТРЭБА ЯШЧЭ ПРАТАПТАЦЬ

Міжнародны фестываль асаблівых тэатраў «Непратаптаны шлях» прайшоў у сярэдзіне мая ў Брэсце. Асаблівасць тэатраў вызначаецца перш за ўсё складам артыстаў. Усе яны людзі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Затое творчыя здольнасці і адданасць любімай справе не маюць межаў. Таму спектаклі мелі поспех, іх вельмі прыязна сустрэла публіка.

Сёлета адбыўся дзявяты фэст «Непратаптанага шляху». Яго арганізатары — моладзевае грамадскае аб'яднанне «Інвалід і асяродак», аблвыканкам і гарвыканкам. Форуму адвялі лепшыя падмосткі горада. Артысты з Беларусі, Украіны, Расіі, Польшчы выступалі на сцэне Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы.

Для кіраўнікоў і рэжысёраў тэатраў у рамках фестывалю былі наладжаны майстар-класы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ВІЦЕБСК СТАНЕ... ПАРЫЖАМ

**Эпіцэнтрам правядзення 18 мая акцыі «Ноч музеяў — 2013» стане віцебскі мастацкі музей.**

— На пляцоўцы перад уваходам у музей малады мастак у вобразе М. Шагала на мальберце будзе маляваць Парыж, духавы аркестр выканае вальс «Пад небам Парыжа», на вестыбюлі 1-га паверха пад акампанемент акардэона і саксафона можна будзе ўбачыць выставу макетаў Эйфелевай вежы, — паведамілі ў музеі. — Гледачы таксама ўбачаць тэатральныя пастаноўкі «Французскія эцюды», пры жаданні возьмуць удзел у танцавальных паўзах пад музыку французскага шансона 1930-х гадоў «Французскія шарм». Таксама адбудзецца акцыя «Малюем Парыж» з удзелам выхаванцаў дзіцячай студыі «Цюбікі».

У ліку іншага публіцы будзе паказана тэатральная пастаноўка «Paris», прадстаўлена імправізаваная выстава на пляцоўцы арт-кафэ «Малюнак на сурвэтцы», экспазіцыя фетравых капялюшыкаў і гэтак далей.

Аб адзінаццатай гадзіне ночы адбудзецца «AGNI SHOW» — прэзентацыя праграмы шоу агню пад музычнае суправаджэнне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПРЫЙШОЎ І ВЫРАТАВАЎ

**Сям'я з пяці чалавек, у тым ліку чатырохгадовая дзяўчынка, засталіся ў жывых дзякуючы суседцы і старшаму лейтэнанту ўнутранай службы Дзмітрыю Нахілаву, паведамляе прэс-сакратар Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Наталля Жывалеўская.**

Начны сігнал аб пажары ў пяціпавярховіку па вуліцы Суворава ў Гродне служба 101 прыняла ад жанчыны, якая жыве ў гэтым доме. Яна адчула пах гару ў сваёй кватэры, моцна задымленым аказаўся пакой, дзе спаў яе паўтарагадовы сын. Думаючы, што ўзгаранне адбылося ў кватэры паверхам ніжэй (там пражывае сям'я, якая знаходзіцца на ўліку сацыяльна небяспечных), жанчына патэлефанавала ў МНС. Акрамя таго, ведаючы, што ў сяброўкі з суседняга пад'езда муж працуе выратавальнікам, паведаміла і яму.

Работнік цэнтра аператыўнага кіравання Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Дзмітрый Нахілаў накіраваўся на месца здарэння. Падняўся на чацвёрты паверх, стаў стукаць у дзверы — жыльцы не рэагавалі. Але выйсце было знойдзена: частка драўлянага палатна пад націскам трэснула, Дзмітрый прасунуў руку ў адтуліну і адчыніў замок. У кватэры ўжо стаяла моцная заслона дыму, а ачагом узгарання аказалася крэсла-ложак, дзе спала 42-гадовая гаспадыня. Менавіта яе курэнне стала прычынай пажару і магло скончыцца трагедыяй, калі б не пільнасць суседкі і аператыўныя дзеянні Дзмітрыя Нахілава. У суседнім пакоі ён выявіў дзяўчынку, якая спала, і вынес яе на лесвічную пляцоўку. Дарослыя пакінулі кватэру самастойна. У гэты час прыбылі падраздзяленні МНС і ліквідавалі ўзгаранне. Пашкоджаны сцены, столь, маёмасць кватэры, аднак медыцынская дапамога нікому не спатрэбілася.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## КІНУЛА ЗАПАЛКУ НА ДЫВАН...

**У Баранавічах з-за кінутай на падлогу запалкі пенсіянерка атрымала сур'ёзныя апёкі.**

— Ранкам паступіла паведамленне пра задымленне на чацвёртым паверсе пяціпавярховага жылога дома па вуліцы Касманаўтаў. Загаранне ў кватэры ліквідавалі самі жыхары яшчэ да прыбыцця пажарных-выратавальнікаў, — паведаміла «Звяздзе» старшы інспектар цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Наталля Скрабец. — Гаспадыня жылля, пенсіянерка 1939 года нараджэння, была шпіталізавана ў рэанімацыйнае аддзяленне Баранавіцкай гарадской бальніцы №1 з папярэднім дыягназам «атручэнне прадуктамі гарэння, апёк верхніх дыхальных шляхоў, апёк паверхні цела» (прыкладна 60 працэнтаў цела). Як мяркуецца, прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём з боку гаспадыні (кінутая на дыван запаленая запалка).

## БЯДА АД СВЕЧКІ

**У 8.30 здарыўся пажар у жылым доме па вуліцы Гарбачова ў Чэрвені: 68-гадовая гаспадыня ў гонар праваслаўнага свята — Вербнай нядзелі — паставіла свечку каля абразоў. І не задумалася, што гэта можа прывесці да трагедыі...**

— Пакінутая без нагляду свечка перакулілася. Агонь перакінуўся на фіранкі. Жанчына спрабавала сама патушыць полымя, але, не справіўшыся з ім самастойна, была вымушана звярнуцца па дапамогу да суседзяў, — паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — У выніку пажару ў чатырохкватэрным доме быў знішчаны дах на плошчы 60 квадратных метраў, сама кватэра цалкам выгарала. Гаспадыня не пацярпела.

Напярэдадні царкоўных свят выратавальнікі нагадваюць: будзьце ўважлівымі і захоўвайце правілы пажарнай бяспекі, не пакідайце без нагляду запаленыя свечкі! Агонь не даруе памылак!

## СУПРАЦЬ БРАКАНЬЕРА — ГАЗАВЫ БАЛОНЧЫК

**Паблізу вёскі Кустовічы Кобрынскага раёна работнікі Брэсцкай міжрайінспекцыі затрымалі мясцовага жыхара, які ў перыяд забароны на вылаў усіх відаў рыбы рыбачыў пры дапамозе стаўной сеткі і дзвюх сеткавых пастак. Пры затрыманні парушальнік не падпарадкаваўся, спрабаваў уцячы. Дзяржінспектары вымушаны былі выкарыстаць спецсродак — газавы балончык.**

Забароненыя прылады лоўлі і 14 кілаграмаў рыбы канфіскаваны. Кобрынскі РАУС вырашае пытанне крымінальнай адказнасці браканьера за незаконную здабычу рыбы, якая пацягнула нанясенне шкоды навакольнаму асяроддзю ў асабліва буйным памеры — на 24,7 мільёна рублёў (247 базавых велічынь). Таксама ў дачыненні да затрыманага складзены адміністрацыйны пратакол за непадпарадкаванне законнаму патрабаванню службовай асобы пры выкананні ёй службовых паўнамоцтваў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 18 (188)

■ Культурная беражлівасць

# МОДА НА ПЕСНІ



Вось як жа проста адно слова можа стаць модным… А яшчэ ж як натхніць. Аляксандр Ціхановіч і Ядвіга Паплаўская вырашылі арганізаваць акцыю «Родныя песні зберажэм!» З гэтай акцыяй праехаць па Беларусі, выконваючы самыя папулярныя песні, якія даўно гучаць, але людзі іх вельмі любяць, а таксама і новыя песні, якія, можа, і не шмат чулі, але могуць упадабаць і палюбіць. У праграму ўвайшлі самыя лепшыя песні народных артыстаў Беларусі Аляксандра Ціхановіча і Ядвігі Паплаўскай і маладых спевакоў, якія працуюць пад патранатам іх прадзюсарскага цэнтра і супрацоўнічаюць з ім: Анастасіі Ціхановіч, Івана Буслая, Мікіты Фаміных. Да акцыі далучыліся некаторыя артысты прадзюсарскага цэнтра «Спамаш». Вось ад іх якраз-такі варта чакаць не проста перапевак былых шлягераў, а новых песенных твораў.

Акцыя разлічана на год. Стартавала яна ў красавіку з горада Полацка, старажытнай сталіцы, якая прыняла артыстаў вельмі цёпла. Нягледзячы на тое, што квіткі каштавалі грошай, зала была поўная, слухачы прыходзілі сем'ямі, з дзецьмі. А напрыканцы канцэрта людзі падыходзілі і пыталіся: «Калі вы яшчэ прыедзеце?» Далей акцыя «паедзе» па ўсіх гарадах Беларусі: буйных гарадах, маленькіх, нават аграгарадках. Вось так, аб'ехаўшы Беларусь, у выніку і да сталіцы дабяруцца, і гэты момант будзе адзначаны вялікім гала-канцэртам. Міністэрства культуры з задавальненнем падтрымала такую акцыю, якую арганізуюць самі артысты, не патрабуючы на яе сродкаў з бюджэту.

Мэта — паказаць, што Беларусь славіцца не толькі МАЗамі, але мае вялікі скарб з прыгожых песень. Вядомыя і пазнавальныя — пастараліся паказаць у новых аранжыроўках, з цікавай падачай. Уся праграма цягнецца 3 гадзіны, ідзе з жывым гукам. Але што цікава: у кожным горадзе могуць далучыцца мясцовыя выканаўцы, якія хочуць трапіць на сцэну разам з «зоркамі», атрымаць нейкія парады ад іх. А найбольш таленавітыя могуць атрымаць свой шанц, калі іх творчасць «зачэпіць». «Зорныя» імёны, вядома, прыцягваюць, але ж народныя артысты Беларусі, пачынаючы серыю гэтых канцэртаў, свядома робяць стаўку на моладзь, выпускнікоў беларускага варыянту «Фабрыкі зорак» — «Зорнага дыліжанса». Гэта нават цікавей — іх прачытанне песень, тое, як моладзь адчувае былыя хіты і наколькі гатова спяваць творы Ханка ці Мулявіна.

Але дзеля чаго патрэбныя такія акцыі? У тым ліку дзеля таго, каб у рэпертуары маладых артыстаў з'яўлялася больш песень на беларускай мове, якія людзі гатовы слухаць, што адчувалася пасля першых канцэртаў. І што яшчэ больш важна — гэта з'яўленне новых песень на беларускай мове. Напрыклад, запісаў песню «Я захлынаюся» на беларускай мове Іван Буслай (аўтары — Я. Алейнік і Ю. Быкава). Сёння моладзь больш прагматычная і імкнецца адразу запісваць 2 варыянты адной і той жа песні — на беларускай і рускай мовах. Так зрабіў пераможца «Зорнага дыліжанса» Мікіта Фаміных. Яго песня «Каханне — небяспечная гульня» ёсць у дзвюх версіях. А часам бывае і так: песня ў канцэрце пачынае выконвацца па-руску, а праз куплет артыст пераходзіць на беларускую мову. Слухачы станоўча рэагуюць і на такі падыход. Самае важнае — на родную мову рэагуюць! І яшчэ беларускай публіцы падабаюцца рэміксы. Хто падумаў бы, што рэмікс песні «Чарка на пасашок», якую падчас канцэртаў акцыі выконваюць Ціхановіч і Паплаўская, будуць успрымаць як танцавальны хіт?! Гэтак жа і ўспрымаюць — устаюць з месцаў і танцуюць. Высновa: песні розныя патрэбны, але родныя павінны гучаць лепш і цікавей. Яны могуць станавіцца папулярнымі, і нават можна стварыць моду на беларускія песні. Калі не выконваць іх фармальна. І тады няхай будуць акцыі.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Асобы

# ДЗЕД МАЎР



У маім дзяцінстве пра яго казалі менавіта так. Ён быў ужо сталы, масціты, сівы, мудры чалавек. Але добры — як родны дзядуля, што жыў на Палессі. Аднойчы мая мама затрымалася з працы, а калі прыйшла, то са стосам кніжак: стаяла ў кнігарні ў чарзе. Сярод новых кніг, што яна прынесла, была кніжка Маўра «Палескія рабінзоны». У нас у двары была даволі вялікая кампанія дзяцей-аднагодкаў. Таму кнігі прачытваліся і перадаваліся з рук у рукі. А потым станавіліся глебай для гульні. Прачытаўшы, мы вырашылі прымераць на сябе гэтую ролю — рабінзонаў, якія любяць вандраваць і пазнаваць. І хто ведае, можа, я і дагэтуль гуляю ў яе — упэўнена, што няма на свеце нічога больш загадкавага, чым мая радзіма...

Гэта адкрыў многім дзецям «Чараўнік з краіны маленства», як сёння называюць Янку Маўра. Яго імя гучыць часта — сёлета 130-годдзе пісьменніка, які фактычна стаў пачынальнікам беларускай дзіцячай літаратуры. Ён аўтар прыгодніцкіх твораў «Чалавек ідзе», «У краіне райскай птушкі», «Амок», «Сын вады», «Палескія рабінзоны», «ТВТ», «Шлях з цемры» і іншых. У нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прадстаўлена выстава «Янка Маўр. Рамантык. Падарожнік. Педагог» з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Рукапісы, машынапісы, асабістыя рэчы, кнігі з дароўнымі надпісамі...

І калі б была магчымасць прадставіць асабістыя рэчы больш поўна, то адной з іх магла б быць скрыпка Янкі Маўра, на якой ён іграў! Цяпер інструмент захоўваецца ў Музеі Якуба Коласа. Гэта не выпадкова. Колас і Маўр былі сябрамі. У трылогіі Коласа «На ростанях» ёсць персанаж-настаўнік, прататыпам якога з'яўляецца Янка Маўр. Пісьменнікі нават парадніліся, і ў іх агульныя ўнукі і праўнукі.

**Зяць Янкі Маўра, сын Якуба Коласа Міхась МІЦКЕВІЧ:**

— Спадзяюся, выйдзе кніга пра Янку Маўра. Матэрыялы да яе я падрыхтаваў. Гэты чалавек варты асобнай кнігі ўспамінаў. Насамрэч Янка Маўр павінен быў быць па прозвішчы Ільін. Яго бацька салдатам вярнуўся з Крымскай вайны, і калі перапісвалі прозвішчы, то Міхаіла Фёдаравіча запісалі Фёдаравым. Так і застаўся Фёдаравым, як і яго нашчадкі... Янка Маўр быў вельмі цікавым чалавекам. Я лічу, што з твораў, якія павінны вывучацца ў школе, — гэта найперш «ТВТ» і «Шлях з цемры». Там падаецца неабходнасць моладзі займацца справамі, якія вакол іх адбываюцца. Прывучыць іх да работы. Гэта асабліва важна для гарадскіх дзяцей, якія іншым разам не ўмеюць цвік забіць у сценку. Гэтым творам Янка Маўр апярэдзіў Гайдара гадоў на 7. І вельмі перажываў, што яго кнізе не надавалі такой увагі, як кнізе Гайдара. З твора «Шлях з цемры» вынікае самае важнае для моладзі. У гэтым творы паказана, як у рамесным вучылішчы сабраліся маладыя хлопцы, аднадумцы, як яны стараліся знайсці і кнігу цікавую, і прэйскуранты, як яны рассылалі іх. І галоўнае, што яны абмяркоўвалі ўсе праблемы самі. І гэта вельмі важна — усебаковае абмеркаванне любога жыццёвага пытання. Гэтая думка ў Янкі Маўра праходзіць у кнізе. Ён жа і дзяцей сваіх выхоўваў у плане, каб даць ім магчымасці развівацца як мага больш. Сам жа збіраў бібліятэку. Яго бібліятэка была адна з лепшых у Мінску ў даваенныя часы. Яшчэ прыклад адказнага бацькоўскага выхавання: дачка Маўра збірала маркі. А ён казаў: «Калі ты марку атрымала, то павінна ведаць, дзе гэтая краіна знаходзіцца, хто там жыве, які там клімат, што за прырода»... Па маёй просьбе яго меншая дачка напісала ўспаміны аб сваёй сям'і. Яна многа расказвала цікавага.

**Дзякуючы сучасным тэхналогіям ёсць магчымасць убачыць і прачытаць поўныя тэксты твораў пісьменніка**

І асабліва тое, як Янка Маўр настойліва патрабаваў, каб дзеці чыталі. Кніга — адна з найбольш важных крыніц, якія наталяюць нашы веды. Дзякуючы гэтаму чытач адчувае сябе героем ці гераіняю, праходзіць праз гэтую кнігу сам, думае, як бы ён паводзіў сябе ў пэўных абставінах. Янка Маўр лічыў, што дзіця, якое шмат чытае, нават калі не падрыхтуецца да ўрока, то ўсё адно адкажа больш-менш прыстойна за кошт агульнага развіцця. Сям'я ў пісьменніка была вялікая. Старэйшы сын Фёдар быў названы ў гонар дзеда. Разумны быў хлопец. Але перастаў вучыцца. Сабраўся з кампаніяй, праводзіў увесь час у двары. Аднойчы бацька сабраў сумачку, яго рэчы: «Не хочаш вучыцца — ідзі да сваіх сяброў, займайся чым хочаш. А калі адумаешся, прыйдзеш і будзеш вучыцца — я цябе прыму». Выйшаў Фёдар. Пастаяў, падумаў, куды падзецца. Вярнуўся і сказаў: «Тата, я буду вучыцца». І вучыўся, скончыў школу выдатна, універсітэт, абараніў кандыдацкую, доктарскую, стаў акадэмікам...

Пісьменнік любіў дзяцей і тонка адчуваў іх псіхалогію. Прывучыў сваіх дзяцей любіць сапраўдную музыку. А на ганарары часта вазіў іх у вандроўкі па розных мясцінах, каб раслі цікаўнымі і развітымі. Але мог сам іх зацікавіць менавіта таму, што быў цікаўны па сваёй прыродзе. Чым жа ён толькі не цікавіўся! Кажуць, нават спірытызмам — хацеў з духамі вядомых людзей кантактаваць. Любіў і жарты, і розыгрышы. Напрыклад, напісаў маленькае апавяданне пра рудога хлопчыка і наўмысна зрабіў 6 памылак. І пайшоў у рэдакцыю. Давай пачытаць — але ўсе знаходзілі адну-дзве памылкі. А мастак Валянцін Ціхановіч убачыў усе 6 памылак, якія не заўважылі тыя, што працавалі са словам. Гумар праходзіць скрозь усю яго творчасць. А то яшчэ адзін выпадак. Жыў летам Маўр на дачы ў Ждановічах, а яго суседам быў акадэмік-прыродазнаўца. Маўр браў лейку і хадзіў у лес на вачах у суседа. Той, заінтрыгаваны, пытаўся: «Што гэта вы робіце?» — «А хачу, каб грыбы нараслі». — «Кіньце, такога не будзе». Маўр толькі пасміхаўся. А сам папрасіў аднаго хлопчыка, каб прынёс грыбоў. Яны іх закапалі ў зямлю. Паказалі. Акадэмік быў уражаны: «Каб не пабачыў, то не паверыў, што грыбы можна вырасціць».



Але потым Маўр ва ўсім прызнаўся, грыбы выкапалі...

Калі Маўр страціў зрок, то зяць Міхась амаль кожны тыдзень прыходзіў да яго, чытаў найбольш цікавыя гумарэскі з «Кракадзіла» і часопіса «За рубежом». Пісьменнік вельмі цікавіўся ўсім, што адбывалася ў свеце.

Юбілей стаў добрай нагодай яшчэ раз звярнуцца да творчасці гэтага чалавека, заснавальніка навукова-прыгодніцкага жанру ў беларускай літаратуры, чый талент да гэтай пары застаецца ўнікальным і непаўторным, а яго імя займае пачэснае месца сярод такіх сусветна вядомых аўтараў, як Жуль Верн, Майн Рыд, Даніэль Дэфо, Фенімор Купер. Усе любяць падарожнічаць, адкрываць для сябе новыя мясціны, а кнігі Янкі Маўра заўсёды экзотыка, гэта падарожжа і прыгоды ў любы час і любы куточак свету. У тым ліку па нашым беларускім Палессі. Таму і з'явілася ідэя зрабіць на партале Нацыянальнай бібліятэкі інтэрнэт-рэсурс, які называецца «Віртуальнае падарожжа з Янкам Маўрам». Да юбілею пісьменніка Нацыянальнай бібліятэкай было алічбавана больш за 30 першых выданняў твораў Янкі Маўра, таксама яго пераклады Андэрсена, Твэна, Прышвіна і іншых пісьменнікаў на беларускую мову. Дзякуючы сучасным тэхналогіям ёсць магчымасць убачыць і прачытаць поўныя тэксты твораў пісьменніка, якія змешчаны ў электроннай бібліятэцы. Праект віртуальнага падарожжа зроблены на беларускай, рускай і англійскай мовах.

На выставе прадстаўлены і кнігі — выданні розных гадоў. Гэта значыць, што гэтыя кнігі можна браць і чытаць. Чытаюць яго ўважліва нават дарослыя — вывучаюць яго багатую творчасць. **Даследчыца творчасці Янкі Маўра Юлія МАСАРЭНКА,** напрыклад, адзначыла: «Я лічу, што настаў той час, калі неабходна выдаць поўнасцю творы Янкі Маўра, падрыхтаваць адпаведныя і зробленыя на сучасным узроўні каментары да іх. Тым больш што знаходзяцца яшчэ запісы і творы, якія наогул неапублікаваны альбо апублікаваныя ў перыядычным друку і шырока невядомыя чытачу».

Але для сучаснай дзятвы сапраўды любыя сродкі добрыя, каб далучыць іх да кніг: творы Маўра вабяць неверагоднымі прыгодамі. І самі яны як цікавае падарожжа.

**Ларыса ЦІМОШЫК**



# БАЛЬ У ГЛЫБІНЦЫ

## ЯК АДРАДЗІЦЬ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ШЛЯХТЫ?

**25 мая ў Крычаўскім гістарычным музеі, які з 2008 года займае адрэстаўраваны будынак палаца князя Рыгора Пацёмкіна (помнік архітэктуры ранняга класіцызму з элементамі псеўдаготыкі канца XVIII стагоддзя), пройдзе шляхецкі баль. Ініцыятарам балю з'яўляецца віцебскі клуб гістарычнай рэканструкцыі «Паўночная вежа», а падтрымаў ініцыятыву дырэктар музея ў Крычаве Вадзім Рыськоў.**

Мяркуецца, што ў балі возьмуць удзел гістарычныя клубы, якія займаюцца рэстаўрацыяй танца: «Барысаўская мыза» і «L'Empire» (Барысаў), «Залаты двор» і «Версаль» (Мінск), «Паўночная вежа» (Віцебск). Баль будзе вытрыманы ў стылістыцы першай паловы XIX стагоддзя і складацца з праграмы ў трох аддзяленнях. Тут заяўлены танцы, напрыклад, з такімі назвамі: «Падмані даму», «Герцаг Пёрцкі», «Вольныя муляры», «Дзірка ў сцяне», Свечкі ў цемры» ды іншыя.

Арганізатары распавядаюць, што менавіта такія танцы былі папулярныя ў тыя часы ў Англіі і Францыі, якія задавалі тон усёй еўрапейскай танцавальнай культуры. Сярод тагачаснай беларускай шляхты гэтыя танцы былі не менш папулярныя, чым у краінах паходжання. Удзельнікі балю змогуць паглядзець на знаўцаў старадаўніх танцаў, а таксама патанцаваць самі. Пакуль мяркуецца, што будзе больш за 70 гасцей. Але ўсе ахвотныя, пераапрануўшыся ў адпаведныя эпосе строі, змогуць узяць удзел у балі.

— Для нас вельмі важна правесці шляхецкі баль не ў адным з найбольш вядомых палацаў кшталту Мірскага або Нясвіжскага, але прыцягнуць увагу да больш дробных, малавядомых і не менш адметных мясцін, — тлумачыць **Эля ПЕТРАЧЭНКА**, каардынатар праекта «Шляхецкі баль». — Праблема ў тым, што часта ў такіх месцах знаходзяцца розныя ўстановы, або ідзе рэканструкцыя, або стан такі, што ніякі баль там не правядзеш. Вось, напрыклад, цудоўны палац у Жылічах, як нам паведамілі, цяпер знаходзіцца на рэканструкцыі. Але мы вельмі спадзяёмся, што пасля яе заканчэння там таксама можна будзе аднаўляць традыцыі беларускага шляхецкага балю.

Верагодна, што яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя беларуская шляхта, якую тады ўжо нават не лічылі за асобнае саслоўе і якую імкнулася паглынуць расійскае дваранства, ладзіла падобныя камерныя балі ў невялічкіх, але вельмі адметных палацах па ўсёй Беларусі. Акурат адрадзіўшы старадаўнія беларускія спосабы адпачынку, адраджаць і падтрымліваць беларускую нацыянальную культуру будзе куды лягчэй. Тым больш што беларуская шляхта, калі меркаваць па балях, абсалютна жывая.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

■ Акцыя

# НОЧ. МУЗЕІ

## СЁННЯ Ў МІЖНАРОДНЫ МУЗЕЙНЫ ДЗЕНЬ У МУЗЕЯХ БУДУЦЬ ГУЛЬНІ, ТАНЦЫ, МУЛЬТФІЛЬМЫ І КІНО!

**Сёння, 18 мая, Беларусь бярэ ўдзел у традыцыйнай міжнароднай акцыі «Ноч музеяў». Усе музеі нашай краіны, ад самых буйных да лакальных і вузкаспецыялізаваных, прапануюць наведвальнікам спецыяльныя праграмы, якія будуць цягнуцца да позняй ночы. Акурат падчас такіх акцый у музеі цягнецца больш наведвальнікаў, чым звычайна. Што, зразумела, спрыяе папулярызацыі культуры і мастацтва і мае цудоўны асветніцкі эфект. Гэта бадай як у дзіцячым садку, калі дзяцей праз гульні і забавы вучаць нечаму вялікаму, карыснаму і прыгожаму. І гэтыя «вялікія» гульні павінны выхоўваць у іх духоўных, разумных, свабодных і прыстойных людзей. Вось і на «Ноч музеяў» айчынныя храмы мастацтва прапануюць шмат забаўлянак, паўдзельнічаўшы ў якіх, вы, можа быць, станеце трохі больш свабоднымі і разняволенымі і зможаце хаця б дакрануцца да вечнага.**
**«Звязда» робіць сціслы агляд найбольш цікавых «гульняў», якія сёння прапануюць сталічныя музеі.**

### Нацыянальны мастацкі музей Беларусі, вул. Леніна, 20

Тут вам раскажуць16 апавяданняў шляхціца Завальні. Праграма так і называецца — «Беларуская ноч, або Музей у фантастычных апавяданнях». Вы зразумееце, што музей — гэта не толькі нешта сур'ёзнае, застыглае і страшна акадэмічнае. Музей — гэта рух і развіццё. А сёння вас нават пусцяць туды бясплатна, калі будзеце ў фантастычным абутку (каб пайсці туды, не ведаю куды) і чароўных акулярах (каб убачыць тое, не ведаю што). Цудоўны заклік да эксперыментаў! Большым кансерватарам квіткі абыдуцца ў 50 тыс. руб (для дарослых) і 25 тыс. руб (для школьнікаў і студэнтаў).

Сярод самых адметных «апавяданняў», якія раскажа вам Нацыянальны музей, выстава мастака-ілюстратара Валерыя Славука. Ён самавучка, але сёння ў гэта вельмі складана паверыць. Яго малюнкі — надзвычай фантастычныя і загадкавыя. Да таго ж улюбёнымі тэмамі майстра з'яўляецца міфалогія. Колькі персанажаў беларускіх казак ды паданняў намаляваў ужо Валерый Славук, і пералічыць цяжка. З некаторымі з іх вы і зможаце бліжэй пазнаёміцца на выставе.

Вас чакае таксама фотавыстава і прэзентацыя альбома Дзяніса Раманюка «Беларусь сінявокая». З 305 фотаздымкаў альбома 25 будуць прадстаўлены на асобнай экспазіцыі. І менавіта яны дапамогуць вам глыбей зразумець зацяганыя агульнавядомыя назвы «сінявокая Беларусь» і «край блакітных азёр». Аказваецца, і на тое, што стала ўжо бадай штампамі, таксама можна паглядзець па-філасофску.




На так званую Музычную раду ў так званы маёнтак шляхціца Завальні збяруцца музыканты з розных куткоў нашай краіны. Вы пачуеце гурты «Тутэйшая шляхта», HardWood, HURMA, Dzivasil, Relikt, Prosspect ды іншыя.

Вельмі цікавым абяцае быць дзявятае «апавяданне» Завальні «Свет феі і незвычайных мар». Гэта будзе сапраўдным сеансам мультыплікацыйных сноў, падчас якога рэжысёры-аніматары кінастудыі «Беларусьфільм» ды іншыя незалежныя аніматары раскажуць вам, што такое мастацтва анімацыі — самае фантастычнае і чароўнае з мастацтваў.

### Нацыянальны гістарычны музей Беларусі, вул. К. Маркса, 12

Лічбу 13 абыграюць на «Ноч музеяў» у Нацыянальным гістарычным. Праграма, якая сваёй назвай адсылае да вядомага амерыканскага фільма жахаў «Ноч у музеі: гісторыя не спіць!», будзе прысвечана лічбе 13 і «чортаваму тузіну». Усе пляцоўкі музея будуць «заточаны» акурат пад гэтую «гульню».

Так, наведвальнікі ў адной з залаў змогуць апынуцца ў атмасферы Мінска 1913 года, а ў іншай — у Маскве 1813 года... Музей напоўняць жывыя экспазіцыі, ён увесь ператворыцца ў суцэльную інтэрактыўную прастору. Пройдзе майстар-клас рамеснікаў, на якім можна паспрабаваць сябе ў ролі ганчара, напрыклад. А на асобнай музычнай пляцоўцы можна нават узяць удзел у джазавай імправізацыі.

На выставе «Камунальная кватэра №13» госці ў рэжыме анлайн змогуць пасназіраць за жыццём яе жыхароў, і кожны ахвотны зможа сыграць з жыхарамі ў даміно. У экспазіцыі «Гісторыя Беларусі XVI—XVIII стагоддзяў у партрэтах і геральдыцы» можна будзе атрымаць сваю выяву ў стылі сармацкага партрэта. Акурат так, як рабілі вялікія Радзівілы.

Асобна абяцаюць і «Спартыўную гульнявую праграму для дзяўчат», якая прысвечана 13 ліпеня 1908 года, калі ўпершыню да ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях былі дапушчаны жанчыны.

Уваход у музей будзе каштаваць 40 тыс. руб. Але тых шчаслівўчыкаў, якія нарадзіліся 13-га, пусцяць бясплатна.

### Музей сучаснага выяўленчага мастацтва, пр. Незалежнасці, 47

Тут падчас акцыі «Ноч музеяў» зробяць акцэнт на сучасным тэатры, мадэрновай пластыцы і папулярнай музыцы. Не, не здзіўляйцеся, вы не пачуеце тут эстрадных выканўцаў. Вы пачуеце шмат цікавых, маладых і беларускамоўных музыкантаў, якія прадэманструюць вам свой погляд на тое, якой павінна быць папулярная музыка. Найбольш актыўнымі абяцаюць быць удзельнікі гурта REHA, які выступіць у новым складзе. Музычны праект The Arches, які аб'ядноўвае сёння 30 чалавек і літаральна днямі выдаў альбом у Парыжы, спалучыць камерную і электронную музыку з джазам, рокам і сімфанічнымі матывамі.

Таксама ў музеі пакажуць мультфільмы расійскай студыі «Пілот», а найлепшы фокуснік-ілюзіяніст Беларусі Ніл Рахманаў прадэманструе сваё майстэрства.

Камп'ютарны нонстоп-інтэрактыў абяцаюць VVG (Virtual Vibes Group), якія ўпершыню ў Беларусі ў 2009 годзе прадэманстравалі тэхналогію відэакэмпінгу — праецыраванне відэа на паверхню аб'екта з улікам яго геаметрыі і размяшчэння ў прасторы.

Эксперыметальны тэатр «ПОка ТАК», тэатр лялек «Дом Сонца» і перформеры Ілья Сін, Павел Вайніцкі і Яўген Рагозін (экзарцыстычны перформанс Gesamtkunstwerk) пакажуць, чым ёсць сучасны тэатр, перформанс і мастацтва пластыкі наогул. Паразважаюць пра ілюзорнасць, свабоду, фантомы і тое, як быць вольнымі. Уваходныя квіткі каштуюць 40 тыс. руб.

### Дом-музей І з'езда РСДРП, пр. Незалежнасці, 31А

Сёння ў 20.30 тут адбудзецца «Ноч нямецкай мультыплікацыі», падчас якой вам пакажуць і анімацыю Веймарскай рэспублікі, і прапагандысцкія нямецкія фільмы 1930-х гадоў, і пасляваенныя мультфільмы, і нават сучасныя. Тэматычна гэтая даволі ўнікальная праграма падзелена на 3 блокі.

«Анімацыя ў даваенны перыяд»: акрамя анімацыйнай прадукцыі, якая выраблялася пры дзяржаўнай падтрымцы, у так званай «унутранай эміграцыі» ствараліся авангардныя фільмы, якія лічыліся «забароненым мастацтвам». Падборка фільмаў адлюстроўвае самую складаную эпоху ў нямецкай гісторыі, у тым ліку і для мультыплікацыі. «Анімацыя ў ГДР»: мультфільм у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы значыў нашмат больш, чым проста дзіцячы фільм. У падборцы прадстаўлены найлепшыя прыклады анімацыйнага мастацтва і ўзоры мастацкага станаўлення, якія ўзніклі ў сувязі са спецыфічнай сітуацыяй таго часу. Разам з фільмамі дзяржаўнай студыі DEFA ў падборку ўключаны ўзоры анімацыйнага андэграўнду, які з сярэдзіны 1970-х гадоў паступова стаў выраблець ўсё больш і больш фільмаў. «Сучасны анімацыйны фільм»: рэзкі, абстрактны, багаты, смешны і поўны цікавых каляровых рашэнняў. Сучасны анімацыйны фільм падкупляе сваім мастацкім узроўнем, які зрабіў яго вельмі прывабным ўнутры краіны і за яго межамі.

### Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, вул. Акадэмічная, 5

З самай раніцы ў музеі абяцаюць раскрываць наведвальнікам розныя літаратурныя і калялітаратурныя таямніцы. Спецыяльна да 130-годдзя да дня нараджэння беларускага дзіцячага пісьменніка Янкі Маўра супрацоўнікі музея падрыхтавалі адмысловую інтэрактыўную віктарыну. Адбудзецца сустрэча з нашчадкамі Янкі Маўра і Якуба Коласа ў рамках традыцыйнага музейнага цыкла «Нашчадкі славутых людзей». Як вядома, Якуб Колас і Янка Маўр былі сватамі: сын Коласа Міхась Міцкевіч ажаніўся з дачкой Янкі Маўра Наталляй. Нашчадкі дзвюх славутых літаратурных сем'яў падзеляцца ўспамінамі пра сваіх знакамітых продкаў.

Адным з найцікавейшых пунктаў у праграме будзе рэтра-кінапаказ мастацкага фільма паводле аповесці Янкі Маўра «Палескія рабінзоны» — «Неадкрытыя астравы» (1974) рэжысёра Леаніда Мартынюка, які ў гэтым годзе пайшоў з жыцця.

Музычную праграму складуць выступленні Рамана Яраша, Андрэя Касценя, Віктара Сямашкі і гурта Relikt. А прыхільнікам класічнай музыкі Сярэднявечча прапануецца канцэрт «Шэдэўры еўрапейскага барока» ансамбля «Камерныя салісты Мінска» пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Зубава.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

## ОАО «Автомагистраль»

(г. Минск, ул. Кижеватова, 8)

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ 30.05.2013 в 15.00 ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ по адресу: г. Минск, ул. Кижеватова, 8 (каб. 107).**

**Форма проведения: очная.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об участии открытого акционерного общества «Автомагистраль» в холдинге «Белавтодор» в качестве дочерней компании.
2. Об оплате услуг управляющей компании холдинга на основании договора между управляющей компанией холдинга «Белавтодор» и участником холдинга.

Время и место ознакомления акционерами с материалами по вопросам повестки дня собрания: г. Минск, ул. Кижеватова, 8, каб. 102, 111 — в период с 22.05.2013 по 29.05.2013 с 14.00 до 16.00 (кроме воскресенья), а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Регистрация участников собрания будет производиться с 13.00 до 14.00 в день по месту проведения собрания по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера — доверенность). Лица, не прошедшие регистрацию, не вправе принимать участие в голосовании.

Список акционеров ОАО «Автомагистраль», имеющих право на участие в собрании, составлен по состоянию на 20.05.2013 на основании данных реестра акционеров.

УНП 100120075

## ОАО «Амкодор-Дзержинск»

**222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19**

Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров

**Собрание состоится 29 мая 2013 г. в 15.00 по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, актовый зал Общества.**

**Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14-55.**

**Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в собрании, – 17 мая 2013 г.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

«О совершении крупной сделки».

Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от **17 мая 2013 года.**

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) **начиная с 24 мая 2013 г.** в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (личный паспорт, для представителя акционера – доверенность или договор).

УНН 600005769 *Совет директоров ОАО «Амкодор-Дзержинск»*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ЧУП «Молодечненский пищевой комбинат» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

**ЛОТ № 1: (в комплексе) – административное здание, инвентарный номер 630/С-1936, общей площадью 366,4 кв.м; административное здание, инвентарный номер 630/С-6352, общей площадью 345,8 кв.м; здание пилорамы, инвентарный номер 630/С-1935, общей площадью 350,6 кв.м; арматурный цех, инвентарный номер 630/С-16781, общей площадью 635,5 кв.м; здание столярного цеха, инвентарный номер 630/С-16783, общей площадью 442,5 кв.м; здание гаража, инвентарный номер 630/С-16786, общей площадью 816,7 кв.м; здание склада, инвентарный номер 630/С-4730, общей площадью 401,8 кв.м (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000003000591, по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, 153.**

Площадь земельного участка – **2,0142 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

На земельном участке имеются ограничения прав в использовании – охранная зона линии электропередачи, площадью 0,0166 га.

**Начальная цена с НДС – 4 176 573 235 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (417 657 000 бел. руб.) перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на р/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 17.04.2013.*

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.**

Аукцион состоится **29.05.2013** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.05.2013** до 12.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

*Уважаемые акционеры ОАО «Белбакалея»!*

**29 мая 2013 года СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «Белбакалея»

**по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, актовый зал.**

**Повестка дня собрания:**

1. О совершении Обществом крупной сделки с ОАО «Белинвестбанк».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Промышленная, 15, АБК, кабинет № 8 с 20 мая по 28 мая 2013 года (время работы с 9.00 до 17.00).**

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, составлен по состоянию на 1-го марта 2013 года.

Регистрация участников собрания **29 мая 2013 года с 9.00 до 13.45** по месту проведения собрания.

Форма проведения собрания — **очная.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 100025653 *Наблюдательный совет ОАО «Белбакалея».*

**Наблюдательный совет**

**открытого акционерного общества «ДСТ № 2, г. Гомель»**

**сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров, которое состоится 31 мая 2013 года по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 28, 4-й этаж (зал совещаний).**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1.** Об участии открытого акционерного общества в холдинге «Белавтодор» в качестве дочерней компании.
**2.** Об оплате услуг управляющей компании холдинга на основании договора между управляющей компанией холдинга «Белавтодор» и участником холдинга.
**3.** О выплате дивидендов в Республиканский бюджет на принадлежащие государству акции за 1 квартал 2013 года.

Начало собрания **в 10.00.**

Регистрация акционеров, их представителей **с 9.00.**

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в собрании, — **15 мая 2013 г.**

С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенности.

УНП 400022426

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества** | Лот № 1 – ленточные блоки Фл 10.24-4 (9 шт) стоимостью 3 646 960 рублей.<br>Лот № 2 – ленточные блоки Фл 6.24-4 (28 шт) стоимостью 9 835 767 рублей.<br>Лот № 3 – ленточные блоки Фл 6.12-4 (11 шт) стоимостью 1 902 551 рублей.<br>Лот № 4 – ленточные блоки Фл 8.24-4 (2 шт) стоимостью 876 003 рублей.<br>Лот № 5 – стеновые блоки ФБС 24-5-6 (22 шт) стоимостью 4 717 628 рублей.<br>Лот № 6 – стеновые блоки ФБС 12-5-6 (9 шт) стоимостью 940 810 рублей.<br>Лот № 7 – стеновые блоки ФБС 9-5-6 (2 шт) стоимостью 327 886 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | **ИП Шило Е.А.** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Витебск, ул. 1 Полярная, 1Д** |
| **Обременения** | **Обременений нет.** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 318 10.06.2013 в 11.00** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | **Хозяйственный суд Витебской области: 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 318, http:// vitebsk.court.by/ тел./факс: (80212) 49-13-45, (8-029) 366-40-15 судебный исполнитель Бураков Игорь Вячеславович, старший судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел.: (80212) 49-13-40, (8044) 746-73-00** |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670, не позднее 17.00 07.06.2012. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

■ Сітуацыя

# АПОШНІ «ЗВАНОК» ДЛЯ «БАМБІЛАЎ»

## Канфіскацыя машын у нелегальных перавозчыкаў будзе нормай?

**Як ужо паведамляла «Звязда», гаспадарчы суд Гродзенскай вобласці ўзмацняе меры пакарання нелегальных таксістаў, якія займаюцца прадпрымальніцтвам без дзяржаўнай рэгістрацыі. Прычым не толькі ў кірунку павялічэння штрафных санкцый. Нядаўна суд прыняў, пэўна, найбольш радыкальнае рашэнне ў сітуацыі з «чорнымі» таксістамі: у так званага «бамбілы» забралі аўтамабіль. На Гродзеншчыне гэта зроблена ўпершыню, аднак ёсць падставы лічыць, што канфіскацыя машын у нелегальных перавозчыкаў будзе станавіцца нормай.**

Гаспадарчы суд Гродзенскай вобласці летась разгледзеў 77 спраў па фактах нелегальнай перавозкі пасажыраў, а ў гэтым годзе за чатыры месяцы — ужо 37. Агульная сума штрафных санкцый сёлета дасягнула 137 мільёнаў рублёў (за увесь мінулы год — 190 мільёнаў рублёў), і, акрамя таго, канфіскавана больш за 8 мільёнаў рублёў незаконнага даходу.

— Да правапарушальнікаў прымяняліся розныя па памеры штрафы, аж да максімальных. Але практыка сведчыць, што парушэнняў менш не становіцца. Таму і ўзмацняюцца меры пакарання. У першы раз за прадпрымальніцкую дзейнасць без дзяржаўнай рэгістрацыі суд будзе спаганяць максімальны штраф у памеры 9-10 мільёнаў рублёў. Калі ж нелегальнае возніцтва прадоўжыцца, то будзем канфіскоўваць аўтамабіль, — паведаміў **намеснік старшыні гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці Дзяніс ВАЛДАЙЦАЎ.**

У тым, што гэта зусім не «страшылка», а рэальная пагроза, першым з «бамбілаў» пераканаўся на ўласнай скуры жыхар абласнога цэнтра Л. Спачатку ён трапіў у поле зроку супрацоўнікаў падатковай інспекцыі, калі, прычапіўшы да сваіх «колаў» плафон таксі, незаконна арудаваў на падвозе пасажыраў. За гэта гаспадарчы суд пакараў яго чатырохмільённым штрафам, канфіскаваў плафон і наклаў арышт на аўтамабіль. Пры гэтым машына была перададзена на захоўванне гаспадару і не магла выкарыстоўвацца да поўнай выплаты штрафу. Але дзе там... Яшчэ не выплаціўшы штраф, на аўтамабілі, што знаходзіцца пад арыштам, Л. зноў накіроўваецца ў нелегальны рэйс. І зноў трапляе пад адміністрацыйны пратакол за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

Тут ужо фінансавымі санкцыямі не абмежавалася. Нелегалу давядзецца не толькі аплаціць папярэдні штраф, новы (40 базавых велічынь), але і развітацца з аўтамабілем Volkswagen Vento ацэначным коштам больш за 50 мільёнаў рублёў. Парушальнік прасіў так жорстка не караць, паколькі выхоўвае траіх дзяцей і нідзе не працуе. Да таго ж ён быццам збіраўся афарміцца індывідуальным прадпрымальнікам, каб таксаваць законна, ды не паспеў купіць таксометр. Аднак тое ж самае з яго вуснаў гучала і на папярэднім пасяджэнні суда. І які толк?

Такім чынам, прэцэдэнт канфіскацыі транспартнага сродку ў «чорнага» перавозчыка на Гродзеншчыне, як і ў шэрагу іншых рэгіёнаў краіны, створаны. Хаця, відавочна, перабольшваць значэнне гэтага, пакуль адзінкавага факта не варта, лічыць **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА,** які вельмі заклапочаны праблемай нелегальнага возніцтва і мае намер пакласці яму канец.

— Парадак у гэтай сферы, нягледзячы на пратакол даручэнняў леташняй нарады, так і не наведзены. Як вазілі «бамбілы» пасажыраў — так і возяць. Як не баяліся — так і не баяцца. Як жылі без падаткаў — так і жывуць. Як перашкаджалі нармальным падаткаплацельшчыкам — так і перашкаджаюць. Законапаслухмяныя грамадзяне пакутуюць — вось у чым бяда, — зазначыў Сямён Шапіра на нядаўняй планёрцы ў аблвыканкаме.

На яго думку, канфіскацыя аўтамабіляў у нелегальных перавозчыкаў павінна быць сістэмнай. Абласной падатковай інспекцыі даручана штомесячна прадастаўляць у аблвыканкам інфармацыю, колькі адпаведных матэрыялаў перададзена ў суд.

Ці будзе «бамбіламі» пачуты гэты апошні, так бы мовіць, папераджальны званок? Не? Тады ім, напэўна, мала не пакажацца.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## ПЯЦЬ ПРАТАКОЛАЎ НА... АДНАГО ПАРУШАЛЬНІКА

**Па пяці пратаколах давядзецца адказваць аднаму матацыклісту, паведамляе Гродзенская абласная Дзяржаўтаінспекцыя.**

Заязджаючы ў абласны цэнтр, кіроўца матацыкла «БМВ» рухаўся з хуткасцю 124 кіламетры за гадзіну. Гэта было першае парушэнне, аднак патрабаванню нарада ДАІ спыніцца ён не падпарадкаваўся. У выніку, калі неўзабаве быў усё ж затрыманы, дык аказалася, што дзеянні парушальніка цягнуць ажно на пяць адміністрацыйных пратаколаў. Такім чынам, жадаючы пазбегнуць адказнасці, матацыкліст яе толькі павялічыў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Паэтычная памяць

## ЮРАСЬ СВІРКА

* * *

*Лесе мой, я рос з табой калісьці,*
*Абагрэты чырванню суніц...*
*Так мне захацелася прайсціся*
*Сцежкамі, дзе падсцілка зігліц.*

*Так мне захацелася падыхаць*
*Саладжавай парнасцю грыбной.*
*Маладосць сваю паклікаць ціха*
*І, уздыхнуўшы, не імчаць за ёй,*

*А спыніцца пад шатрамі хвояў,*
*Дзе падушкі мяккія імхоў.*
*І пяшчотна гладзіць, як малое,*
*Цемечкі рудых баравікоў.*

*Так мне захацелася не думаць,*
*Што вядзе дарога з кірмашу,*
*А ўлавіць яшчэ ў сасновым шуме,*
*Што да дна не выстудзіў душу.*

*Не забыць ні баравін, ні верас,*
*Дзе растуць тугія спарышы.*
*І ва ўсе гады шчасліва верыць,*
*Што ў тваім я царстве не чужы.*

### БАЦЬКАВА ХАТА І МАТЧЫНА МОВА

*Горад вялікі мяне праглынуў.*
*Не стрэнуць ні бацька, ні маці...*
*Ды ўсё-ткі дадому і я загляну*
*І грэюся ў бацькавай хаце.*

*У грубцы іскрынка цяпельца бліснe*
*І згасне на ўзлёце крылатым.*
*Халодна хаце было без мяне.*
*І халодна мне без хаты.*

*Дымок па-над хатай віецца, як ніць,*
*Для сына часіна святая.*
*Бацькава хата яшчэ стаіць,*
*А матчына мова змаўкае.*

*Матчынай мовы лагодны напеў*
*Ледзь чую, яна ва ўяўленні.*
*Над бацькавай хатай дымок пагусцеў,*
*Матчынай мове не даўшы свячэння.*

*У хаце са мною самота мая.*
*Жадана бацькі ажываюць у цянях...*
*Бацькава хата, цяпельца і я.*
*І — матчынай мовы трымценне.*

### ТРЫ РАЗЫ ЗБІРАЕЦЦА РАДНЯ

*Тры разы збіраецца радня:*
*Першы раз, калі вяселлю «горка»,*
*І не сніцца хаце цішыня —*
*Мілае застолле і гаворка.*

*Другі раз з'язджаецца яна —*
*Радасна збярэцца на радзіны.*
*Не змаўкае хата давідна —*
*Песні, віншаванні, успаміны...*

*Трэці раз сыходзяцца свае.*
*Іх тады збірае не гамонка.*
*А жалоба плачам падпяе,*
*Ад якога невыносна горка...*

*У жыцці вядзецца так здаўна:*
*Тры разы збіраецца радня.*

* * *

*Адцвіў апошні майскі дзень.*
*Вясну ў вянку з пялёсткаў белых*
*Цалуе сонечны прамень*
*І палахліва, і няўмела.*

*Чаканне ёсць у гэтым дні*
*І раставанне трапяткое.*
*Акно, здаецца, расчыні —*
*І лета закранеш рукою.*

*Прачнуўся буркатлівы гром*
*І перасоўвае аблокі.*
*Трава ільсніцца дываном,*
*Відаць, пачула лета крокі.*

*Яго усмешку пазнаю*
*І ў квецені садоў, і ў бэзе.*
*Здаецца, побач з ім стаю.*
*Яно знаёміцца не лезе.*

*Зашклёна неба сінявой,*
*Яно праяснена вятрамі.*
*Хоць гэты дзень прапах вясной,*
*Ды лета ўжо не за гарамі.*

*У белай квецені сяло.*
*І май сыходзіць з далягляду.*
*Чутно, як лета наплыло,*
*Перабірае завязь саду.*

### ВЕСНАВОЕ МАЎЧАННЕ

*Туман паслаў бяліць палотны*
*На сенажаць.*
*Вятры і пчолы, і грымоты*
*Салодка спяць.*

*Нідзе ні гуку — ціха-ціха.*
*Спачын, спакой.*
*Зямля як перастала дыхаць*
*Вадой, травой...*

*Маўчыць у кветкавай абнове*
*Зямля, як храм,*
*Аддаўшы голас свой дубровам,*
*Крыніцам, ручаям альховым,*
*І перашэптам вечаровым,*
*І — салаўям.*

* * *

*Нада мною праплыў*
*жураўліны клінок,*
*Скіраваны ў вырай далёкі.*
*Ён забраў мой чарговы*
*даспелы гадок*
*І на крылах узняў пад аблокі.*

*З-пад рукі паглядаў я на клін жураўлёў,*
*І закралася ў сэрца трывога:*
*Ён нікому з далёкіх паўднёвых краёў*
*У замен не прыносіць нікога.*

**Публікацыя Ірыны СВІРКО.**

## ОАО «Элегант»

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ 29 мая 2013 года.**

**Повестка дня:**

1. Об утверждении разделительного баланса.
2. О составе участников хозяйственных обществ, создаваемых в результате реорганизации ОАО «Элегант».
3. Об изменении уставного фонда ОАО «Элегант».
4. О внесении и утверждении изменений в Устав Общества.

**Собрание состоится по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13.**

**Начало в 13.00, регистрация участников с 12.30.**

При себе иметь паспорт, представители акционеров — доверенность. С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по указанному выше адресу в период с 24 мая, с 14.00 до 17.00.

УНН 400078331

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 20 июня 2013 года проводит 12-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 245 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 095485 дв. 242981 1988 г. 4 кат. 134925 км | г. Бобруйск, в/ч 20392 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 246 | Грузовой КамАЗ-4310 ш. 0055088 дв. 0368430 1988 г. 3 кат. 104343 км | г. Минск, в/ч 68473 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 247 | Грузовой КамАЗ-43101 ш. 0011240 дв. 0530226 1990 г. 3 кат. 122061 км | г. Минск, в/ч 68473 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 248 | Автошасси КамАЗ-4310 ш. 0059932 дв. 0415780 1989 г. 4 кат. 76957 км | г. Кричев, в/ч 33190К | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 249 | Грузовой Урал-43202 ш. 038647 дв. 754102 1985 г. 4 кат. 3312 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 250 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 066542 дв. 996129 1986 г. 3 кат. 78585 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 251 | Грузовой КрАЗ-250 ш. 595061 дв. 061937 1987 г. 4 кат. 3626 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 252 | Грузовой КрАЗ-260 ш. МО715104 дв. 31229 1991 г. 3 кат. 95021 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 253 | Грузовой КамАЗ-43105 ш. 003532 дв. 759662 1985 г. 4 кат. 24651 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 254 | Шасси МАЗ-543М ш. ТМ2ТР2120290 дв. 9001К00596 1990 г. 4 кат. 29271 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 80 000 000 | 8 000 000 |
| 255 | Полуприцеп-тяжеловоз ЧМЗАП-9990 ш. 1979 1985 г. 4 кат. 487 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 75 000 000 | 7 500 000 |
| 256 | АЦ-5,5-4320М (автоцистерна) с/о 390 на ш. УрАЛ-4320М ш. 032205 дв. 568077 1985 г. 4 кат. 72814 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 257 | ТЗ-8-255БМ (топливозаправщик) с/о А851056 на КрАЗ-255 ш. 523009 дв. 917601 1985 г. 4 кат. 6548 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 80 000 000 | 8 000 000 |
| 258 | ТЗ-8-255БМ (топливозаправщик) с/о А823239 на КрАЗ-255 ш. 445593 дв. 767317 1982 г. 4 кат. 15084 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 75 000 000 | 7 500 000 |
| 259 | АЦ-8-5334 (автоцистерна) с/о А8110102 на ш. МАЗ-5334 ш. 23020 дв. 547201 1980 г. 4 кат. 98273 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 75 000 000 | 7 500 000 |
| 260 | АЦ-8-5334 (автоцистерна) с/о А8120241 на ш. МАЗ-5334 ш. 25403 дв. 553748 1981 г. 4 кат. 69159 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 80 000 000 | 8 000 000 |
| 261 | АЦ-8-5334 (автоцистерна) с/о А8820422 на ш. МАЗ-5334 ш.106916 дв. 8808032 1988 г. 4 кат. 127394 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 262 | АЦ-8-5334 (автоцистерна) с/о А8330640 на ш. МАЗ-5334 ш.53138 дв.648492 1983 г. 4 кат. 82532 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 80 000 000 | 8 000 000 |
| 263 | АЦ-8-5334 (автоцистерна) с/о А8310139 на ш. МАЗ-5334 ш.47394 дв.628794 1983 г. 4 кат. 21790 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 95 000 000 | 9 500 000 |
| 264 | АТМЗ- 4,5-375 (автотопливомаслозаправщик) с/о 800314 на УрАЛ-375 ш. 320399 дв. 083758 1980 г. 4 кат. 2315 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 265 | АТМЗ- 4,5-375 (автотопливомаслозаправщик) с/о 820202 на УрАЛ-375 ш. 370357 дв. 585883 1982 г. 4 кат. 1542 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 266 | АТМЗ- 4,5-375 (автотопливомаслозаправщик) с/о 820914 на УрАЛ-375 ш. 385465 дв. 739566 1982 г. 4 кат. 2037 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 267 | АТМЗ- 5-4320 (автотопливомаслозаправщик) с/о 2735 на УрАЛ-4320 ш. 054681 дв. 895401 1986 г. 4 кат. 1528 км | н.п. Михановичи, в/ч 52188 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 268 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11332278 дв. 7W1106E 1978 г. 5 кат. 1115 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 70 000 000 | 7 000 000 |
| 269 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11332213 дв. 7L1123E 1978 г. 5 кат. 432 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 70 000 000 | 7 000 000 |
| 270 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11321432 дв. 7И07114Е 1977 г. 5 кат. 273 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 70 000 000 | 7 000 000 |
| 271 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11321623 дв. 7U0777E 1976 г. 5 кат. 131 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 70 000 000 | 7 000 000 |
| 272 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11340649 дв. 7L1147E 1977 г. 5 кат. 182 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 70 000 000 | 7 000 000 |
| 273 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 328311001 дв. 002729 1983 г. 4 кат. 2935 км | г. Минск, в/ч 63755 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 274 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 497903003 дв. 548168 1979 г. 4 кат. 3604 км 224 м/ч | г. Минск, в/ч 63755 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 275 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 497903004 дв. 969722 1979 г. 4 кат. 6494 км 356 м/ч | г. Минск, в/ч 63755 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 276 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 497902001 дв. 17108 1980 г. 4 кат. 3066 км | г. Минск, в/ч 63755 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 277 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 107909006 дв. 05992 1979 г. 4 кат. 456 км 334 м/ч | г. Минск, в/ч 63755 | 120 000 000 | 12 000 000 |
| 278 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 10Е9008016 дв. 9016963 1990 г. 4 кат. 1219 км 741,5 м/ч | г. Минск, в/ч 63755 | 120 000 000 | 12 000 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **20 июня 2013 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 17 июня 2013 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **20 июня 2013 г.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. Без НДС.

**Справки по тел.: (017) 278-09-98, факс (017) 278-09-98.**

**Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА

***Организатор: Круглицкий сельский исполнительный комитет Чашникского района Витебской области***

| № лота | Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | Начальная цена, руб. | Сумма залога, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Хотлино, ул. Набережная, д. 11Б, площадь — 0,2141 га, кадастровый номер 225182312101000015 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона озера Хотлинское | 737571 | 2973420 | 297340 |

1. **Аукцион состоится 18 июня 2013 года в 15.00 по адресу: д. Круглица, д. 15, сельисполком.**
2. Заявления от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дня с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская область, Чашникский район, деревня Круглица, д. 15, сельисполком. **Последний день приёма заявлений 13 июня 2013 года до 17.00.**
3. Для участия в аукционе необходимо представить копию паспорта гражданина (без нотариального засвидетельствования); представителю гражданина — нотариально удостоверенную доверенность, а также копию паспорта доверенного лица; копию платежного документа, подтверждающего уплату налога на расчётный счёт 3641326042200 ЦБУ № 222 филиала № 215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, код 647, УНП 300986823, код платежа 04901, получатель Круглицкий сельский исполнительный комитет.
4. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников.
5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

**Контактные телефоны: 802133 2 58 35, 802133 2 58 45.**

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»**

**29 мая 2013 года проводит 3-ий повторный от 06 марта 2013 года, 6-ой повторный от 11 апреля 2013 года и 10-ый повторный от 16 мая 2013 года открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности на 11-ом открытом аукционе**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи | Сумма задатка |
|---|---|---|---|---|
| 38 | АЦ– 5,5–4320М (автоцистерна) с/о3658 на шасси УрАЛ-4320М ш. 064966 дв. 988834 1987 г. 4 кат. 29339 км 518 м/ч | н.п. Калинковичи, в/ч 55461/2 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 49 | Мастерская МТО-В № 046 на ЗИЛ-131 ш. 509502 дв. 753339 1982 г. 4 кат. 2875 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 51 000 000 | 5 100 000 |
| 116 | АЦ-5,5-4320М (автоцистерна) с/о1404 на ш. УрАЛ-4320М ш. 042542 дв. 780521 1985 г. 4 кат. 1706 км | г. Борисов, в/ч 15847 | 70 000 000 | 7 000 000 |
| 187 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 108444 дв. 762851 1988 г. 3 кат. 134043 км | г. Марьина Горка, в/ч 89417 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 188 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш.590188 дв.159 1987 г. 4 кат. 45582 км | г. Барановичи, в/ч 29969 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 189 | Автошасси Урал-4320-1012 ш. 016325 дв. 271343 1983 г. 4 кат. 162542 км КР-1992 г. | г. Береза, в/ч 23324 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 190 | Автошасси Урал-4320-1012 ш. 039556 дв. 757192 1985 г. 4 кат. 134104 км | г. Береза, в/ч 23324 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 191 | Автошасси Урал-4320 ш. 017672 дв. 2031 1983 г. 4 кат. 162078 км КР-1991 г. | г. Береза, в/ч 23324 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 192 | Автошасси Урал-4320-1012 ш. 15771 дв. 508697 1985 г. 4 кат. 162945 км 2КР-1993 г. | г. Береза, в/ч 23324 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 193 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 294249 дв. 149787 1977 г. 4 кат. 94654 км | г. Барановичи, в/ч 29969 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 194 | Грузовой Урал-4320-0011 ш. 064168 дв. 455712 1986 г. 4 кат. 33126 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 197 | Автошасси МАЗ-543А ш. ТА1ДВ4510389 дв. Т02КТ1642 1989 г. 4 кат. 52375 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 60 000 000 | 6 000 000 |
| 198 | Автошасси Урал-43202-0011-01 ш. 151591 дв. 633154 1990 г. 4 кат. 129815 км, кузов-фургон КМ-500 № б/н 1987 г. 4 кат. | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 199 | Полуприцеп-тяжеловоз ЧМЗАП-9990 ш. 1987 1985 г. 4 кат. 4215 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 75 000 000 | 7 500 000 |
| 201 | Автошасси ГАЗ-66-01 ш. 0193035 дв. 1983744 1979 г. 4 кат. 1335 км | г. Гомель ГУ"2335 БХМТИ" | 22 000 000 | 2 200 000 |
| 206 | Грузовой Урал-4320-0010-01 ш. 053502 дв. 884983 1986 г. 3 кат. 135687 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 207 | Грузовой Урал-43200010-01 ш. 167875 дв. 739222 1990 г. 4 кат. 138329 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 208 | Грузовой Урал-4320-0010 ш. 063908 дв. б/н 1986 г. 3 кат. 76851 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 209 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 134657 дв. 517144 1989 г. 3кат. 85518 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 215 | Мастерская МРМ-М1 №129 на ш. ЗИЛ-131Н ш. 723617 дв. 795589 1987 г. 4 кат. 2057,5 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 216 | Мастерская МРМ-М1 №б/н на ш. ЗИЛ-131 ш. 379654 дв. 064371 1979 г. 4 кат. 1368 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 217 | Седельный тягач КрАЗ-260В ш. 561569 дв. 997728 1986 г. 4 кат. 21146 км | г. Барановичи, в/ч 29969 | 50 000 000 | 5 000 000 |

**Извещение о проведении аукциона № 3 от 06.03.13 г. опубликовано в газете «Звязда» № 9 от 17.01.13 г. и № 14 от 24.01.2013 г.**
**Извещение о проведении аукциона № 6 от 11.04.13 г. опубликовано в газете «Звязда» № 27 от 12.02.13 г.**
**Извещение о проведении аукциона № 10 от 16.05.13 г. опубликовано в газете «Звязда» № 65 от 09.04.13 г.**
**Условия проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 75 от 23 апреля 2013 года.**






## МІМАХОДЗЬ

✓Не надта напінайся ў пошуках апраўданняў: могуць падумаць, што ты сапраўды маеш рацыю.

✓Цвёрды лоб — зручнае месца для кансервавання думак.

✓Не памыліся, вышукваючы чужыя памылкі.

**Заўважыў Міхаіл УЛАСЕНКА,**
*г. Горкі.*

## ВУСНАМІ ДЗІЦЯЦІ

Бабуля пытаецца ва ўнучкі:

— Надзя, будзеш есці драныя бліны?

— Не, бабуля, я лепш цэлыя.

❑❑❑

Дзядуля частуе ўнучку яблыкам. Малая бярэ яго, пільна разглядае і паказвае пальцам на чарвяточынку:

— Дзед, ты што, не бачыш! Тут жа ясна напісана, што ў яблыку жыве чарвяк!

**Запісала Зоя НАВАЕНКА,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*


Малюнак Аркадзя ГУРСКАГА.

## ДЫЯЛОГІ

Дзевяцікласнік просіць у школьнай бібліятэцы «Яўгена Анегіна». Бібліятэкарка пытаецца: — А хто аўтар, ведаеш?

Вучань:

— Я ж кажу: Яўген Анегін.

❑❑❑

Некалі свіней смалілі саломай, лёнам, потым — паяльнай лямпай. Цяпер — найчасцей газам.

Дык вось адзін зяць з сябрам кабана ў цешчы закалолі. Газавы балон прыцягнулі, а само прыстасаванне ў сенцах засталося.

— Збегай у хату, скажы бабулі, хай «гарэлку» дасць, — пасылаюць мальца.

Той — мігам: улятае ў хату:

— Бацька гарэлку просіць.

— А ніякай гарэлкі! Хай так смаляць, — адказвае гаспадыня. — А то вып'юць — што я на стол пастаўлю?

❑❑❑

Адной бабулі было за 80. Але яна яшчэ і карову трымала, і свіней, і з паўгектара зямлі ўрабляла... Да таго ж — хочаш не хочаш — ёй 30 сотак буракоў у калгасе адмервалі. І прапалоць іх трэба, і прарваць, і ўбраць, і здаць... Жанчына з усім спраўлялася! І пры гэтым досыць цікавую звычку мела: кожны дзень выпівала бутэльку віна. Папрацуе, трохі адап'е, колькі хвілін паляжыць — і зноў за справу, нават самую цяжкую.

— Чаму ты не скажаш? Хай бы ж дзеці табе памаглі! — вучаць кабету суседкі.

— Ат, якая з іх падмога — вып'юць ды спяць, — адказвае бабуля. — Не па мне пайшлі.

**Запісала Соф'я КУСЯНКОВА,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## «КАМАРЫКІ МАК ТАЎКУЦЬ»

### Беларускія паэты — дзецям

**Па гарызанталі: 1.** «Пад карэннямі ракіты\\Жыў той рак, ... сярдзіты». З вершаванай казкі «Рак-вусач» Я.Коласа. **6.** «З маленства яны нас\\Да ... гарнулі,\\Пяшчотныя, добрыя\\Рукі матулі». З верша «Матуліны рукі» В.Вярбы. **8.** Кола, асяроддзе сяброў. **9.** «Хто там грукае ў ...?\\Гэта вы, сінічкі?\\Я прачнулася даўно,\\Запяляла касічкі». З верша «Сяброўкі» В.Віткі. **10.** «Маміна ...\\Самае лепшае,\\Маміна слова\\Найдаражэйшае». З верша «Дарагое імя» М.Хведаровіча. **11.** «... ў лужу ўскочыў,\\Растапырыў крыльцы.\\Пакупаця, мусіць, хоча\\Ды праспіць баіцца». З верша «Купальшчык-баязлівец» Л.Шырына. **15.** У старажытнагрэчаскай міфалогіі — волат. **16.** «Аты-баты, аты-баты,\\... высыпалі з хаты». З верша «Зайкі і ліс» М.Пазнякова. **17.** ... спіць і курэй бачыць (прык.). **18.** «... ды кашаль,\\Два бандыты,\\Зноў ваююць\\З апетытам». З верша «Ваякі» А.Пісьмянкова. **21.** «Хадзіў ... пад масток,\\Лавіў рыбку за хвасток». З паэмы «Савось-распуснік» Я.Коласа. **22.** Выканаўца ролі ў спектаклі. **27.** «... ,\\Дзьмухавец,\\Кучаравы маладзец». З верша «Адуванчык» А.Дзержынскага. **29.** «Дзед у садзе слі́ў натрос, —\\Поўны ... дамоў прынёс». З верша «Вітамін» В.Гардзея. **30.** «Мур-мурлыча\\Аж да ранку\\Кошка — ...\\Калыханку». З верша «Салодкія сны» Л.Шырына. **31.** «Запаліла ночка\\Зорныя агні.\\Спі, мая ...,\\Любая, засні». З верша «Над калыскай» С.Новіка-Пеюна. **32.** «Камарыкі мак таўкуць —\\З гэтай мукі\\... пякуць». З верша «Мак таўкуць камары» К.Цвіркі. **33.** «На дварэ — люстэркі луж:\\... сляды пакінуў.\\Душ прымае верабей,\\Сеўшы на калінy». З верша «Верабей прымае душ» П.Пранузы.

**Па вертыкалі: 2.** Цэлы дзень касіў ..., а за вечар каза з'ела (прык.). **3.** Вясной цэбар вады — лыжка гразі, а восенню лыжка вады — ... гразі (прык.). **4.** «— Дзе ты былі? Скажы, Алесь.\\— Па ... хадзіў я ў лес». З верша «Грыбнік» П.Пранузы. **5.** Горная крышталічная парода. **7.** Дзяленне на крузе компаса. **9.** «Наш Максім рыбак заўзяты,\\Печкуроў лавіць ...». З верша «Рыбак» А.Пісьмянкова. **12.** «..., вожык і змяя». Байка К.Крапівы. **13.** «Купіў слонік ...,\\Скача з ім, нібыта конік». З верша «Слон і парасон» А.Старынчыка. **14.** «... арэшак ухапіла\\І так, і сяк яго на зуб бярэ». З верша «Сама» Э.Валасевіча. **19.** «Адна кветка для пчолкі,\\Другая — для матылька,\\Трэцяя — на...». З верша «Як збіраць кветкі» М.Танка. **20.** «На зялёны дубок,\\Што расце за дальнім лесам,\\Апусціўся павучок —\\Непаседа і ...». З верша «Павучок і муха» Т.Дзям'янавай. **23.** Музыка, які іграе на дудзе. **24.** Вялікаму каню — вялікі ...(прык.). **25.** Бакавая частка твару. **26.** «Надыдзе часінка,—\\На свае ўстанеш ...,\\Мая ты дзяўчынка». З верша «Алеся» Я.Купалы. **28.** Сатырычнае або гумарыстычнае адлюстраванне каго-, чаго-небудзь.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ.**

**Па гарызанталі:** 1. Вусач. 6. Сэрца. 8. Сябрына. 9. Акно. 10. Імя. 11. Верабейка. 15. Тытан. 16. Зайкі. 17. Ліса. 18. Грып. 21. Коцік. 22. Акцёр. 27. Адуванчык. 29. Кош. 30. Мама. 31. Дачушка. 32. Бліны. 33. Дождж.

**Па вертыкалі:** 2. Сена. 3. Вядро. 4. Грыбы. 5. Гнейс. 7. Румб. 9. Аматар. 12. Дзіця. 13. Парасонік. 14. Вавёрачка. 19. Букет. 20. Гарэза. 23. Дудар. 24. Хамут. 25. Шчака. 26. Ногі. 28. Шарж.



## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Набліжаецца ваша самая любімая пара года — лета. Колькі святла, поспехаў і цяпла прынясе яно вам, зоркі не могуць сказаць дакладна, але відавочна, што ўсяго гэтага будзе нямала. Зарыентавацца ў падрыхтоўчых клопатах да новага сезона дапаможа інфармацыя, якая паступіла своечасова.

**ЦЯЛЕЦ.** Праявіце належную павагу да блізкіх людзей, а яны, у сваю чаргу, дапамогуць у рэалізацыі арыгінальных ідэй. Каб мінулыя праблемы з дзелавымі партнёрамі не паўтарыліся, неабходна памятаць пра зробленыя памылкі. Пачуццё ўласнай перавагі можа перашкодзіць паўнавартасным зносінам. Невыразныя думкі змогуць нарэшце здабыць форму, і ўсё стане на свае месцы.

**БЛІЗНЯТЫ.** Напружаны час на працы, магчымыя шматлікія паездкі і камандзіроўкі, падпісанне новых дамоў. Дзелавыя партнёры могуць падвесці ў рэалізацыі вашых агульных планаў, але не шукайце ў гэтым злога намеру: проста так складуцца акалічнасці. Калі спатрэбіцца дапамога, можаце разлічваць на сяброў і блізкіх. Ахавайце сябе ад непатрэбных сустрэч і лішніх людзей, гэта можа неспрыяльна адбіцца на вашым самаадчуванні.

**РАК.** Не варта спяшацца з высновамі і тым больш — з рашэннямі, якой бы зразумелай ні здавалася сітуацыя. Напэўна знойдзецца няўлічаны нюанс, які «размалюе» выразную карціну зусім інакш. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі: яна падкажа самае дакладнае рашэнне, але не спяшайцеся ўвасабляць яго раней за пятніцу.

**ЛЕЎ.** Старанна аналізуйце падзеі, абапіраючыся на жыццёвы досвед і логіку. Не падпарадкоўвайцеся чужым амбіцыям, але паспрабуйце ўстрымацца ад адкрытай крытыкі калег па службе. Магчымы імклівы кар'ерны ўзлёт і пераход на новую пасаду. Паспрабуйце пазбегнуць «зорнай» хваробы, не рвіце адносіны з ранейшымі аднадумцамі.

**ДЗЕВА.** Праблемай тыдня можа аказацца дрэнная падрыхтоўка да ажыццяўлення ўласных планаў. Увесь час будзе чагосьці бракаваць: адкрывалкі для кансервавых слоікаў на пікніку, сурвэтак — на ўрачыстым застоллі ці купальніка — на пляжы. У выпадку паездкі вельмі пажадана праверыць наяўнасць асноўных прадметаў у багажы па спісе, прычым — не адзін раз.

**ШАЛІ.** Настае спрыяльны перыяд для рэалізацыі бліскучых планаў і ідэй. Сканцэнтруйцеся для рашэння праблем, якія існуюць, не ўпусціце магчымасці, якія з'яўляюцца. Залішняя разважлівасць не сапсуе рэпутацыю. На працы праявіце актыўнасць — партнёры падтрымаюць. Будзьце гатовы ўдзельнічаць у рашэнні чужых праблем, калі, вядома, гаспадары праблем не будуць залішне актыўна пярэчыць. Выдатны час для раскрыцця творчых здольнасцяў і самаўдасканалення.

**СКАРПІЁН.** На пачатку тыдня непажадана адхіляцца ад вызначаных мэт, якой бы вялікай ні была спакуса. Можа абудзіцца жаданне быць наперадзе ўсіх, і ў вас для гэтага з'явіцца нямала шанцаў. Пажадана ў некаторых сітуацыях паспрабаваць выявіць такт і цярпенне — калегі па працы і сябры гэта ацэняць.

**СТРАЛЕЦ.** Цалкам магчыма, што ў найбліжэйшыя дні вас чакае значны кар'ерны ўзлёт. Будзьце цвёрдыя ў сваіх намерах — не змяняйце іх на хаду, бо нішто так не падрывае аўтарытэт, як няўпэўненасць і мітуслівасць. Ваша непрадказальнасць можа падарыць свету новыя магчымасці. Серада акажацца сур'ёзным выпрабаваннем для вашага самалюбства і аўтарытэту сярод калег.

**КАЗЯРОГ.** Чакаюцца цікавыя кантакты з рознымі людзьмі. Верагодныя разнастайныя сустрэчы па інтарэсах, насычаныя паездкі. Інтуіцыя дазволіць знайсці карысныя сувязі нават сярод натоўпу выпадковых людзей. Неабходна здабыць душэўную раўнавагу, адчуць упэўненасць ва ўласных сілах і вызначыць свае мэты на найбліжэйшую будучыню. Не распыляйцеся, засяродзьцеся на самым важным, толькі тады вас чакае поспех.

**ВАДАЛЕЙ.** Магчымыя нестандартныя сітуацыі. Справіцца з імі зможаце дзякуючы знаходлівасці і рашучасці. Верагодны поспех у навуковай дзейнасці. Імкніцеся сумленна выконваць свае абавязкі. Спрэчкі і разборкі не прынясуць жаданых вынікаў. У адносінах з калегамі варта быць шчырымі і самакрытычнымі — здольнасць прызнаваць свае памылкі і чужую слушнасць дапаможа кар'еры.

**РЫБЫ.** Фартуна спрыяе. Можаце справіцца практычна з любой задачай. Поспех будзе спадарожнічаць у творчых распачынаннях. Папоўніце кола зносін прыемнымі і карыснымі людзьмі. Перш чым прымеце сур'ёзнае рашэнне, паспрабуйце добра абдумаць яго наступствы. Для паспяховай працы спатрэбіцца цярпенне і спакой.

Даты | Падзеі | Людзі

**У Рэспубліцы Беларусь — Дзень работнікаў фізічнай культуры і спорту. Адзначаецца ў трэцюю суботу мая.**

**Міжнародны дзень музеяў. Заснаваны ў 1977 годзе на ХІ Генеральнай канферэнцыі Міжнароднага савета музеяў у Маскве.**

**1906** год — у Пецярбургу па ініцыятыве выкладчыка Пецярбургскага ўніверсітэта Б.І. Эпімах-Шыпілы заснавана першае легальнае беларускае выдавецкае таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца». Існавала ў 1906-1914 гг. Створана на кааператыўных пачатках групай перадавой беларускай інтэлігенцыі. Таварыства ставіла перад сабой асветніцкія задачы. Нягледзячы на цяжкае фінансавае становішча, адсутнасць паліграфічнай базы, цэнзурныя рэпрэсіі, выдала лацінкай і кірыліцай 38 назваў кніг агульным накладам больш за 100 тысяч асобнікаў. Сярод іх — першыя падручнікі на сучаснай беларускай мове: «Беларускі лемантар, або Першае чытанне для дзетак беларусаў» К. Каганца, «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі, творы Я. Купалы і Я. Коласа, мастацкую літаратуру, паштоўкі. У 1907-1909 гг. наладзіла выданне падпісной серыі «Беларускія песняры», у якую ўвайшлі творы В. Дуніна-Марцінкевіча «Гапон», «Вечарніцы», «Шчароўскія дажынкі», Ф. Багушэвіча «Дудка беларуская», «Смык беларускі», пераклад паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш». Каб папоўніць рэпертуар беларускіх музычных драматычных гурткоў, таварыства выдавала паліграфічным спосабам п'есы Я. Купалы, А. Чэхава, Э. Ажэшкі. Выдавала альманах «Маладая Беларусь». Выпускала таксама навукова-папулярныя і публіцыстычныя брашуры, паштоўкі з краявідамі Беларусі і партрэтамі беларускіх пісьменнікаў.

**1912** год — у Мінску створана таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі. У яго праграму ўваходзіла вывучэнне прыроды краю, гісторыка-археалагічныя даследаванні, ахова помнікаў прыроды, распаўсюджванне натуральна-гістарычных і геаграфічных ведаў. Існавала гэтая арганізацыя за кошт членскіх узносаў, даходаў ад чытання лекцый, ахвяраванняў. Кіравалася саветам з шасці чалавек. Першым старшынёй таварыства быў А.Ф.Флёраў, дырэктар Мінскай балотнай станцыі. Большасць членаў савета па родзе сваёй дзейнасці была звязана з вывучэннем і пераўтварэннем прыроды краю. Займаліся навуковай працай, чыталі даклады па медыцыне, геалогіі, глебазнаўстве, ахове помнікаў прыроды, флоры і фаўны. Таварыства мела кантакты з Пецярбургскай археалагічнай камісіяй, Пецярбургскім батанічным садам, Казанскім універсітэтам. Вялікай заслугай арганізацыі з'явілася стварэнне гарадскога музея.



**1938** год — нарадзіўся (вёска Цынцэвічы Вілейскага раёна) Міхаіл Антонавіч Казінец, дырыжор, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1978), народны артыст Беларусі (1987). З 1972 года — дырыжор, з 1975-га — мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча. Першы інтэрпрэтатар многіх твораў беларускай музыкі, у тым ліку канцэрта для фартэпіяна і народнага аркестра Г. Вагнера, «Святочнай паэмы» і «Юбілейнай уверцюры» Я. Глебава, сімфоніі «Памяць Зямлі» і іншых. У 1985-2005 гадах быў рэктарам Беларускай акадэміі музыкі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984), прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2002), узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны.

**Было сказана**

**Уладзімір КОРБАН (1910-1971), літаратар, байкапісец:**

*«Павага толькі з тым гатова знацца,*
*Хто ўмее плённай працай*
*Дабівацца*
*Ўзлёту, дасягненняў, росту».*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

## Незвычайнае варэнне



**З САСНОВЫХ ШЫШАК**

Варэнне з сасновых шышак вядома сваімі антысептычнымі ўласцівасцямі. Яго выкарыстоўваюць для лячэння грыпу, прастуды, хвароб горла і верхніх дыхальных шляхоў. Яно валодае прыемным смакам, які спадабаецца нават дзецям. Шышкі ідэальна збіраць у канцы мая — першай палове чэрвеня.

**Спатрэбіцца:** *1 кг шышак сасны (маладых), 1 л вады, 1 кг цукру.*

Добра прамываем маладыя (зялёныя) шышкі ад 1 да 3 см у даўжыню. Замочваем іх на суткі ў халоднай вадзе. Зліваем ваду, дадаём цукар і варым сіроп. Засыпаем у гатовы гарачы сіроп шышкі. Варым 1,5—2 гадзіны, увесь час памешваючы. Здымаем плеўку. Варэнне будзе гатова, калі ўсе шышкі цалкам раскрыюцца. Разліваем па слоіках. Закатваем слоікі.

Варэнне з сасновых шышак добра захоўваецца ў халадзільніку. Для прафілактыкі рэспіраторных захворванняў карысна дадаваць па 1 ч. л. варэння ў чай у перыяд абвастрэння.



**З БЭЗУ**

**Спатрэбіцца:** *0,5 кг кветак бэзу, 0,5 лімона, 2 шклянкі вады, 0,5 кг цукру.*

Збіраем кветачкі бэзу, пад халоднай вадой іх добра прамываем, заліваем вадой, ставім ёмістасць на агонь і кіпяцім на працягу 10 хвілін.; выціскаем у бэзавую ваду сок лімона, накрываем вечкам і пакідаем на 20 хвілін; сцэджваем сок у ёмістасць, у якой будзем гатаваць варэнне, дадаём цукар і варым сіроп; кветачкі бэзу, якія засталіся, добра расціраем з 1 ст. лыжкай цукру і з 10 кроплямі соку лімона. Гэтую бэзава-лімонную масу дадаём у сіроп і, як закіпіць, варым іх разам 20 хвілін на слабым агні, час ад часу памешваючы; разліваем варэнне з бэзу ў слоічкі і закатваем.



**З ДЗЬМУХАЎЦОЎ**

**Спатрэбіцца:** *1 лімон, 200 кветак дзьмухаўцоў, 1 кг цукру, 1 л вады.*

Збіраем раніцай кветкі дзьмухаўцоў (галоўкі), прамываем у халоднай вадзе і адлучаем пялёсткі кветак; наразаем дробна лімон без лупіны; апускаем дзьмухаўцы ў ваду, дадаём лімон, кіпяцім на працягу 1 гадзіны на ціхім агні; адвар працэджваем у посуд для гатавання варэння, дадаём цукар, варым яшчэ гадзіну-паўтары. Варэнне з дзьмухаўцоў будзе падобна на мёд.

-2932-

ПАРАДАК У ДОМЕ

## Хто есць кнігі і шпалеры?

**Наш чытач Мікалай Іваноў з вёскі Зелянец, што ў Карэліцкім раёне, даслаў у рэдакцыю ліст з просьбай аб дапамозе. Справа ў тым, што у яго доме нейкія насякомыя псуюць кнігі і шпалеры.**

Хутчэй за ўсё, у доме Мікалая Мікалаевіча завяліся сенаеды, а дакладней, адзін з яго прадстаўнікоў, які яшчэ называецца «кніжная вош». Менавіта гэтыя насякомыя сілкуюцца адмысловым відам цвілі, якая сустракаецца часцей за ўсё на пакаёвых папяровых шпалерах (ці відах клею, які выкарыстоўваўся) і вокладках кніг (адгэтуль назва). Для ўсяго вышэйназванага неабходнай умовай з'яўляецца падтрыманне павышанай вільготнасці ў памяшканні. А значыць, галоўны сродак барацьбы з сенаедамі — прасушванне памяшкання: яны паміраюць пры вільготнасці менш за 50 працэнтаў. Хімічныя сродкі барацьбы, на жаль, не вельмі эфектыўныя.

МАЙСТАР НА ЎСЕ РУКІ

## «Насценныя» стол і лава





**Гэтая рацыянальная ідэя спатрэбіцца тым, хто імкнецца да максімальнай эканоміі і шматфункцыянальнасці невялікай прасторы. Асабліва мэтазгодным для выкарыстання камплект можа аказацца на дачы ці ў невялікім загарадным доме. Замацаваныя да сцяны драўляныя элементы «лёгкім рухам рукі» ператвараюцца ў зручныя стол і лаву (ці дзве лавы), за якімі можна паабедаць, папрацаваць з ноўтбукам ці заняцца іншай справай .**

Пасля таго, як неабходнасць у гэтым камфортным месцы больш не актуальная, стол і лава ўсё з той жа лёгкасцю прымаюць зыходнае становішча, займаючы ўсяго толькі 4 сантыметры прасторы і пакідаючы вольнае месца, якое можна задзейнічаць для іншых мэт.

Калі паставіць такі столік на дачы пад акном, то пасля ад'езду гаспадароў на зімовую кватэру столік у складзеным стане будзе выконваць ролю своеасаблівай аканіцы. Вырабіць такі стол і лавы можна з фанеры 20-25 мм і пакрыць вільгацеўстойлівым лакам.

-2933-

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 5.02 | 21.11 | 16.09 |
| Віцебск | — 4.45 | 21.07 | 16.22 |
| Магілёў | — 4.52 | 21.01 | 16.09 |
| Гомель | — 4.56 | 20.50 | 15.54 |
| Гродна | — 5.19 | 21.25 | 16.06 |
| Брэст | — 5.27 | 21.18 | 15.51 |

**Месяц**

***Першая квадра ў 7.35***
***Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Ірыны, Абрама, Якава.*
***К.*** *Аляксандры, Наталлі, Эрыка, Яна.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +22..+24°С | КІЕЎ +25..+27°С | РЫГА +17..+19°С |
| ВІЛЬНЮС +22..+24°С | МАСКВА +21..+23°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +21..+23°С |

## УСМІХНЕМСЯ

— Хворы, падрыхтуйцеся, зараз будзе крыху непрыемна... Гатовы? З вас 500 долараў.

**Жанчына можа бясконца глядзець на тры рэчы, а ў выніку купіць сем.**

— А які ў цябе рост?

— 155.

— Ты такая маленькая прынцэса. А колькі важыш?

— А важу яшчэ менш — 120.

**Такое адчуванне, што суседзі нават шпалеры лепяць перфаратарам.**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, Л.СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 25.007. Індэкс 63850. Зак. № 2161.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 мая 2013 года.